Ваенная гісторыя паказвае, што вялікія палкаводцы, правільна ўлічваючы псіхалагічныя магчымасці войскаў, атрымлівалі перамогу над больш шматлікім ворагам, узброеным параўнальна сучаснай зброяй. СТАР. 4

Вучоныя яшчэ да канца не ўстанавілі ўсе вартасці антацыянаў, але ўжо вядома, што яны валодаюць онкапратэктарным дзеяннем — дапамагаюць нам абараняцца ад злаякасных пухлін. СТАР. 10

Як вы ставіцеся, калі нехта выстаўляе на продаж... сустрэчу з сабой, любімым? А калі гэта робіцца не дзеля жарту або грошай, а з высакароднай мэтай дапамагчы іншым людзям? СТАР. 12

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 ЛІСТАПАДА 2012 г. ЧАЦВЕР № 220 (27335) Кошт 1500 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПРЭЗІДЭНТ БЕЛАРУСІ НАКІРАВАЎ ПРЫВІТАННЕ ЎДЗЕЛЬНІКАМ VII БЕЛАРУСКАГА ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА ФОРУМУ

«Развіццё партнёрскіх адносінаў з замежным бізнэсам — важны кірунак эканамічнай палітыкі Беларусі. Таму мы запрасілі прадстаўнікоў дзелавой эліты практычна з усіх рэгіёнаў свету. Лічу, што тут створана аўтарытэтная экспертная пляцоўка для абмеркавання стратэгічных і аператыўных пытанняў вядзення бізнэсу, — гаворыцца ў прывітанні. — Мы чакаем ад удзельнікаў форуму шчырай размовы і канкрэтных крокаў у дачыненні да прапанаваных інвестыцыйных праектаў, таксама як і бачання праблем, з якімі яны, магчыма, ужо сутыкнуліся пры рэалізацыі сваіх бізнэс-планаў у нашай краіне».

«Са свайго боку, мы гарантуем інвестарам самыя лепшыя ўмовы для вядзення бізнэсу. У нас эканоміка, якая дынамічна развіваецца, спрыяльны інвестыцыйны і падатковы клімат, добрая інфраструктура, надзейная абарона і цэлы шэраг прэферэнцый», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

«Новыя перспектывы для дзелавога супрацоўніцтва адкрываюцца ў сувязі са стварэннем Адзінай эканамічнай прасторы Беларусі, Расіі і Казахстана. І самае галоўнае — у цэнтры Еўропы жыве таленавіты, працавіты і гасцінны беларускі народ», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ МАСТАЦКАГА КІРАЎНІКА АНСАМБЛЯ «СЯБРЫ», НАРОДНАГА АРТЫСТА БЕЛАРУСІ АНАТОЛЯ ЯРМОЛЕНКУ З 65-ГОДДЗЕМ

«Вы ўвайшлі ў летапіс нацыянальнай культуры як стваральнік, саліст і бяззменны мастацкі кіраўнік ансамбля «Сябры», творчасць якога стала выдатнай з'явай сучаснай эстрады, — гаворыцца ў віншаванні. — Сёння Вы працягваеце самааддана служыць беларускаму мастацтву, радаваць сваіх паклоннікаў папулярнымі хітамі і яркімі прэм'ерамі, шмат часу і душэўных сіл аддаяце выхаванню адораных маладых выканаўцаў».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Анатолю Ярмоленку і ўсёй яго дружнай творчай сям'і здароўя, невычэрпнага натхнення, шчасця і дабрабыту.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ СУСТРЭЎСЯ З ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРАМ ІНДЫІ

Прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч сустрэўся ўчора з прэм'ер-міністрам Індыі Манмаханам Сінгхам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Бакі абмеркавалі ўмовы развіцця двухбаковых гандлёва-эканамічных адносін, пытанні інвестыцыйнага супрацоўніцтва, а таксама сумесныя праекты. Была адзначана ўзаемная зацікаўленасць у развіцці ўзаемавыгаднага партнёрства.

У той жа дзень Міхаіл Мясніковіч прыняў удзел у адкрыцці Індыйскага міжнароднага гандлёвага кірмашу ў Нью-Дэлі. Тут сваю прадукцыю прадставілі і больш за 60 беларускіх кампаній. Выступаючы на мерапрыемстве, прэм'ер-міністр заявіў, што Беларусь зацікаўлена ў пашырэнні супрацоўніцтва з кампаніямі Індыі. Найбольшую цікавасць наша краіна праяўляе да партнёрства з індыйскімі дзелавымі коламі ў прамысловасці, фармацэўтыцы, металургіі, энергетыцы, сферы высокіх тэхналогій і іншых галінах. «Урад Беларусі стварыць камфортныя і выгадныя ўмовы для бізнэсу Індыі», — падкрэсліў М. Мясніковіч. Пры гэтым ён расказаў аб развіцці эканомікі і перавагах работы на беларускім рынку. Больш як 1 тыс. індыйскіх кампаній будуюць свой бізнэс у Беларусі. Кіраўнік урада выказаў упэўненасць, што ўжо ў бліжэйшай перспектыве іх стане больш.

Беларусь гатова да выкарыстання самых сучасных форм інвеставання — ад стварэння замежных змешаных кампаній да канцэсійных пагадненняў. «У Беларусі еўрапейскае заканадаўства, якое гарантуе ўсе правы інвестарам, — дадаў Міхаіл Мясніковіч. — Запрашаем індыйскі бізнэс інвеставаць у Беларусь. Прыярытэтныя праекты атрымаюць беспрэцэдэнтныя льготы — амаль поўнае вызваленне ад падаткаў на перыяд акупнасці інвестыцый».

Паводле слоў прэм'ер-міністра, аб'ём узаемнага гандлю паміж Беларуссю і Індыяй складае $0,5 млрд. Аднак гэта значна менш за агульны патэнцыял дзвюх дзяржаў. «У супрацоўніцтве з Беларуссю галоўнымі фактарамі прывабнасці з'яўляецца навукаёмістасць беларускай эканомікі, выгадныя ўмовы вядзення бізнэсу і геаграфічная перавага», — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

У адкрыцці кірмашу прыняў удзел прэзідэнт Індыі Пранаб Мукерджы. Міхаіл Мясніковіч падзякаваў яму за асабісты ўклад у развіццё беларуска-індыйскіх адносін і выказаў надзею на іх далейшае паспяховае развіццё.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ВЯЛІКІ ЭКСПАНАТ МАЛЕНЬКАГА МУЗЕЯ

Адзіны ў Беларусі музей драўлянай лыжкі (дарэчы, адкрыты сёлета) налічвае ўжо каля дзвюхсот экспанатаў гэтага віду старажытнага (і сучаснага таксама) посуду. Знайшлося ў калекцыі месца і «лыжачцы», якая ўмяшчае ажно 12 літраў. Не дзіўна, што музей не сумуе без наведвальнікаў. Вось і жыхаркі вёскі Капланцы Марыя БАРАНАВА, Ніна ШКАТУЛА і Таісія МІКЛУШ (на фотаздымку) вырашылі паглядзець на гэтае драўлянае дзіва, хоць лыжкамі іх не здзівіць, бо Бярэзіншчына — край традыцыйнага лыжачнага рамяства. Экскурсію для вясковых гаспадынь праводзіць кіраўнік раённага народнага клуба майстроў і заснавальнік музея Ганна ЖДАНОВІЧ (на фота злева).

ЦЫТАТА ДНЯ

Жанна БІРЫЧ, намеснік старшыні Мінгарвыканкама:

«У межах Беларускага інвестыцыйнага форуму 15 лістапада пройдзе Мінскі інвестыцыйны дзень, адбудзецца прэзентацыя інвестыцыйнага патэнцыялу беларускай сталіцы. Мы разлічваем на падпісанне новых інвестыцыйных дагавораў аб рэалізацыі праектаў, у тым ліку вытворчай накіраванасці, ідзе падрыхтоўка адпаведных дакументаў. Падобныя мерапрыемствы маем намер праводзіць штогод, думаю, іх можна будзе назваць значнымі падзеямі ў дзелавым жыцці сталіцы. Такія форумы дазваляюць замежным кампаніям больш даведацца аб інвестыцыйным патэнцыяле нашага горада».

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 3°
Віцебск	+ 5°
Гомель	+ 4°
Гродна	+ 3°
Магілёў	+ 3°
Мінск	+ 4°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 15.11.2012 г.

Долар ЗША	8570,00	■
Еўра	10890,00	▲
Рас. руб.	270,00	■
Укр. грыўня	1042,58	▼

■ Актуальны дыялог

Аляксандр БОЙКА:

«СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ ПАТРАБУЕЦЦА ГАЛІНОВАЕ ПАВЫШЭННЕ ЗАРОБКАЎ»

16 лістапада ў Мінску пройдзе VII з'езд Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі. На сённяшні дзень ён аб'ядноўвае больш за 600 тысяч чалавек і з'яўляецца адной з найбуйнейшых арганізацый Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, Інтэрнацыянала адукацыі, а таксама Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў «Адукацыя і навука».

Напярэдадні з'езда журналіст «Звязды» сустрэўся са старшынёй ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Аляксандрам Бойка, каб даведацца ў прафсаюзнага лідара, што пад сілу такому буйному аб'яднанню і ці заўсёды ўдаецца данесці пазіцыю большасці членаў прафсаюза да ўладных структур?

— Аляксандр Аляксандравіч, вы неаднойчы ў самых розных сітуацыях заяўлялі, што адной з асноўных сваіх задач прафсаюз бачыць павышэнне прэстыжу педагагічнай прафесіі ў грамадстве, паколькі гэтая задача наўпрост звязана з прыцягненнем у галіну высокакваліфікаваных і зацікаўленых у якасці сваёй работы спецыялістаў. А як вы, цікава, самі ацэньваеце эфектыўнасць сваіх дзеянняў у гэтым напрамку?

— Напэўна, ацэньваць самога сябе было б не зусім карэктна — няхай лепш гэта робяць іншыя. Але прызнаюся, што да свайго прыходу на гэту пасаду я меў вельмі цьмянае ўяўленне пра тое, наколькі гэта складаная, адказная і дыпламатычная работа. Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі заўсёды спрабаваў знайсці паразуменне з органамі заканадаўчай і выканаўчай улады і па большасці прынцыповых пытанняў яму гэта ўдавалася. Даводзілася прафсаюзу і канструктыўна апаніраваць уладам. Нашы прапановы дэпутацкаму корпусу, звароты ў адрас Савета Міністраў даказалі сваю ўзважанасць і актуальнасць.Толькі па пытанні вяртання ранейшай працягласці адпачынкаў педагагічным работнікам прафсаюз звяртаўся ва ўрад пяць разоў з моманту прыняцця папярэдняга рашэння. Вынікам сумеснай з Міністэрствам адукацыі працы стала вяртанне работнікам дашкольных устаноў 42-х дзён працоўнага водпуску. Прыемна, што пазіцыя сацыяльных партнёраў, наймальнікаў, Савета рэктараў ВНУ ў большасці выпадкаў салідарная з прапановамі прафсаюза. Гэта дапамагае дасягаць пастаўленых задач — так было з даплатамі за вучоныя ступені і званні, з павелічэннем на 50% тарыфных акладаў педагагічным работнікам з кола прафесарска-выкладчыцкага складу, якія не маюць вучоных ступеняў і званняў, з прывязкай памераў вучэбных стыпендый да тарыфнай стаўкі першага разраду, з павелічэннем выплат на набыццё метадычнай літаратуры...

Магу з упэўненасцю сказаць, што сёння ніводнае з важных для членаў прафсаюза пытанне не вырашаецца без нашага ўдзелу. Мы заўсёды імкнёмся знайсці кампраміс. Дапамагае нам у гэтым наша прадстаўніцтва ў складзе калегіяльных органаў улады, у розных рабочых групах і камісіях. Па ўсіх прынцыповых пытаннях прафсаюз выказвае сваю афіцыйную пазіцыю, нават калі яна і не знаходзіць наверсе падтрымку... СТАР. 3

БЮДЖЭТНІКАМ ДА КАНЦА ГОДА ПААБЯЦАЛІ ЗАРОБАК У 3,5 МІЛЬЁНА

Макраэканамічная сітуацыя ў студзені— кастрычніку адзначаецца паступовым запавольваннем эканамічнага росту ў параўнанні з вынікамі першых двух кварталаў года, паведаміў учора намеснік міністра эканомікі Беларусі Аляксандр Ярашэнка.

Так, за 10 месяцаў года аб'ём валавога ўнутранага прадукту павялічыўся толькі на 2,2% да мінулагодняга ўзроўню, пры гадавым прагнозе 5,1-5,5%. Скарачэнне тэмпаў росту ВУП адзначаецца зніжэннем аб'ёмаў вытворчасці ў жыллёвым будаўніцтве і па пэўных пазіцыях аптовага гандлю. Зніжэнне тэмпаў росту ВУП у прамысловасці звязана з перарапрацоўкай нафты. А гэта тлумачыцца тым, што Мазырскі нафтаперапрацоўчы завод быў спынены ў кастрычніку на плануемы рамонт на 19 дзён.

Прафіцыт кансалідаванага бюджэту з улікам бюджэту фонду сацабароны насельніцтва за 10 месяцаў склаў 7,5 трлн рублёў, паведаміў намеснік міністра фінансаў Беларусі Максім Ермаловіч. А гэта значыць, што зарабляем мы больш, чым тралім. Спецыяліст Мінфіна адзначыў, што заробкі ў рэальнай эканоміцы павялічваюцца значна хутчэй, чым у бюджэтным сектары. Разам з тым, эканамістамі падлічана, што бюджэтнікі павінны атрымліваць даходы на ўзроўні не менш чым 80% ад заробкаў у сферы прамысловасці. «Спадзяёмся, што да канца года заработная плата ў бюджэтным сектары павялічыцца да 3,5 мільёна рублёў».

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УПЕРШЫНЮ Ў ЕЎРОПЕ ПРАХОДЗІЦЬ УСЕАГУЛЬНЫ СТРАЙК

Як паведамляюць інфармагенцтвы, акцыі пратэсту супраць жорсткіх мер эканоміі праходзяць у 23 краінах. Найбольш масавыя страйкі адбыліся ў Італіі, Іспаніі, Партугаліі і Грэцыі, якія перажываюць вострыя фінансавы крызіс. Там людзі яшчэ ўначы выйшлі на вуліцы з патрабаваннем адмяніць меры жорсткай эканоміі, прынятыя нацыянальнымі ўрадамі.

РПЦ ВЫРАТАВАЛА ХРАМ ТРУНЫ ГАСПОДНЯЙ АД ЗАКРЫЦЦЯ ЗА ДАЎГІ

Руская праваслаўная царква дапамагла Іерусалімскаму патрыярхату ўладзіць спрэчку з карпарацыяй «Гіхон», якая забяспечвае вадой Іерусалім і, у прыватнасці, храм Труны Гасподняй. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар патрыярха Кірыла, дыякан Аляксандр Волкаў. «Цяпер даўгі храма Труны Гасподняй за ваду спісаны не без удзелу Рускай праваслаўнай царквы», — заявіў Волкаў. Паводле яго слоў, гэтае пытанне патрыярх Кірыл абмяркоўваў падчас нядаўняй паездкі ў Ізраіль з прэзідэнтам Шымонам Перэсам.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У КІТАІ АБРАЛІ НОВАЕ ПАКАЛЕННЕ КІРАЎНІКОЎ

У Пекіне завяршыўся 18-ы з'езд Кампартыі Кітая, па выніках якога быў зацверджаны новы склад Цэнтральнага камітэта партыі. Як паведамляе агенцтва «Сіньхуа»,14 лістапада старшыня КНР Ху Цзіньтаа афіцыйна абвясціў з'езд закрытым. Чакаецца, што яго намесніка і пераемніка Сі Цзіньпіна новы склад ЦК сёння зацвердзіць у якасці генеральнага сакратара. Мяркуецца, што ўвесну 2013 года Сі Цзіньпін уступіць на пасаду кіраўніка дзяржавы, і ўлада ў краіне на наступныя дзесяць гадоў пяройдзе да так званага «пятага пакалення» кіраўнікоў. Пераемнікам цяперашняга кіраўніка ўрада, прэм'ера Дзяржсавета Вэнь Цзябао лічыцца яго намеснік Лі Кэцян, якога раней прарочылі ў старшыні рэспублікі. У сакавіку новыя кіраўнікі павінны быць зацверджаны на пасадах парламентам — Усекітайскім сходам народных прадстаўнікоў.

На сесіі дэпутаты заклікалі і надалей кіравацца тэорыяй Дэн Сяапіна і ідэямі «патройнага прадстаўніцтва», якія маюць на ўвазе аб'яднанне вакол партыі ўсіх канструктыўных сіл грамадства, уключаючы прадпрымальнікаў.

КАРАТКА

Лаўрэатамі нацыянальнай прэміі Казахстана «Чалавек года» ў намінацыі «Дзяржаўная палітыка» сталі прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка, Рэспублікі Казахстан Нурсултан Назарбаеў і Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін.

У Беларусі становіцца больш вакансій з зарплатай звыш Br4 млн, паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. У сакавіку бягучага года ўдзельная вага такіх вакансій была 1,3 працэнта, а цяпер — ужо 10,2 працэнта.

У студзені—кастрычніку бягучага года колькасць зарэгістраваных індывідуальных прадпрымальнікаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года павялічылася на 13,6 працэнта і склала 41 тыс. 220 ІП.

Вниманию держателей пластиковых карточек ОАО «АСБ Беларусбанк»

С 15 ноября 2012 года при перечислении денежных средств с карт-счета на карт-счет одного физического лица в инфокиосках банка, системе интернет-банкинг и с использованием услуги М-банкинг устанавливается вознаграждение в размере 300 белорусских рублей. При перечислении денежных средств в пределах овердрафта дополнительно взимается вознаграждение в размере 3% от суммы перечисления.

Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г. выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ЯК ПАПЯРЭДЖВАЕЦЕ ПРАСТУДУ ВОСЕНЬСКАЙ МАКРАТОЙ І ЗІМОВАЙ СЦЮЖАЙ?

Марына МАСЛЯНКОВА, студэнтка Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь:

— Галоўная прычына захворванняў восенню і зімой — пераахаладжэнне. Нам здаецца, што яшчэ не зусім холадна, аднак арганізм можа і не справіцца з рэзкай зменай тэмпературы. Таму неабходна апранацца адпаведна надвор'ю. Ногі павінны быць у цяпле ў першую чаргу! Таксама важна падтрымліваць імунітэт, які «абараняе» арганізм круглы год. Я, напрыклад, штодня з'ядаю зубчык часнаку, 2-3 разы на тыдзень п'ю чай з імбірам ці шыпшынай. Усе кажуць, што лепшы спосаб падтрымаць здароўе — загартоўванне. Толькі не кожнаму гэта па сілах. Раю абмежавацца кантрасным душам раніцай.

Валерый САПОЖНІКАЎ, старшы памочнік начальніка аддзялення ідэалагічнай работы 61-й знішчальнай авіябазы Ваенна-паветраных сіл і войскаў процівапаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі, псіхолаг:

— Карацейшы сонечны дзень у гэтую пару накладвае адбітак на самаадчуванне чалавека. У яго часта назіраюцца пачуццё прыгнечанасці, трывожнасці, паніжаецца эмацыянальны фон. Каб падняць тонус і настрой, я выконваю практыкаванні па псіхалагічнай методыцы «Ключ», якая дапамагае пераадолець так званы «сіндром эмацыянальнага выгарання». Карыстацца ёй можна і падчас асабістых перажыванняў, напярэдадні важных мерапрыемстваў: адразу знікае эмацыйнае напружанне, на твары з'яўляецца ўсмешка.

Анжаліка РЫХЛІЦКАЯ, студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта:

— Каб не пасаваць перад восеньскай хандрой, я імкнуся шмат чаго паспець зрабіць за дзень. Напрыклад, заняткі спортам. За гадзіну трэніроўкі не толькі баляць цягліцы, але і ўздымаецца настрой. Хутчэй за ўсё, гэта звязана з хімічнымі працэсамі ў нашым арганізме, але, вядома, потым будзеш лётаць як на крылах! На добрае адчуванне ўплывае і душэўны стан. Таму невыпадкова наведваю заняткі ў тэатральнай студыі. Якая зіма? Калі табе хутка трэба пераўвасобіцца, напрыклад, у цяжарную жанчыну. Яшчэ важна, каб нехта родны і блізкі быў побач. І абавязкова сябры! Тады зіма — не зіма, мароз — не мароз! Ведаеце, можна ў студзеньскую пару і рэфлексаваць. Скончыць вышыўку, якую пачала 2 гады таму, або прачытаць кнігу. Ніхто яшчэ не адмяняў і кубак духмянай гарбаты з мятай. Не ўсё ж ляцець напярадзе планеты!

Падрыхтавала Вераніка Канюта.

ISSN 1990 - 763X

СУСЕДЗІ НЕ ПАВІННЫ СВАРЫЦЦА

11 лістапада Польшча адзначыла Дзень Незалежнасці. З гэтай нагоды Лешэк Шарэпка, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Польшча ў Рэспубліцы Беларусь, учора сустрэўся з журналістамі.

20 гадоў дыпламатыі

«2012 год асаблівы для нас. У сакавіку была 20-я гадавіна ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Польшчай і Беларуссю. А ў чэрвені — 20-я гадавіна падпісання дамовы аб добрасуседстве паміж дзвюма краінамі». Але сёння адносіны Беларусі і Польшчы не заўсёды можна назваць добрымі. Фон для такіх адносін, на думку пасла, вызначаюць міжнародныя інстытуцыі — Еўрасаюз, ААН. Асабістая пазіцыя Лешэка Шарэпкі такая: «Мы суседзі, і мы не павінны паварочвацца адзін да аднаго спінамі». Тым больш што Польшча — адзін з самых галоўных гандлёвых партнёраў Беларусі. «Летась наш тавараабарот склаў каля 3,2 млрд долараў ЗША». І эканамічнае супрацоўніцтва мае магчымасці для росту. Асабліва дыпламат вылучыў энергетычную сферу. Наконт цікавасці Беларусі для польскіх бізнэсменаў пасол заявіў, што польскі бізнэс на 80% прыватны: «А таму дзяржава на яго не можа ўплываць. Але ж нашы бізнэсмены прыходзяць у Беларусь, калі знаходзяць выгадныя праекты». Калі эканамічныя стасункі развіты недастаткова, то ў культурнай сферы гэтых праблем няма. Краіны плануюць нават падпісаць пагадненне аб супрацоўніцтве ў сферы культуры да 2014 года.

Візы, хакеры і гістарычны экскурс

«Імкліва расце колькасць тых, хто жадае атрымаць польскія візы. У 2011 годзе гэта было каля 300 тысяч чалавек. За 10 месяцаў 2012-га — ужо 294 тысячы», — паведаміў Лешэк Шарэпка. Аднак, на жаль, большасць віз — на закупкі. З турыстычнай мэтай беларусы ў Польшчу ездзяць мала, як і палякі ў Беларусь. Але працы ў пасольства ўсё роўна шмат. У такой сітуацыі польскаму пасольству не хапае работнікаў. «Але нам, на жаль, не дазваляюць павялічыць штат», — канстатаваў пасол. Па яго словах, Польшча ўвогуле заўсёды выступала за тое, каб паміж нашымі краінамі не было візавага рэжыму. «Але мы зараз з'яўляемся членам Еўрасаюза — і гэта не так проста зрабіць...» Але тое — палова праблемы. Шмат нараканняў выклікае сітуацыя з электроннай рэгістрацыяй на падачу дакументаў у пасольства. Многія, думаю, сутыкаліся з тым, што зусім немагчыма знайсці вольнае месца на сайце, дзе праходзіць электронная рэгістрацыя. Гэтыя месцы выкрадаюць хакеры, якія пасля прадаюць іх каля пасольства. «Мы думаем над тым, якім чынам ускладніць жыццё хакерам. Але гэта цяжка, бо нам кажуць, што няма доказаў супярэчання іх дзейнасці закону».

Пасол Польшчы таксама паскардзіўся на тое, што польскі бок не заўсёды мае магчымасць ушанавання сваіх загінулых. Прынамсі гэта датычыцца воінаў АК (Арміі Краёвай). «Размова ідзе аб партызанах АК, — кажа пасол. — У вас яны часта называюцца бандытамі... Мы не можам самі зрабіць эксгумацыю, бо ў вас ёсць спецыяльны батальён у складзе Міністэрства абароны. І нашы просьбы аб дапамозе застаюцца без адказу».

Беспарадкі і апазіцыя

Лешэк Шарэпка сярод іншага пракаментаваў нядаўнія беспарадкі ў Польшчы і дапамогу беларускай апазіцыі. Па першым пытанні пасол заявіў, што нічога страшнага ў разгоне дэманстрантаў паліцыяй не было: «Калі дэманстрацыя выходзіць за межы закона, трэба проста прымаць усе захады, якія абараняюць іншых». Другое пытанне было выклікана інфармацыяй, якая нядаўна патрапіла ў СМІ, наконт таго, што МЗС Польшчы фінансавала ў 2007-2011 гадах беларускую апазіцыю. Па словах пасла, сродкі выдзяляліся для грамадзянскай супольнасці ў Беларусі, а не для апазіцыі як такой.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

■ Форум

АГУЛЬНЫ ПОГЛЯД У БУДУЧЫНЮ

Упершыню больш за 100 маладых журналістаў з Беларусі і Расіі збяруцца ў Гомелі

15-16 лістапада ў Гомелі пройдзе І беларуска-расійскі форум маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню». Яго арганізатары — Міністэрства інфармацыі Беларусі, Беларускі саюз журналістаў, Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі і Гомельскі абласны выканаўчы камітэт.

НА ПЯРЭДНІМ ПЛАНЕ — ПРАФЕСІЙНАЯ ПАДРЫХТОЎКА

— З якой мэтай праводзіцца медыяфорум? І якое значэнне мае мерапрыемства для развіцця беларускай журналістыкі? — пацікавілася «Звязда» ў намесніка міністра інфармацыі Беларусі Уладзіміра МАТУСЕВІЧА.

— Павысіць прафесійны ўзровень маладых журналістаў, прыцягнуць іх да інфармацыйнага суправаджэння інтэграцыйных працэсаў Беларусі і Расіі ў межах Саюзнай дзяржавы і Адзінай эканамічнай прасторы — вось асноўныя мэты гэтага мерапрыемства. Я думаю, форум стане традыцыйным. І таксама, як Беларускі міжнародны медыяфорум «Партнёрства ў імя будучыні», Летняя школа журналістыкі, міжнародная навукова-практычная канферэнцыя на базе Інстытута журналістыкі БДУ, што ладзяцца ў нашай краіне штогод, будзе спрыяць развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне журналістыкі.

Кадравая работа, запэўніў Уладзімір Матусевіч, вельмі важны кірунак дзейнасці Міністэрства інфармацыі. «Бо маладыя журналісты — гэта людзі, якія ўжо сёння ў значнай ступені вызначаюць і будуць вызначаць заўтра «твар» СМІ, шляхі развіцця медыйнай прасторы. Таму прафесійная падрыхтоўка выходзіць на пярэдні план. Таксама вельмі важным падаецца развіццё камунікацыі — як унутрыпрафесійнай, так і міжнароднай. Спадзяюся, што форум дапаможа стварыць добрую атмасферу супрацоўніцтва маладых беларускіх і расійскіх журналістаў. Думаю, што ў перспектыве мы выйдзем на рэалізацыю нейкіх сумесных інфармацыйных праектаў, і гэта стане добрым фундаментам нашага супрацоўніцтва».

— Хто яны — удзельнікі форуму?

— У форуме прымуць удзел маладыя журналісты як з беларускіх рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, так і іх калегі з Масквы, Смаленскай, Бранскай абласцей, СМІ Саюзнай дзяржавы. Гэта маладыя людзі ва ўзросце да 30 гадоў. Завітаюць у Гомель і вопытныя журналісты, выкладчыкі-практыкі, рэдактары беларускіх газет, вядомыя эксперты з Расіі. Сярод іх — гендырэктар Цэнтра палітычнай кан'юнктуры Расіі Сяргей Міхееў, дырэктар Цэнтра рускіх даследаванняў Маскоўскага гуманітарнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук Андрэй Фурсаў, прафесар кафедры параўнальнай паліталогіі Маскоўскага дзяржаўнага інстытута міжнародных адносін Алена Панамарова і іншыя. Паўдзельнічаюць у мерапрыемствах і эксперты з Украіны. Агульная колькасць удзельнікаў форуму — 150 чалавек.

— Калі ласка, некалькі слоў аб праграме форуму. Якія сюрпрызы падрыхтавалі арганізатары для ўдзельнікаў і гасцей?

— На працягу двух дзён пройдуць майстар-класы вопытных журналістаў, тэматычная дыскусія «Журналістыка ў XXI стагоддзі: традыцыі і навацыі». Будуць абмяркоўвацца пытанні, якія хвалююць сёння маладых журналістаў, маладых людзей наогул. У пленарным пасяджэнні форуму, якое запланавана на другі дзень, прымуць удзел кіраўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, прадстаўнікі Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы. На секцыях будуць закранацца такія тэмы, як роля СМІ ў сучасных грамадскіх працэсах у Беларусі і Расіі, прафесійнае і творчае сталенне журналісцкіх кадраў і іншыя. Маладых журналістаў таксама чакаюць трэнінгі, цікавая культурная праграма.

МОЛАДЗЕВАЯ ТЭМАТЫКА — НОВАЯ «ФІШКА» Ў ПРАЦЫ БСЖ

Паводле слоў **старшыні Беларускага саюза журналістаў Анатоля ЛЕМЯШОНКА,** аднаго з ініцыятараў форуму, у Гомелі будуць названы пераможцы першага рэспубліканскага творчага конкурсу сярод маладых журналістаў «Дэбют».

На конкурс было пададзена больш за 100 творчых работ. Пасля адбору на ўзроўні абласных первічных арганізацый у Беларускі саюз журналістаў трапіла 35 работ, з якіх трэба было вылучыць толькі 5 лепшых.

— Я размаўляў з членамі журы, — адзначыў Анатоль Лемяшонак. — Яны казалі, што было вельмі шмат моцных работ, таму выбраць лепшых аказалася няпроста. Калі мы зацвярджалі пераможцаў, былі прапановы зрабіць больш як 5 намінацый (лепшы аглядальнік, лепшы рэпарцёр, лепшы фотакарэспандэнт (дызайнер web-сайта), лепшы вядучы радыёпраграмы, лепшы вядучы тэлепраграмы). Але пасля гарачай дыскусіі вырашылі пакінуць усё, як ёсць, бо павелічэнне намінацый знізіць прэстыж прэміі. Якасць работ, паўтаруся, парадавала. Не выключаю, што гэтыя дастойныя маладыя байцы будуць праз нейкі час прэтэндаваць і на прэмію БСЖ у конкурсе «Залатое пяро», які мы праводзім раз у год.

Меркаванне на тэму

Уладзімір Матусевіч: «Часам маладым журналістам не хапае глыбіні, удумлівасці, а бывае, што і прафесійнай адказнасці. І асабісты прыклад журналіста, які мае імя ў прафесіі, вялікі творчы багаж і актыўную жыццёвую пазіцыю, для маладых людзей можа стаць добрым стымулам для творчага росту. Перадача прафесійных навыкаў, жыццёвага вопыту ад аднаго пакалення да другога — гэта карысная з'ява для сённяшняй журналістыкі».

Анатоль Лемяшонак адзначыў, што моладзевая тэматыка стане новай «фішкай» у працы БСЖ.

— Апошнім часам паступае ўсё больш і больш (да 70 у год) заяў ад моладзі на ўступленне ў Беларускі саюз журналістаў. Ужо сёння з больш як 2 тысяч членаў БСЖ маладых журналістаў добрая трэць. І працэс амаладжэння працягваецца. Моладзі складана самастойна — без падказкі старэйшых таварышаў — арыентавацца ва ўсіх пытаннях сённяшняй палітыкі, эканомікі. Вось мы і падумалі, што нядрэнна было б адрадзіць так званы інстытут настаўніцтва, — кажа Анатоль Лемяшонак. — На форуме маладых журналістаў, я не сумняваюся, будзе закранацца пытанне будучыні журналістыкі — у прыватнасці, друкаваных СМІ. — Ходзяць размовы, што тыражы сціснуцца, як шагрэневая скура, і з часам папяровая журналістыка не будзе запатрабавана. Што датычыцца мяне як старшыні БСЖ, я перакананы, што газеты будуць жыць. Праўда, каб не згубіць чытача, ім трэба відазмяніцца: стаць больш яркімі, больш цікавымі. Неабходнасць рэфармавання падказала само жыццё.

Надзея ДРЫЛА

■ Сёння — Сусветны дзень некурэння

АДМОЎЦЕСЯ ЎЖО З РАНІЦЫ

Фота Пятра ФАМІНА.

Вучоны свет назапасіў дастатковую колькасць фактаў, якія сведчаць аб цеснай сувязі паміж частатой сардэчна-сасудзістых і злаякасных захворванняў і павелічэннем ужывання тытунёвых вырабаў.

Паводле слоў намесніка дырэктара па арганізацыйна-метадычнай рабоце РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М.М. Аляксандрава, доктара медыцынскіх навук Наталлі АНТОНЕНКАВАЙ, канцэрагенныя рэчывы, на якія багаты тытунь, вызначаюць цесную сувязь курэння і развіцця анкалагічных захворванняў. Той, хто курыць, павялічвае ўласную рызыку захварэць на рак амаль у 30 разоў. Як правіла, для развіцця раку лёгкага неабходна ад 10 да 30 гадоў курэння. Дрэнная звычка павялічвае рызыку развіцця раку ротавай поласці і глоткі, гартані і лёгкага, стрававода і страўніка, падстраўнікавай залозы і печані, мачавога пузыра і ныркі, а таксама шыйкі маткі ў жанчын.

Кожная цыгарэта крадзе ў чалавека да 30 мг вітаміну С. Гэта абавязкова адбіваецца на крывятворнай сістэме. Калі мы дрэнна сябе адчуваем пасля злоўжывання спіртным і тытунём, то гэта якраз з-за гібелі мільярдаў эрытрацытаў!

Эфект уздзеяння хімічных рэчываў тытуню — асноўны фактар рызыкі захворвання на інфаркт міякарда і іншыя сардэчныя хваробы. Крывяныя цельцы набываюць большую клейкасць, утвараюцца крывяныя згусткі, а таксама з'яўляюцца дробныя шрамы на ўнутранай сценцы сасудаў, паверхня якіх становіцца шурпатай. Гэта спрыяе назапашванню тлушчу, што паскарае ўзнікненне атэрасклерозу. Курэнне можа стаць прычынай слепаты. У асноўным гэта датычыцца пажылых курцоў — з-за ўзроставага перараджэння вочнай абалонкі. Курцы ў 1,7 раза часцей становяцца тугавухімі. Звычка павялічвае рызыку імпатэнцыі. З гэтай залежнасцю звязваюць шэраг ускладненняў падчас цяжарнасці, ранні надыход менапаўзы і «жаночыя» дэпрэсіі.

Калі вы кінеце курыць....

праз 20 хвілін пасля апошняй цыгарэты артэрыяльны ціск знізіцца да нормы, аднавіцца работа сэрца, палепшыцца кровазварот далоняў і ступняў;

праз 8 гадзін нармалізуецца колькасць кіслароду ў крыві;

праз 2 сутак узмоцніцца здольнасць адчуваць смак і пах;

праз тыдзень палепшыцца колер твару, знікне тытунёвы пах ад скуры, валасоў;

праз месяц стане лягчэй дыхаць, знікне ранішні галаўны боль, адступіць кашаль;

праз паўгода пульс стане радзейшы, зachoчацца фізічнай нагрузкі;

праз 1 год рызыка развіцця каранарнай хваробы сэрца ў параўнанні з курцамі знізіцца напалову;

праз 5 гадоў рэзка зменшыцца верагоднасць загінуць ад раку лёгкіх у параўнанні з тымі, хто выкурвае пачак у дзень.

Святлана БАРЫСЕНКА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ ЧУП «ПОРЕЧЬЕ БЕЛКООПСОЮЗА»

Организатор аукциона: Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, 226 91 19, 226 99 22.

Аукцион проводится **17 декабря 2012 г.** в 14 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз, утвержденным постановлением Правления Белкоопсоюза от 08 мая 2012 № 146.

Сведения о предмете аукциона (продается одним лотом):

лечебно-профилактический блок со столовой (общей площадью 2 409,6 кв.м, инв. № 600/С-57830);

спальный корпус (общей площадью 3 113,0 кв.м, инв. № 600/С-57829);

гараж (общей площадью 124,4 кв.м, инв. № 600/С-125975).

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 623685200001000048, площадью 0,9494 га, по адресу: Минская обл., Минский р-н, Острошицко-Городокский с/с, район деревни Острошицкий Городок, предоставленном на праве постоянного пользования.

Начальная цена — 5 724 997 110 (пять миллиардов семьсот двадцать четыре миллиона девятьсот девяносто семь тысяч сто десять) белорусских рублей с НДС.

Сумма задатка — 572 499 711 (пятьсот семьдесят два миллиона четыреста девяносто девять тысяч семьсот одиннадцать) белорусских рублей.

Обременения — нет.

Условия продажи — нет.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и условия оплаты за объекты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419 ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагрmaprомбанк» г. Минска, код 963.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1003, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 12 часов 30 минут 14 декабря 2012 г.

Сведения о продавце: Частное торгово-производственное унитарное предприятие «Поречье Белкоопсоюза», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 17. Тел. (017) 226 97 08.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

ПРЫМАЮЦЦА МЕРЫ ПА СТРЫМЛІВАННІ РОСТУ КОШТУ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ З ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ

Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 6 лістапада 2012 года № 1023, якая афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

У 2013 годзе ў Беларусі запланавана пабудаваць 6,5 млн кв.м жылля. Пры гэтым у першым квартале павінна быць узведзена не менш за 15 працэнтаў ад гадавога аб'ёму, у першым паўгоддзі — не менш за 50 працэнтаў, за 9 месяцаў — 75 працэнтаў. Запланавана стварэнне зачыну пад праграму жыллёвага будаўніцтва на 2014 год. Абласныя выканаўчыя камітэты, Мінгарвыканкам сумесна з Мінбудархітэктуры павінны давесці да падпарадкаваных арганізацый заданні на 2013 год па ўводзе ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылых дамоў, у тым ліку для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Па ўзгодненні з Мінбудархітэктуры, Мінэнерга, Мінсувязі будуць зацверджаны графікі будаўніцтва (рэканструкцыі) і фінансавання аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры для раёнаў жылой забудовы, уключаючы раёны індывідуальнай жылой забудовы на 2013 год.

Аблвыканкамы і Мінсельгасхарч у 2013 годзе павінны забяспечыць будаўніцтва ў сельгасарганізацыях жылых дамоў, кватэр па тыпавых праектах, у тым ліку гаспадарчым спосабам, з прыцягненнем ільготных крэдытных рэсурсаў Белаграпрамбанка, а таксама стварацца неабходныя ўмовы для прыцягнення дадатковых пазабюджэтных крыніц, у тым ліку сродкаў насельніцтва, арганізацый, прафсаюзаў, для фінансавання будаўніцтва жылых дамоў і кватэр.

Урад прапануе Беларусбанку і Белаграпрамбанку забяспечыць штомесячнае выдзяленне, у тым ліку на льготных умовах, крэдытных рэсурсаў. Фінансаванне будаўніцтва жылых дамоў і аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры будзе весціся ў адпаведнасці з зацверджанымі праграмамі.

Таксама згодна з пастановай мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы зацвердзяць паказчыкі кошту будаўніцтва квадратнага метра агульнай плошчы жылля тыпавых спажывецкіх якасцяў у памерах, якія не перавышаюць Br4,6 млн, для разліку льготных крэдытаў і аднаразовых субсідый.

БАНКІ ВЫДЗЕЛЯЦЬ ЖЫЛЛЁВЫХ КРЭДЫТАЎ НА Br653,5 млрд

Беларускія банкі прадаставяць грамадзянам у 2013 годзе крэдытных рэсурсаў для будаўніцтва (рэканструкцыі) або набыцця жылых памяшканняў на агульную суму Br653,5 млрд. Аб'ёмы крэдытавання зафіксаваны ў пастанове Савета Міністраў № 1023 ад 6 лістапада 2012 года, якая афіцыйна апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале, паведамляе карэспандэнт БЕЛТА.

■ Погляд

Viva Куба!

13 лістапада 2012 года адбылася прэс-канферэнцыя Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Куба ў Рэспубліцы Беларусь Альфрэда Ньевеса Партуонда з нагоды прыняцця ў ААН рэзалюцыі «Аб неабходнасці спынення эканамічнай, гандлёвай і фінансавай блакады, уведзенай Злучанымі Штатамі Амерыкі супраць Кубы». Паўдзельнічаць у прэс-канферэнцыі ў якасці судакладчыка прапанавалі і мне.

Альфрэда Партуонда абмаляваў прысутным журналістам сітуацыю з прыняццем Генеральнай Асамблеяй ААН згаданай рэзалюцыі, асабліва падкрэсліўшы, што гэта галасаванне, якое будзе праводзіцца ўжо 21 раз. У 2011 годзе ў падтрымку кубінскай рэзалюцыі выступіла 186 дзяржаў — членаў ААН, а супраць прагаласавала толькі дзве, уключаючы самі Злучаныя Штаты. Пасол Рэспублікі Кубы адзначыў, што такая аднадушная падтрымка ў ААН надзвычай рэдкая і сведчыць аб усеагульнай падтрымцы пазіцыі Кубы. Ён таксама падкрэсліў, што Куба як суверэнная дзяржава не баіцца выступіць супраць такой вялікай дзяржавы, як ЗША, адчуваючы сваю праўду. Была названа ім і агульная сума ўрону, нанесенага Кубе амерыканскай блакадай за больш чым 50 гадоў. Ён складае 1 трыльён 66 мільярдаў долараў (з улікам абясцэньвання долара ў дачыненні да золата). Як гэта і пацвярджаецца думкай пераважнай колькасці краін свету, эканамічная блакада Кубы з'яўляецца незаконным і варожым актам, які парушае міжнароднае права, супярэчыць палажэнням і прынцыпам Статута ААН, парушае права суверэннай дзяржавы на мірнае існаванне, развіццё і бяспеку і можа па сваёй сутнасці і мэтах кваліфікавацца як акт генацыду паводле Жэнеўскай канвенцыі 1948 года.

Пасол прывёў шэраг эпізодаў, якія дэманструюць негатыўны ўплыў блакады на развіццё Кубы. Урад ЗША штрафуе замежныя банкі на сотні мільёнаў долараў за ажыццяўленне законных фінансавых трансакцый у інтарэсах Кубы, дапамагае амерыканскім прадпрымальнікам прысвойваць кубінскія таварныя знакі і маркі, якія не маюць нічога агульнага з ЗША. Альфрэда Партуонда таксама выказаў падзяку міністру замежных спраў Беларусі Уладзіміру Макею за тое, што ў сваім выступленні ў ААН ён закрануў тэму блакады Кубы і загадзя падзякаваў беларускаму ўраду за падтрымку кубінскай рэзалюцыі ў ААН.

У сваім выступленні я нагадаў прысутным, што блакада ЗША супраць Кубы з'яўляецца толькі адным з апошніх эпізодаў пастаяннай дзейнасці ўрада ЗША супраць суверэнных правоў кубінскага народа. У XIX стагоддзі Куба была іспанскай калоніяй, якая прыносіла іспанцам велізарныя багацці. Асноваі эксперту Кубы быў цукар, які ў тыя часы адыгрываў такую ж важную ролю ў міжнародным гандлі, якую цяпер адыгрывае нафта. Перыядычна Куба была найбуйнейшым экспарцёрам цукру на сусветнай арэне, што не магло не быць заўважана ў ЗША, магутнасць якіх пастаянна расла на фоне падзення ўплыву Іспаніі. У той жа час у ЗША разумелі, што спроба зрабіць Кубу калоніяй па ўзоры Іспаніі пасля адрывання ад яе можа абысціся занадта дорага, паколькі свабодалюбны кубінскі народ прадэманстраваў непрымірымасць у барацьбе за незалежнасць з іспанскімі каланізатарамі, што стала вельмі дорага абыходзіцца іспанскай кароне. Таму ЗША выбралі напаўкаланіяльную формулу панавання над Кубай, якая дазваляла б спакаваля кантраляваць палітыку і эканоміку Кубы, атрымліваць жаданыя багацці з эксплуатацыі вострава, не сутыкаючыся з неабходнасцю душыць паўстанні. Засталося толькі адабраць Кубу ў Іспаніі і рэалізаваць задуманую формулу кантролю. У рамках вайны з Іспаніяй за яе калоніі ў Амерыцы амерыканскі ўрад падмануў кубінскіх патрыётаў, прыняўшы ў Кангрэсе папраўку Тэлера, у адпаведнасці з якой ЗША прапанавалі сваю дапамогу кубінцам супраць іспанскага ярма, паабяцаўшы пасля суменснай перамогі над Іспаніяй гарантаваць суверэнітэт Кубы. Кубінцы прынялі ваенную дапамогу супраць іспанцаў, але пасля перамогі над каланізатарамі ЗША адмянілі папраўку Тэлера, прыняўшы законапраекты, у адпаведнасці з якімі Куба стала фактычна напаўкалоніяй ЗША. Быў уведзены жорсткі нагляд за ўсімі дзеяннямі кубінскага ўрада, на Кубе атабарыўся амерыканскі ваенны кантынгент, закліканы кантраляваць лаяльнасць кубінцаў, Кубу прымусілі саступіць шэраг тэрыторый пад базы ЗША рознай скіраванасці, уключаючы сумна вядомае Гуантанама.

На фоне гэтых гістарычных падзей цяперашняя бяспрыкладная па працягласці і разбуральных наступствах блакада ЗША не выклікае здзіўлення. Калі ў 1959 годзе на Кубе перамагла рэвалюцыя і новы ўрад сканцэнтраваў у сваіх руках усе суверэнныя паўнамоцтвы над краінай, не жадаючы больш дзяліцца імі з ЗША, вялізная амерыканская імперыя была абражана стратай кантролю над важнай у стратэгічных адносінах тэрыторыяй. Так і склаліся перадумовы для прыняцця ў наступныя гады рашэння аб увядзенні блакады. Яна ніяк не звязана з праблемамі дэмакратыі на Кубе, як беспаспяхова спрабавалі пераканаць свет амерыканцы. Блакада толькі дэманструе несуцішнае жаданне амерыканцаў вярнуць сабе кантроль над тэрыторыяй і народам Кубы. І яны не адмаўляюцца ад блакады, баючыся «страціць твар» і здацца слабымі. Я таксама адзначыў, што цяперашні гадавы ўзровень ВУП Кубы ў дзесяць тысяч долараў на жыхара мог бы быць у 2—2,5 раза вышэй, зрабіўшы тым самым Кубу адной з найбагацейшых краін у Лацінскай Амерыцы, калі б не блакада з боку ЗША. Куба прадэманстравала здольнасць да гэтага, здолеўшы нават ва ўмовах такой жорсткай блакады дамагчыся ўзроўню медыцыны лепшага, чым у Лацінскай Амерыцы.

Сяргей КІЗІМА,
загадчык кафедры міжнародных адносін Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, доктар палітычных навук.

Калектыў Інстытута журналістыкі Белдзяржуніверсітэта глыбока смуткуе з прычыны смерці старшага выкладчыка кафедры фізічнага выхавання і спорту БДУ, адказнага за спартыўна-масавую работу на факультэце журналістыкі, ЭЛЧАКЯНА Саркіса Акопавіча і выказвае шчырыя спачуванні яго блізкім і родным.

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества	**Лот № 1.** Котел водогрейный твердотопливный КВ-1,ОТ стоимостью 105 715 668 руб. **Лот № 2.** Топка для сжигания биомассы СТБ-1,0 стоимостью 261 225 235 руб.
Собственник (владелец) имущества	ОАО «Шумилинский льнозавод»
Местонахождение (адрес) имущества	Шумилинский район, д. Приозерная
Информация об обременениях имущества	Передано в залог
Место (адрес), дата и время проведения торгов	г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321 11.12.2012 г. в 10.30
Справочная информация об организаторе торгов	Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 321, http:// vitebsk.court.by/, http://vitebsk@court.by/ судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел./факс (80212) 49-13-43, (8-044) 734-93-00, старший судебный исполнитель Бородулин Алексей Александрович, тел. (80212) 49-13-40, (8044) 746-73-00
Условия и порядок проведения торгов	Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670, не позднее 10 ч. 30 м. 11.12.2012 г. Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с ч. 3 ст. 401 ХПК Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества.

РУП «Институт недвижимости и оценки»

► **ОЦЕНКА ИМУЩЕСТВА (недвижимость, транспорт, оборудование, бизнес, интеллектуальная собственность)**
► **ОРГАНИЗАЦИЯ И ПРОВЕДЕНИЕ АУКЦИОНОВ**

Извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Белинвестбанк»

Лот № 1	Объект, расположенный по адресу: Брестская область, Березовский р-н, г. Берёза, пер. Ягодный		
Наименование	**Площадь**	**Начальная цена с НДС, руб.**	**Задаток, с НДС, руб.**
Здание банка с инвентарным номером 120/С-20757	155 м²	759 135 200	40 000 000
Описание	Назначение: здание административно-хозяйственное, наименование – здание банка. Дата ввода в эксплуатацию – 1995 г. Общая площадь застройки 212 м², общая площадь здания – 155 м². Фундамент – бетонный. Стены, перегородки – кирпичные. Перекрытия чердачные – железобетонные. Крыша – совмещенная, рулонная. Полы – дощатые. Проемы оконные – двойные с металлическими решетками. Проемы дверные – простые с металлическими решетками. Внутренняя отделка – окраска, оклейка обоями, облицовка. Водопровод – стальные трубы. Электроосвещение – скрытая проводка. Теплоснабжение – центральное, однотрубное с нижней разводкой. Канализация – чугунные трубы. Телефонная связь – каблировано. Вентиляция – вентканалы.		
Земельный участок	Земельный участок площадью 0,0493 га с кадастровым номером 120850100001000902. Свидетельство о государственной регистрации от 25.10.2012 №200/1427-223. Целевое назначение: земельный участок для размещения объектов иного назначения (для обслуживаний зданий банка). Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством.		
УСЛОВИЯ	Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость фактических затрат по организации и проведению аукциона в размере, не превышающем 8 000 000 руб., на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона либо претендент на покупку, в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан произвести оплату всей стоимости Объекта до передачи имущества, не позднее 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.		

Цель использования объекта не ограничивается. Шаг аукциона – 5%.

Аукцион состоится 17.12.2012 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4.

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором торгов); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором торгов) и заключившие с Организатором торгов соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором торгов), а также прилагаются следующие документы: юр. лица – доверенность, выданную представителю юр. лица, копии учредительных документов и свидетельства о гос.регистрации; индивидуальные предприниматели – копию свидетельства о гос. регистрации; физ. лица – паспорт, представители физ.лиц – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; организациям и физ.лицам (нерезидентам РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена в течение года до подачи заявления на участие в

«СІСТЭМЕ АДУКАЦЫІ ПАТРАБУЕЦЦА ГАЛІНОВАЕ ПАВЫШЭННЕ ЗАРОБКАЎ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Напрыклад, па пытаннях заробкаў? Аднойчы вы былі вымушаны канстатаваць, што ў адказ на звароты наконт павелічэння заробкаў педагогам вам даволі часта даводзілася чуць папрокі кшталту «вас вельмі шмат...»

— Шматлікасць работнікаў адукацыйнай галіны і сапраўды часта ўскладняе вырашэнне пытання з ростам рэальнай заработнай платы. Але мы супраць такога выключна бухгалтарскага падыходу. Задача па павелічэнні прадукцыйнасці працы пераносіцца на нас з рэальнага сектара эканомікі абсалютна механічна. Фінансісты, напэўна, жадаюць адразу ўбачыць эфект ад укладання фінансавых сродкаў — як у рэальным сектары эканомікі. Але ў выхаванні і навучанні маленькага чалавечка так быць не можа: ад дзіцячага садка да выпуску на рынак працы маладога спецыяліста праходзіць вялікі адрэзак часу. Але чым больш мы ўкладзём сёння ў адукацыю, тым большы плён атрымаем праз пэўны час. Гэта аксіёма.

На нарадзе Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з педагагічным актывам краіны кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што пры ўсіх змяненнях у сістэме адукацыі роля настаўніка заўсёды будзе галоўнай і вызначальнай, таму статус педагогаў у грамадстве трэба падняць на новую вышыню, пры гэтым увязаўшы павелічэнне іх заработнай платы з удасканаленнем якасці адукацыі. Гэта вельмі складаная, але рэальная задача. Аднак пакуль што сітуацыя з заробкамі ў галіне адукацыі складваецца вельмі трывожная. Так, сярэдні заробак у сістэме адукацыі за 9 месяцаў склаў 2 681 100 рублёў, або 324 долары; у тым ліку ў педагагічных работнікаў — 2 967 900 рублёў, або 358 долараў; у настаўнікаў — 3 174 700 рублёў, або 383 долары, і ў прафесарска-выкладчыцкага саставу — 4 620 900 рублёў (558 долараў). У выхавальнікаў установ дашкольнай адукацыі з улікам стымулюючых выплат сярэдні заробак складае ўсяго каля 2 млн 37 тысяч рублёў, у работнікаў метадычных службаў — каля 1 млн 962 тысяч рублёў, а ва ўстановах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі — 1 млн 886 тысяч рублёў.

Скажыце, і як можна сёння захаваць педагагічны патэнцыял установ дадатковай адукацыі? Да таго ж педагогам гэтых устаноў пакінулі ўсяго 24 дні для адпачынку. Між іншым, у працы гэтай катэгорыі работнікаў ёсць свая спецыфіка — наведванне гурткоў і секцый не з'яўляецца для дзяцей абавязковым, як, напрыклад, наведванне школы. Гэта ў школе настаўнікаў не выбіраюць. А педагогаў, пад кіраўніцтвам якіх дзеці займаюцца сваёй любімай справай, яны выбіраюць самастойна. Таму калі педагогу не ўдалося зацікавіць дзяцей, то ён проста застанецца без педагагічнай нагрузкі, таму ў сістэме пазашкольнага выхавання затрымліваюцца толькі педагогі ад Бога, улюбёныя ў сваю справу людзі. Прычым працуюць літаральна за капейкі.

Больш за тое, нават сярэдняя пенсія па ўзросце, якая павінна скласці ў лістападзе 1 млн 964 тысячы рублёў, ужо перавышае заробкі асобных катэгорый педагогаў. Многія нашы ранейшыя заваёвы па павелічэнні заробкаў педагогаў, на жаль, дэвальвуюцца на фоне інфляцыйных працэсаў. Мы пакуль так і не змаглі выйсці на ўзровень заробкаў, які быў у галіне напрыканцы 2010 года...Таму лічу, што сістэме адукацыі тэрмінова патрабуецца галіновае павышэнне заробкаў. Проста павелічэнне заробкаў у сувязі з ростам тарыфнай стаўкі першага разраду сістэму адукацыі не выратуе. І мы так і не дачакаемся прыходу ў педагагічныя ВНУ добра падрыхтаваных і высокаматываваных абітурыентаў. Моладзь будзе шукаць іншыя шляхі для сваёй самарэалізацыі. А праз некалькі гадоў хто будзе вучыць нашых дзяцей? Пагадзіцеся, гэта парадокс — у некваліфікаваных рабочых заробкі сёння вышэйшыя, чым у педагогаў!

Магу дадаць, што ўнутраныя рэзервы галіны па ўдасканаленні аплаты працы педагагічных работнікаў практычна вычарпаныя, таму без дзяржаўнай падтрымкі сістэме адукацыі не абысціся.

— Зусім нядаўна была зацверджана новая інструкцыя аб парадку атэстацыі педагагічных работнікаў. Калі меркаваць па водгуках чытачоў «Звязды», то педагогі ў абсалютнай большасці не падтрымліваюць новыя «правілы гульні». Ёсць меркаванне, што настаўнікі проста пачнуць адмаўляцца ад пацвярджэння вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі, улічваючы мізэрную розніцу ў аплаце катэгорый. А якая пазіцыя прафсаюза па гэтым пытанні?

— Падчас абмеркавання праекта Інструкцыі аб парадку правядзення атэстацыі педагагічных работнікаў на прысваенне ім кваліфікацыйных катэгорый пазіцыя галіновага прафсаюза была прынцыповая: нарматывы надбавак за наяўнасць кваліфікацыйных катэгорый трэба павялічваць у 3-4 разы! Як я ўжо казаў, устанавіць залежнасць заробка педагога ад якасці яго работы — задача складаная, але вырашальная. Атэстацыя павінна спрыяць павышэнню кваліфікацыі, якасці адукацыі, і абысціся без задзейнічання фінансавых рычагоў тут немагчыма. Вышэйшая кваліфікацыйная катэгорыя і катэгорыя «настаўнік-метадыст» — гэта вышэйшы пілатаж у педагогіцы. Але калі не будзе прынята рашэнне аб павелічэнні надбавак за наяўнасць кваліфікацыйнай катэгорыі, то ў педагогаў і сапраўды не будзе ніякага стымулу, каб атрымліваць ці пацвярджаць гэтыя катэгорыі. Зараз даплата за вышэйшую катэгорыю, якую цяпер давядзецца пацвярджаць кожныя пяць гадоў, складае 290 тысяч рублёў, за першую кваліфікацыйную катэгорыю — 190 і за другую — 140 тысяч. Дык ці вартая аўчынка вырабу? Кваліфікацыйная катэгорыя павінна не проста быць часткай іміджу педагога, а гарантаваць яму адпаведны ўзровень заробкаў. Вырашаць гэтыя пытанні трэба ў сукупнасці, інакш мы будзем ламаць галаву ўжо не толькі над тым, чаму ў педагагічную адукацыю не ідуць лепшыя абітурыенты, але і над тым, чаму сыходзяць з прафесіі кваліфікаваныя работнікі.

«Даплата за вышэйшую катэгорыю, якую цяпер давядзецца пацвярджаць кожныя пяць гадоў, складае 290 тысяч рублёў, за першую кваліфікацыйную катэгорыю — 190 і за другую — 140 тысяч. Дык ці вартая аўчынка вырабу?»

— Аляксандр Аляксандравіч, прызнайцеся, ці хвалюе вас выключна «жаночы твар» беларускай педагогікі?

— Як мужчыну гэтая акалічнасць мяне, вядома, радуе *(смяецца)*, але як бацька я скажу, што прысутнасць сапраўднага мужчыны ў школе і ўвогуле ў любой установе адукацыі вельмі важная. Аднак дыскрымінацыя ў аплаце працы па гендарным прынцыпе, якая ўжо адбылася ў некаторых краінах, нам не падыходзіць. Заробкі трэба павышаць усім педагогам, а не толькі педагогам-мужчынам. Лічу, што падзенне цікавасці да педагогікі з боку мужчын тлумачыцца ў немалой ступені падзеннем прэстыжу гэтай прафесіі ў грамадстве. Нежаданне мужчын звязваць сваю будучыню з педагогікай — праблема, у прынцыпе, тыповая для большасці еўрапейскіх краін. Гэта канстатуе і кіраўнік Еўрапейскага камітэта прафсаюзаў адукацыі спадар Марцін РОМЕР. Адна з нешматлікіх еўрапейскіх краін, дзе моладзь ахвотна ідзе ў педагогіку, гэта Фінляндыя. Прычым пры адборы будучых спецыялістаў там звяртаюць увагу не толькі на акадэмічную паспяховасць прэтэндэнтаў, але і на іх маральна-псіхалагічныя якасці, без якіх педагог не можа адбыцца. Перад прыняццем ва ўніверсітэт усе будучыя педагогі праходзяць спецыяльнае інтэрв'ю, падчас якога выкладчыкі спрабуюць высветліць, як чалавек будзе весці сябе ў той ці іншай сітуацыі, як ён будзе рэагаваць на магчымую крытыку з боку навучэнцаў ці іх бацькоў, як будзе паводзіць сябе з так званымі «цяжкімі» вучнямі. Магчыма, і нам ёсць сэнс бліжэй прыгледзецца да Фінляндыі, каб зразумець іх феномен папулярнасці педагогікі сярод моладзі. Дарэчы, у Фінляндыі, дзе прафесія настаўніка лічыцца адной з самых паважаных і запатрабаваных, прадстаўніцтва мужчын складае больш за палову педагогаў.

— Інтэрнацыянал адукацыі звязвае зніжэнне якасці адукацыі ў свеце з кароткатэрміновасцю працоўных зносін з педагагічнымі работнікамі. На вашу думку, ці апраўданае заключэнне кантрактаў з усімі катэгорыям работнікаў галіны, асабліва з улікам таго, што з-за нізкіх заробкаў установам адукацыі і так не хапае тых жа памочнікаў выхавальнікаў і абслуговага персаналу?

— Прадмет асаблівага гонару нашага прафсаюза — гарантыі галіновага пагаднення ў вобласці кантрактнай формы найму. Працэдура звальнення таго, хто працуе па кантракце, для наймальніка не менш далікатная, чым у выпадку з дагаворам на няпэўны тэрмін. Не працягваючы ці не заключаючы новы кантракт з добрасумленным работнікам, наймальнік абавязаны па просьбе гэтага работніка пісьмова патлумачыць прычыны сваіх дзеянняў. Мэтанакіраваная работа прафсаюзных органаў на працягу шэрагу гадоў дала свае станоўчыя вынікі: калі ў 2007 годзе на максімальны тэрмін заключалася 27,9% працэнта кантрактаў, то ў 2011 годзе — 40,2%. Назіраецца таксама тэндэнцыя росту даверу наймальнікаў і работнікаў да бестэрміновага працоўнага дагавора. У шэрагу раёнаў ужо палова работнікаў галіны працуе на ўмовах бестэрміновага працоўнага дагавора. Як правіла, гэта адбываецца там, дзе прадугледжаныя кантрактамі дадатковыя сацыяльныя гарантыі работнікам насілі касметычны характар. Але калі, напрыклад, у выхавальніка ёсць магчымасць атрымаць пяць дадатковых дзён водпуску да гарантаванага мінімуму, то ён, як правіла, робіць выбар на карысць заключэння кантракта.

— Не менш актуальнае пытанне — аптымізацыя сеткі ўстаноў адукацыі. За апошнія пяць гадоў у Беларусі было рэструктурызавана або закрыта каля тысячы ўстаноў адукацыі. Ці заўсёды ўдаецца працаўладкаваць педагогаў? І ўвогуле, ці заўсёды прыняцце рашэння аб закрыцці школы можна назваць прадуманым?

— Давайце рэальна ставіцца да жыцця. Безумоўна, кожнаму настаўніку хочацца заставацца працаваць на ранейшым месцы, а не ездзіць у школу за 15-20 кіламетраў, нават калі ў яго класе будуць усяго адзін-два вучні. Але ж ці правільна гэта з дзяржаўнага пункту погляду? Працэс рэструктурызацыі заўсёды вымагае ўзважаных рашэнняў. І тут трэба думаць як пра інтарэсы дзяцей, так і пра тое, як і дзе будуць працаўладкаваны педагогі. Шчыра кажучы, вырашаць пытанне з працаўладкаваннем педагогаў ліквідаваных школ становіцца ўсё больш праблематычна. Колькасць вучняў зніжаецца, адпаведна зніжаецца і нагрузка на педагогаў. На пачатак 2012/2013 навучальнага года было закрыта 106 устаноў адукацыі. Па стане на 1 верасня колькасць работнікаў, вызваленых у ходзе аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі, але не працаўладкаваных, склала 386 чалавек, з іх 86 педагогаў. У сельскай мясцовасці педагогу ліквідаванай школы ўвогуле даволі цяжка знайсці сабе прымяненне, таму людзі там, як правіла, трымаюцца за сваю работу. Калі закранаць тэму закрытых школ, то трэба звярнуць увагу яшчэ на дзве акалічнасці: гэта падвоз дзяцей у суседнія населеныя пункты і праблемы, з якімі сутыкаюцца настаўнікі, якім за свае грошы даводзіцца ездзіць на работу штодня за 30-40 кіламетраў. **Пытанне кампенсацыі настаўнікам кошту іх праезду са сродкаў мясцовых бюджэтаў пакуль не вырашана**.

Цяпер што датычыцца падвозу дзяцей: школьнікаў суправаджае дзяжурны настаўнік, які нясе адказнасць за іх бяспеку, жыццё і здароўе па дарозе з дома ў школу і назад. У той жа час па-ранейшаму не ўрэгулявана пытанне нарміравання і аплаты іх працы. Мы выходзілі ў Міністэрства адукацыі з прапановай аднесці выкананне работы па забеспячэнні падвозу навучэнцаў да відаў работ, якія ўваходзяць у склад арганізацыйна-выхаваўчай работы. Пры гэтым устанавіць на яе выкананне не менш як 9 гадзін у тыдзень. Спадзяёмся, што да нашай думкі прыслухаюцца...

— Апошнім часам акрэслілася яшчэ адна праблема: выкладчыкі ВНУ лічаць, што пераход на чатырохгадовы тэрмін падрыхтоўкі спецыялістаў пацягне за сабой вызваленне педагагічных работнікаў...

— Іх асцярога небеспадстаўная. Пераход на чатырохгадовы тэрмін навучання будзе суправаджацца ліквідацыяй дублявання. Што мы назіраем сёння: тых жа эканамістаў або юрыстаў рыхтуюць амаль паўсюдна, профільных спецыялістаў рыхтуюць у няпрофільных ВНУ. Таму будуць або скарачацца пэўныя пасады, або зніжацца нагрузка. У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, які адзін з першых перайшоў на чатырохгадовы тэрмін падрыхтоўкі спецыялістаў, з гэтым ужо сутыкнуліся. Але на чым дакладна нельга эканоміць, дык гэта на выхаванні дзяцей: у школах патрэбны і сацыяльныя педагогі, і псіхолагі. І аб'яднанні па інтарэсах павінны працаваць, каб кожнае дзіця магло сабе знайсці занятак па душы... Гэта менавіта той напрамак, дзе мы супраць любой аптымізацыі...

— Аляксандр Аляксандравіч, а як вы паставіцеся да прапановы аб'явіць у Беларусі Год настаўніка? Магчыма, гэта дапаможа прыцягнуць больш пільную ўвагу грамадства да асобы Педагога?

— Мала проста аб'явіць Год урача, Год работніка культуры ці Год настаўніка, таму што патрабуецца фінансавае напаўненне гэтага мерапрыемства. Да пытання павышэння сацыяльнага статусу педагогаў трэба падыходзіць якасна і адказна. Упэўнены, што пакуль мы не зможам прапанаваць настаўніку пэўны сацыяльны пакет, то не зможам разлічваць ні на прыцягненне ў школы педагогаў-мужчын, ні на прыцягненне ў педагагічныя ВНУ «якасных» абітурыентаў. Сацыяльны пакет павінен быць не толькі ў прыватных фірмах... А для таго, каб вярнуць педагогам права на датэрміновы выхад на пенсію, грошай і ўвогуле амаль не патрабуецца. Цяпер настаўнікі могуць датэрмінова пайсці на пенсію пасля дасягнення 50 гадоў для жанчын і 55 гадоў для мужчын толькі калі яны прарабілі ў школе 25 і 30 гадоў адпаведна, а таксама пры выкананні яшчэ адразу трох умоў, а менавіта ў выпадку вядзення імі выкладчыцкай работы ў аб'ёме не менш як 18 вучэбных гадзін у тыдзень, арганізацыйна-выхаваўчай работы і дадатковага кантролю за вучэбнай дзейнасцю навучэнцаў. Паколькі на практыцы толькі рэдкі настаўнік можа адпавядаць адразу тром умовам, больш як 90 працэнтаў настаўнікаў у Беларусі пазбавіліся права выхаду на пенсію датэрмінова. Я лічу гэта стратэгічнай памылкай. Права датэрміновага выхаду на пенсію дае ўпэўненасць педагогу ў заўтрашнім дні, у тым, што ў выпадку хваробы ці іншых абставін настаўнік зможа выкарыстаць яго і не застанецца без сродкаў да існавання. Моладзь бачыць у пажылых педагогах сваю будучыню. І калі будучыня непрывабная, то і стаўленне да прафесіі будзе адпаведнае...

Але педагогі — людзі з высокай дзяржаўнай адказнасцю за даручаную дзяржавай справу. Ад іх залежыць настрой у грамадстве. Таму яны спадзяюцца на дзяржаўную падтрымку. Справа ж прафсаюза як абараніць канкрэтнага чалавека, так і падказаць шляхі падтрымкі ўсёй педагагічнай супольнасці.

■ Работа на імідж

ПРАФСАЮЗНАЕ ЖЫЦЦЁ... У САЦЫЯЛЬНЫХ СЕТКАХ

Як вы мяркуеце, што агульнага ёсць у сусветнага павуціння і студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі? Ці ў сацыяльных сетак і работы прафсаюзнага актывіста? Аказваецца, вельмі шмат...

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя М.Танка вырашылі правесці апытанне, каб даведацца, адкуль студэнты чэрпаюць інфармацыю пра падзеі ў сценах сваёй ВНУ? Усяго ў апытанні былі задзейнічаны 250 чалавек.

— Шчыра кажучы, адказы нас зусім не здзівілі, — канстатуе **старшыня пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДПУ Вадзім ГРАЧОЎ.** — 44% (110 чалавек) паведамілі, што для іх асноўнай крыніцай інфармацыі з'яўляюцца спецыяльныя старонкі ў сацыяльных сетках. 35% (88 чалавек) спаслаліся на сайты БДПУ, студэнцкіх грамадскіх арганізацый і органаў студэнцкага самакіравання. 17% (42 чалавекі) назвалі кіраўніцтва, студэнцкі актыў факультэта, куратара і актыў вучэбнай групы. Аб'явы, плакаты і інфармацыйныя лісткі на стэндах узгадалі толькі 10 чалавек, або 4% ад агульнай колькасці. Што і трэба было даказаць. Амаль 80% інфармацыі нашы студэнты бяруць з інтэрнэту і з гэтым трэба лічыцца.

«Якасны сайт можа стаць паўнавартасным і вельмі эфектыўным «штатным работнікам» апарату»

— Трэба зразумець, што старыя добрыя інфармацыйныя стэнды сябе зжылі, — падкрэслівае Вадзім Грачоў. — Цяпер, як адзначаюць у сваіх адказах студэнты, чытаць аб'яву яны будуць толькі тады, калі не прачытаць яе немагчыма, а гэта значыць, у тых месцах, дзе чалавек затрымліваецца па аб'ектыўных прычынах.

Яскравы прыклад — ліфт. Даследаванне паказала, што аб'явы, змешчаныя ў ліфтах, чытаюцца амаль заўсёды і ўсімі. Тое ж самае можна сказаць пра стэнды, якія змешчаны, напрыклад, каля ліфтаў ці банкаматаў у нас ва ўніверсітэце. Ну і яшчэ эфектыўнымі з'яўляюцца аб'явы, размешчаныя на стэндах з раскладам заняткаў або ў непасрэднай блізкасці. А вось інфармацыя на іншых стэндах (у калідорах, у прахадных фае і г.д.), як правіла, праходзіць міма мэтавай аўдыторыі.

— Яшчэ 5 гадоў таму стварэнне прафсаюзнай арганізацыяй таго ці іншага ўзроўню ўласнага сайта здавалася нам задачай складанай, нават завоблачнай. А сёння мы бачым, што канцэпцыя інфармацыйнай работы галіновага прафсаюза прынесла свае плённыя вынікі. На мой погляд, калі арганізацыі няма ў інтэрнэце, то значна зніжаецца яе патэнцыял. Сайт — гэта, у першую чаргу, аператыўнасць размяшчэння інфармацыі, магчымасць наладжвання зваротнай сувязі з наведнікамі, правядзення апытанняў па актуальных сацыяльных праблемах, а значыць, і магчымасць аператыўнага рэагавання на патрэбы студэнтаў. Мы не павінны забывацца і на тое, што інфармацыя на сайце — афіцыйная, ёй можна верыць і смела ёй карыстацца, — кажа старшыня прафкама.

Вобразна кажучы, якасны сайт можа стаць паўнавартасным і вельмі эфектыўным «штатным работнікам» апарату прафсаюзнага камітэта. Так, мы спачатку ўкладваем у яго пэўныя матэрыяльныя, маральныя і арганізацыйныя рэсурсы. Але ж аддачу, якую нам прыносіць затым сайт, пераацаніць цяжка.

Напрыклад, замест таго, каб укладваць у лісты-выклікі абітурыентам усю інфармацыю, якая датычыцца выдзялення месцаў у інтэрнаце, і траціць шмат паперы і арганізацыйных рэсурсаў, цяпер можна ў лістах-выкліках проста дадаць фразу: уся інфармацыя аб парадку выдзялення месцаў у інтэрнаце змешчана на сайтах універсітэта і прафкама студэнтаў.

— У жніўні колькасць наведнікаў сайта амаль кожны дзень перавышала 100 чалавек, у рубрыцы «ПЫТАННЕ-АДКАЗ» мы адказалі больш чым на 40 пытанняў. У наступным годзе плануем ажыццявіць і такую форму кансультацыйнай работы, як скайп-канферэнцыя. Дзейнасць прафсаюзных арганізацый павінна быць прадстаўлена належным чынам і ў сацыяльных сетках, — упэўнены Вадзім Грачоў. — Не сакрэт, што навучэнская моладзь сёння ледзь не круглыя суткі знаходзіцца там. А значыць, мы павінны гэтым эфектыўна карыстацца.

Вынікі апытанняў, праведзеных на сайце Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі:

Пытанне навучэнцам, што пражываюць на кватэрах. Ці заключаны з вамі дагавор найму жылога памяшкання?
Так 21 (20,4%)
Не 82 (79,6%)

Ці задаволены вы ўмовамі для харчавання ў вашай установе?
Так 38 (37,3%)
Не 64 (62,7%)

Ці карыстаецеся вы банкаўскімі крэдытамі пры аплаце навучання?
Так 5 (13,2%)
Не 33 (86,8%)

Аналіз апошняга апытання на сайце прафкама БДПУ:

Што, на ваш погляд, з'яўляецца самым важным складнікам сістэмы сацыяльнай абароны студэнцкай моладзі?

Забяспечанасць месцам у інтэрнаце — 41% (15 галасоў).

Стыпендыяльнае забеспячэнне, надбаўкі да стыпендыі за поспехі ў вучобе, грамадскай і навуковай дзейнасці — 32% (12 галасоў).

Абавязковае ўзгадненне з прафкамам прымянення мер дысцыплінарнага спагнання да студэнтаў — членаў прафсаюза — 11% (4 галасы).

Магчымасць атрымаць скідку са сфарміраванага кошту за навучанне для студэнтаў-платнікаў — 8% (3 галасы).

Магчымасць прайсці аздараўленне ў санаторыі-прафілакторыі — 5% (2 галасы).

Матэрыяльная дапамога па сацыяльных паказчыках — 3% (1 голас).

ЭКСПЕРЫМЕНТ ПА ФІНАНСАВАННІ: ЯК НЕ НАСТУПІЦЬ НА ГРАБЛІ?

1 СТУДЗЕНЯ 2013 года ў Беларусі стартуе эксперымент па ўкараненні новай мадэлі фінансавання агульнай сярэдняй адукацыі на падставе нарматыву бюджэтнай забяспечанасці на навучанне і выхаванне аднаго навучэнца. Для таго, каб быць гатовымі да работы ў новых умовах, пры ЦК галіновага прафсаюза была створана рабочая група па вывучэнні ўдасканалення механізма фінансавання ўстаноў адукацыі і магчымага пераходу на новую сістэму аплаты працы педагагічных работнікаў. Члены рабочай групы выязджалі ў Расійскую Федэрацыю, у прыватнасці, вывучалі досвед работы калег з Масквы, Маскоўскай, Бранскай і Смаленскай абласцей.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Пасля аналізу ўсёй атрыманай інфармацыі мы прыйшлі да высновы, што новая сістэма, пры якой фінансаванне ідзе следам за вучнем, прымушаючы педагогаў змагацца за кожнае дзіця, мае не толькі перавагі, але і недахопы, — расказаў **намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА.** — Адназначным плюсам падушавой сістэмы фінансавання з'яўляецца магчымасць у школы, якая працуе паспяхова, палепшыць сваё эканамічнае становішча за кошт прыцягнення новых вучняў. З іншага боку, і школы, якім пакуль няма чым пахваліцца, вымушаны працаваць над якасцю адукацыйнага працэсу, каб не пазбавіцца эканамічнай магчымасці працягваць сваю работу. Значыць, іх вучні таксама не ў пройгрышы?

Разам з тым, як мы пераканаліся, павышэнне заробкаў можа аказацца часовай з'явай, звязанай не з рэфармаваннем сістэмы аплаты працы, а з разавым павелічэннем фінансавання галіны. Напрыклад, у маскоўскіх школах, якія ўдзельнічалі ў пілотным праекце, заробкі павысіліся ў сярэднім на 15-20 працэнтаў. Падушавы нарматыў у Расіі істотна адрозніваецца ў розных рэгіёнах і нават у межах аднаго рэгіёна. Для сельскіх школ, пасялковых, школ малых гарадоў і абласных цэнтраў уводзяцца розныя нарматывы. У Маскве да 70% фонду аплаты працы накіроўваецца на аплату работы педагагічных работнікаў, да 15,1 % — адміністрацыі, а астатняя частка (14,9%) — вучэбна-дапаможнаму і абслуговаму персаналу. Памер стымулюючага фонду складае 30%. А ў горадзе Пушкіна Маскоўскай вобласці памер фонду стымулявання складае ўсяго каля 15%.

— Практыка паказвае, што стымулюючая частка фонду працуе толькі тады, калі яе памер складае больш як 15%. Таму педагогаў Маскоўскай вобласці і не задавальняе цяперашняя сітуацыя. Прычына — у недастатковым нарматыве на аднаго вучня і, адпаведна, у памерах фінансавання. Больш за тое, на 2012 год бюджэт Пушкіна быў зменшаны на 22%, адпаведна па ўсіх установах вобласці ўпраўленнем адукацыі быў зменшаны памер фінансавання на аналагічны працэнт, што адбілася і на змяншэнні фонду стымулявання. Прасцей кажучы, адбылася падгонка нарматыву пад аб'ёмы фінансавання, — дадаў Раман Дапіра.

Школы — без вучняў, а педагогі — без работы?

Ад увядзення новай сістэмы фінансавання ўстаноў адукацыі і аплаты працы педагогаў выйграюць, у першую чаргу, школы буйных гарадоў, а сярод гэтых школ тыя, што былі створаны даўно і добра вядомыя сярод бацькоў і іх вучняў. Гэта пацвярджаецца і тым фактам, што ў 83 установах Масквы ў бягучым навучальным годзе не быў забяспечаны набор у першыя класы.

— Спецыялісты рабочай групы прыйшлі да высновы, што для лепшага фінансавання школе трэба толькі дабівацца нарматыўнай напаўняльнасці — 25 чалавек у класе, — падкрэсліў Раман Дапіра. — Патлумачу, што маецца на ўвазе. Дапусцім, у 8-ы клас за больш высокай якасцю адукацыі пажадалі прыйсці 10-11 навучэнцаў з іншых школ. Мець клас з напаўняльнасцю 35-36 чалавек не дазваляюць санітарныя нормы, значыць, трэба стварацьдва класы ў паралелі па 18 чалавек у кожным. Школа атрымала дадатковыя грошы на 10-11 чалавек, а выдаткоўваць іх давядзецца на колькасць урокаў, якія праводзяцца ўжо не ў адным, а ў двух класах. А для такой колькасці урокаў трэба было атрымаць дадатковыя сродкі не на 10-11, а на 25 чалавек. Мяркуем, што сённяшні поспех пілотнага праекта заснаваны на прыцягненні ў школы новых дзяцей і атрыманні дадатковага фінансавання. Калі ж на новую сістэму пяройдуць усе ўстановы адукацыі, заробкі перастануць расці. Ёсць рызыка, што адміністрацыя школ пойдзе на ўзбуйненне класаў, што дазволіць ёй эканоміць сродкі на ўзроўні ўсёй школы.

Таксама дзейныя ў Расіі нарматывы фінансавання на аднаго вучня не прадугледжваюць аплату працы работы выхавальнікаў груп падоўжанага дня. Ліквідаваўшы ўсе групы падоўжанага дня, адміністрацыя школы палепшыла фінансавае становішча, але як быць з інтарэсамі дзяцей? Укараненне новай сістэмы таксама прывяло да страты спецыялістаў, прама не звязаных з навучальным працэсам: псіхолагаў, сацыяльных педагогаў і іншых.

Ва ўмовах пашырэння правоў кіраўнікоў на ўвядзенне ўнутрышкольных сістэм стымулявання работнікаў можа стацца так, што стымулюючыя выплаты будуць атрымліваць не самыя граматныя і працаздольныя, а найбольш лаяльныя работнікі.

Некаторыя дырэктары школ могуць палічыць, што для іх больш выгадна, каб настаўнікі не атэстоўваліся на больш высокія катэгорыі: чым больш у школе педагогаў з катэгорыямі, тым больш сродкаў трэба выдаткоўваць з фонду аплаты працы і тым меншая стымулюючая частка.

Складнікі нарматыву: навучанне + выхаванне

На падставе аналізу расійскага досведу, ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі накіраваў у Міністэрства адукацыі сваю пазіцыю наконт запланаванага правядзення ў нашай краіне эксперымента па ўкараненні новага механізму фінансавання.

— Улічваючы лакалізацыю эксперымента, **вызначэнне нарматыву фінансавання пры яго правядзенні павінна ажыццяўляцца не ад дасягнутага, а ад неабходнага з улікам дзейных у агульнай сярэдняй адукацыі стандартаў,** — падкрэсліў Раман Дапіра. — Нарматыў павінен уключаць складнікі як навучання, так і выхавання, у тым ліку наяўнасць адпаведных штатных адзінак (педагогаў-псіхолагаў, сацыяльных педагогаў, педагогаў-арганізатараў), правядзенне факультатыўных, гурткоўых і іншых заняткаў, стварэнне груп падоўжанага дня. Нарматывам таксама павінны быць улічаны тыповыя штаты, дзейная сістэма аплаты працы, матэрыяльнае стымуляванне, матэрыяльная дапамога ў адпаведных аб'ёмах, неабходнасць павышэння кваліфікацыі, уключаючы атэстацыю і перападрыхтоўку кадраў. **Узровень аплаты працы работнікаў установ, задзейнічаных у эксперыменце, не павінен быць меншым, чым дасягнуты. У Міністэрстве адукацыі падзяляюць нашу пазіцыю.**

Нарматыў павінен улічваць тып установы адукацыі, геаграфію яе размяшчэння, камплектнасць і г.д. праз увядзенне адпаведных карэктуючых каэфіцыентаў. Ён павінен быць арыентаваны не на гранічную напаўняльнасць класа, а на метадычна і сацыяльна абумоўленую. Варта падумаць над увядзеннем нарматыву не на вучня, а на класкамплект — гэта рэкамендуюць калегі і эксперты з Расійскай Федэрацыі, паколькі вызначальным з'яўляюцца суадносіны колькасці настаўнікаў да колькасці вучняў, а не напаўняльнасць класа.

Трэба стварыць такі механізм фарміравання нарматыву, які быў бы арыентаваны на ўдасканаленне кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў, прыцягненне ў калектывы высококваліфікаваных кадраў і маладых спецыялістаў. Такім чынам, нарматыў павінен разлічвацца з улікам адпаведнага кваліфікацыйнага ўзроўню настаўнікаў.

Абавязкова трэба дакладна вызначыць рамкі самастойнасці ўстаноў адукацыі, якія задзейнічаны ў эксперыменце, і паўнамоцтвы іх кіраўнікоў. Зацікаўленасць кіраўнікоў устаноў адукацыі, уцягнутых у эксперымент, павінна базавацца на фінансавым складніку. Выходзячы з таго, што ў Расіі эксперымент па нарматыўна-падушавым фінансаванні праводзіўся з 2006 года з улікам распрацовак і даследаванняў, якія ўжо меліся на той момант, у ЦК галіновага прафсаюза лічаць, што запланаваны ў Беларусі эксперымент павінен быць доўгатэрміновым. Толькі пры такім падыходзе можна будзе рэальна ўбачыць наступствы і ацаніць іх характар. А далейшае распаўсюджванне эксперымента магчыма толькі пры яго станоўчых выніках і не павінна закранаць сельскія і малакамплектныя ўстановы адукацыі.

Матэрыялы паласы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

ПЛАЦДАРМ

Сумесны праект рэдакцыі газеты «Звязда» і Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь

Выпуск № 8 (16)

■ Прызыў-2012

ПАЙШЛІ СЛУЖЫЦЬ АЙЧЫНЕ

Сёння пачалася адпраўка ў войскі Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Забеспячэнне новым папаўненнем воінскіх часцей краіны будзе ажыццяўляцца з 15 па 30 лістапада, а тымі, хто будзе праходзіць службу ў рэзерве, — з 22 па 23 лістапада.

Статус прызыўніка на ваеннаслужачага тэрміновай службы першымі змянілі прадстаўнікі элітных войскаў — роты ганаровай варты, 5-й брыгады спецыяльнага прызначэння, 103-й мабільнай брыгады. На працягу двух тыдняў будуць укамплектоўвацца прызыўнікамі і іншыя воінскія часці.

Нагадаем: з мінулага года змяніўся час прызыву на тэрміновую ваенную службу і на службу ў рэзерве. Узброеныя Сілы перайшлі да ранейшай практыкі, калі набор у армію ажыццяўляўся вясной і восенню. Летась першы вопыт ужо быў.

— Змяненне тэрмінаў прызыву стала зручнейшым як для Узброеных Сіл, так і для саміх прызыўнікоў, — зазначылі ў Міністэрстве абароны. — Па заканчэнні навучальных устаноў іх не выклікалі для праходжання ваеннай медыцынскай камісіі. У выпускнікоў навучальных устаноў быў час спакойна закончыць вучобу, уладкавацца на працу ці далей працягнуць навучанне.

Валерый САПОЖНІКАЎ:

«ПСІХАЛАГІЧНАЯ «ЗБРОЯ» ПЕРАЎТВАРАЕЦЦА Ў САМАСТОЙНЫ І ЭФЕКТЫЎНЫ СРОДАК СУЧАСНАЙ ВАЙНЫ»

■ Тонкасці прафесіі

Параіцца з ваенным псіхолагам прыйшоў камандзір аддзялення пажарнай каманды Яўген КІСЛЮК.

У кожнай вобласці чалавечай дзейнасці, дзе гаворка ідзе пра асобных людзей ці нават цэлыя калектывы, нярэдка можа спатрэбіцца парада псіхолага. Спецыяліст падобнага роду заўсёды займае важнае і адказнае месца ў любой арганізацыі ці структуры. Не выключэнне — Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь. Толькі быць ваенным псіхолагам — няпроста. Пра асаблівасці гэтай прафесіі мы даведаліся ў практыкуючага ваеннага псіхолага, старшага памочніка начальніка аддзялення ідэалагічнай работы 61-й знішчальнай авіябазы Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі Валерыя САПОЖНІКАВА.

Для знаёмства. Валерый Сапожнікаў — вайсковец у чацвёртым пакаленні. Скончыў ваенны факультэт БДУ. Па спецыялізацыі — ваенны псіхолаг. З 2 курса больш вузка займаецца авіяцыйнай псіхалогіяй. Не адна курсавая і, вядома ж, дыплом былі прысвечаны менавіта гэтай тэматыцы. У 2009 годзе Валерый Сапожнікаў займае першае месца сярод псіхолагаў Паўночана-Заходняга аператыўна-тактычнага камандавання. Летась за навуковую працу «Выкарыстанне методыкі «Ключ» у пераадоленні сіндрому эмацыйнага выгарання ў вайскоўцаў» становіцца лепшым і сярод ваенных псіхолагаў войскаў Ваенна-паветраных сіл і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл краіны.

— Валерый Алегавіч, на конкурсе такога ўзроўню перамагаюць толькі тыя, хто прапаноўвае пэўныя новаўвядзенні. У чым сутнасць вашай працы?

— Лётная дзейнасць, асабліва знішчальная авіяцыя, патрабуе вельмі вялікіх перагрузак. Як фізічных, так і эмацыйных. У знішчальнай авіяцыі асноўная форма падрыхтоўкі — складаны пілатаж, які выконваецца ва ўсіх дыяпазонах вышынь. Бывае, што лётчык здзяйсняе да трох вылетаў у адзін палётны дзень. У выніку інтэнсіўнай падрыхтоўкі ў яго пачынаюць праяўляцца сімптомы стомы, ператамлення і, як вынік, боязь здзейсніць памылку. Таму, каб пазбавіць лётчыка ад гэтага стану, зняць напружанасць і павысіць працаздольнасць, я прапанаваў цэлы комплекс практыкаванняў, якія можна выконваць у працэсе падрыхтоўкі да палётаў, паміж імі ці падчас адпачынку.

— А ці ёсць патрэба вылучаць авіяцыйную псіхалогію ў асобную прафесійную галіну ваенных?

— Патрэба вельмі вялікая. І так думаю не толькі я. Гэта асаблівы род дзейнасці, які вылучаецца вялікімі нагрузкамі, высокай рызыкай авіяцыйнага інцыдэнту і адказнасцю не толькі за сябе, а і за іншых. Яшчэ ў Савецкім Саюзе былі цэлыя інстытуты па радах авіяцыі, якія займаліся канкрэтна верталётчыкамі, знішчальнікамі, далёкай авіяцыяй, бамбардзіроўшчыкамі... Сёння развіваць авіяцыйную псіхалогію нам прыходзіцца ва ўмовах незалежнай дзяржавы — Рэспублікі Беларусь. Думаю, настане час, калі ў кожнай авіяцыйнай базе з'явіцца пасада авіяцыйнага псіхолага, які стане працаваць непасрэдна з лётным складам.

— Выкажу здагадку, што на яе прэтэндуеце і вы?

— Не памыляецеся! Мяне даўно цікавіць псіхалогія людзей авіяцыі. Памятаю, як упершыню прыехаў на авіябазу, што ў Мачулішчах. Мая задача была — правесці псіхалагічнае тэсціраванне сярод лётчыкаў. Праўда, перш мяне правезлі на верталёце, каб я адчуў тое, што кожны раз адчуваюць яны. Была ноч, мы на некаторы час «завіслі» над ускраінай Мінска. Шчыра кажучы, усё гэта мне сказала больш, чым тэсціраванне. Адчуў нават нейкую рамантыку.

— Яшчэ больш рамантычным было б быць лётчыкам?

— Непасрэдна лётная дзейнасць мяне асабіста не вабіць. Мяне цікавіць менавіта спецыяльнасць, выбраная мной.

— Мяркую, што немалая роля ваеннага псіхолага ў вызначэнні псіхалагічных крытэрыяў адбору асабовага складу для пэўнага роду войск?

— Сапраўды. Штораз разам з прадстаўнікамі часці я прымаю ўдзел у рызыўной кампаніі, калі мы адбіраем папаўненне для нашай авіяцыйнай базы. Вывучаем асабістыя справы, гутарым з прызыўнікамі і, зыходзячы з нашых кіруючых дакументаў, робім высновы. У нас ёсць зацверджаны пералік крытэрыяў, па якіх можна прызыўніку адмовіць ці адправіць яго на паглыбленае вывучэнне.

— І на гэтым узаемаадносіны паміж псіхолагам і вайскоўцам заканчваюцца?

— Не з усімі. Сярод вайскоўцаў тэрміновай службы ёсць кола людзей, так званая група дынамічнага назірання, якая знаходзіцца пад маім кантролем. Бывае і група рызыкі, куды звычайна ўваходзяць людзі з псіхалагічнымі праблемамі. На шчасце, у нас такіх няма. Што сведчыць добрую работу ў ваенкаматах: чым лепш адпрацуеш там, тым прасцей табе будзе потым. А вось у групу дынамічнага назірання ўваходзяць вайскоўцы ў залежнасці ад этапу службы ў арміі. Напрыклад, тыя, хто толькі прыйшоў і яму цяжка адаптавацца ў замкнутым калектыве: ці ён вельмі хатні, ці, напрыклад, яго выхоўвала толькі маці. З такім чалавекам я часцей маю зносіны, цікаўлюся, з кім ён наладзіў кантакты, як ён прыстасоўваецца да армейскага жыцця. Калі ўсё наладжваецца, такі вайскавец з гэтай групы выключаецца. Праўда, перыядычна я ўсё роўна за ім назіраю, размаўляю ў нефармальнай абстаноўцы, калі ён можа мне больш сказаць, чым у кабінетным фармаце.

— Атрымліваецца, што астатнія вайскоўцы ўвагай псіхолага абдзелены...

— Не зусім так. Яшчэ на пачатку службы я з салдатамі тэрміновай службы праводжу трэнінгі на згуртаванне калектыву. Акрамя таго, любы ахвотны можа наведаць мяне і індывідуальна. Звычайна вайскоўцаў цікавяць прыёмы зняцця эмацыйнага напружання ці асабістыя праблемы, з якімі яны самастойна не могуць справіцца. Бывае, што юнакі дзеляцца са мною самым патаемным. Таму мая задача — аказаць ім псіхалагічную падтрымку.

— А можа, часам і папярэдзіць шматлікія негатыўныя праявы ў стасунках паміж ваеннаслужачымі?

— Сапраўды. Сярод вайскоўцаў пастаянна праводжу анкетаванне. Выкарыстоўваю шэраг методык на выяўленне лідарскіх якасцяў. Назіраю за хлопцамі ў штодзённай дзейнасці: як яны ідуць у страі, зашпіленыя ці не, хто дзе стаіць і як размаўляе з таварышамі. Затым раблю пэўныя высновы: ужо па гэтых характарыстыках можна выявіць патэнцыяльнага лідара або парушальніка дысцыпліны. Таму, калі своечасова гэта заўважыў, на такога вайскоўца можна паўплываць і нават зараней прадухіліць яго дзеянні.

— Напэўна, можаце паўплываць і на тое, падымецца той ці іншы лётчык сёння ў неба ці не?

— Толькі паўплываць. Не больш за тое! Перад палётамі гутару з лётчыкамі, пакуль яны рыхтуюцца да канкрэтных практыкаванняў, і ўрач вызначае: прыдатны ён сёння да палёту ці не. Я іх амаль усіх ведаю, знаёмы з іх паводзінамі. Таму, калі заўважаю нейкія адхіленні на псіхалагічным узроўні, падыходжу да зампаліта і папярэджваю яго. Я не маю магчымасці адхіліць гэтага лётчыка ад палёту, што мае права зрабіць той жа ўрач. Магу толькі рэкамендаваць, спасылаючыся на прычыну.

— Гісторыя вядзення войнаў паказвае, што вялікія палкаводцы, правільна ўлічваючы псіхалагічныя магчымасці войскаў, атрымлівалі перамогу над больш шматлікім ворагам, узброеным параўнальна сучаснай зброяй. Аляксандр Македонскі, Напалеон, Пётр I, Суворaў, Кутузаў... Атрымліваецца, што яны здолелі скарыстацца нябачнай, але магутнай сілай — псіхікай байцоў.

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ

Валерый САПОЖНІКАЎ прымяняе методыку калыхання «Ключ» на вайскоўцах: напружанне змяняе спакой.

— Псіхалагічная «зброя» пераўтвараецца ў самастойны, эфектыўны і параўнальна танны сродак сучаснай і будучай вайны. І ад таго, наколькі гатовымі будуць войскі супрацьлеглых бакоў дзейнічаць ва ўмовах прымянення сучасных баявых псіхатэхналогій, у значнай ступені будзе залежаць ход і зыход бітваў, лёсы народаў і дзяржаў, будучыня планеты.

— Гэтым самым вы падкрэсліваеце значэнне і ролю ваеннай псіхалогіі ў падрыхтоўцы вайскоўцаў да абароны Айчыны?

— Абсалютна дакладна! Калі чалавек у паніцы, эмацыйна не падрыхтаваны, ён не выканае пастаўленую задачу. А калі ён дакладна ведае, за што змагаецца, у яго падсвядомасці ўзнікае ўпэўненасць у сваёй зброі. І яна можа быць нават не самай лепшай! Усё залежыць ад псіхалагічнай устаноўкі.

— А калі гэтыя ўстаноўкі дзейнічаюць не на ўсіх?

— Тады псіхолаг павінен вызначыць людзей эмацыйна слабых, якія могуць зламацца падчас бою. Калі атрымаецца, з імі папрацаваць. Вядома, не ўсё залежыць ад псіхолага. У першую чаргу, бацькі павінны выхоўваць будучага абаронца ў духу патрыятызму. Не малое значэнне мае і тая эпоха, калі ён вырас. Мы можам выявіць недахопы, з імі папрацаваць, але не ў нашых сілах перавыхаваць асобу.

— Напэўна, на псіхолага нярэдка ўскладаецца абавязак па адборы і класіфікацыі персаналу?

— Яшчэ як нярэдка! Падбор персаналу для кантрактнай службы, падрыхтоўка заключэнняў і рэкамендацый для тых, хто хоча вучыцца на прапаршчыка, напісанне характарыстык на кожнага салдата тэрміновай службы... Калі да нас прыходзіць чалавек неваенны, які хоча працаваць на афіцэрскай пасадзе, мая задача вызначыць яго матывацыю і зразумець яго памкненні, а затым вырашыць: падыходзіць ён нам ці не.

— У ідэале, якім тыпам тэмпераменту павінен валодаць лётчык?

— Як няма эталону псіхічнага здароўя, так не бывае і ідэальных лётчыкаў. Тым больш што той жа тып тэмпераменту залежыць ад роду авіяцыі. Калі гэта верталётчыкі, дзе экіпаж — тры чалавекі, пажадана, каб адзін з іх быў флегматыкам, а другі — халерыкам: калі адзін памыліцца, то другі выправіць. І наадварот, калі халерык зрабіў нешта хутка, але няправільна, флегматык падумае і зробіць так, як трэба. Напрыклад, сярод тых жа лётчыкаў-знішчальнікаў я сустракаў людзей з абсалютна рознымі тыпамі тэмпераменту і рысамі характару. І ўсе яны выдатна спраўляліся з пастаўленымі задачамі.

— Затое псіхолагам павінна быць уласціва такая рыса характару, як безудзельнасць. Колькі людзей да вас прыходзіць са сваімі праблемамі... Мяркую, не абдзелены вашай увагай і родныя лётчыкаў?

— Сапраўды, да мяне прыходзяць і яны. Аднак, шчыра кажучы, я да гэтага часу так і не навучыўся ад усяго гэтага абстрагавацца. Хоць нас вучылі: зачыніліся за чалавекам дзверы, ты павінен пра ўсё забыць. Толькі ў мяне так не атрымліваецца: так пранікаюся той ці іншай гісторыяй, што, бывае, доўгі час не магу адысці. Хоць і разумею, што многім, наадварот, пасля таго, як яны падзеляцца сваёй праблемай, становіцца лягчэй.

— А проста па параду салдаты тэрміновай службы, напэўна, ісці да вас не спяшаюцца... Ці не таму, што звычайна ў такім узросце псіхолаг успрымаецца як псіхіятр, а яго кліент — як псіх?

— Не магу з вамі не пагадзіцца. На жаль, гэты зман вельмі распаўсюджаны сярод моладзі. Як і тое, што стаўленне да псіхолага часта залежыць ад самога спецыяліста. Можна быць вельмі добрым псіхолагам ці ніякім спецыялістам, у роўнай ступені да цябе не прыйдуць. А ўся справа ў стэрэатыпах. Калі яшчэ малодшае пакаленне вайскоўцаў да мяне ідзе, то старэйшае ніяк не размяжоўвае паняцці «псіхолаг» і «псіхіятр». А чым старэйшы чалавек, тым больш у яго забабонаў.

— Існуе думка, што пасля арміі псіхіка юнакоў мяняецца не ў лепшы бок. Вы з гэтым згодны?

— Не згодны! Тут справа ў іншым. Зараз існуе такая праблема, як інфантылізацыя моладзі. У чым яе сутнасць? Прывяду прыклад. Калі аднойчы мне на вочы трапіў фотаздымак маёй прабабулі, на мяне глядзела дарослая жанчына, як мне падалося, гадоў 26. Як аказалася, на момант фатаграфавання ёй тады споўнілася толькі 17. Я да таго, што ў пачатку мінулага стагоддзя людзі хутчэй сталелі. Сёння сітуацыя інакшая. Наша грамадства, наша сістэма адукацыі пабудавана так, што сучасная моладзь максімальна несамастойная як мага больш часу. Невыпадкова псіхалагічнае саспяванне адбываецца значна пазней. Атрымліваецца, што ў такім псіхалагічна малым узросце ён трапляе ў армію і, адпаведна, сутыкаецца са шматлікімі цяжкасцямі. Адзін трапляе ў добрыя ўмовы, дзе лёгка знаходзіць узаемапаразуменне з камандзірам, саслужыўцамі. А другі — у жорсткі калектыў, дзе зусім іншыя патрабаванні і каштоўнасці, да якіх ён мусіць прыстасоўвацца. Вось і атрымліваецца, што фарміраванне юнака прыпадае якраз на армію. У адных пасля службы характар мяняецца ў лепшы бок, іншым, наадварот, служба дапамагае стаць больш дарослым і самастойным. Што да мяне, то, дзякуючы арміі, я стаў сталым мужчынам!

■ Баявая падрыхтоўка

«БАГІ ВАЙНЫ» НАНОСЯЦЬ УДАР

Быў час, калі па магутнасці артылерыя не ўступала ніякай іншай зброі. Менавіта дзякуючы ёй на полі бою вырашалася большасць агнявых задач, ад яе залежаў вынік шматлікіх бітваў. Прыгадаць толькі контрнаступленне савецкіх войскаў пад Сталінградам 19 лістапада 1942 года, калі тысячы гармат пачалі бой. Невыпадкова гэты дзень адзначаецца і сёння як Дзень ракетных войскаў і артылерыі.
Прайшло не адно дзесяцігоддзе. Прагрэс далёка ступіў наперад. Сёння прыярытэты аддаюцца высокадакладнай зброі. Ці не засталіся без працы артылерысты, ці не засунуты яны самім часам на задворкі?

Фота БелТА.

— Спакон веку артылерыя лічылася якраз тым родам войскаў, які найбольш дакладна наносіць агнявое паражэнне, — перакананы **начальнік ракетных войскаў і артылерыі Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Алег ЗЯМСКОЎ.** — І нават тыя сродкі, якія ёсць сёння, са сродкамі разведкі і сродкамі падрыхтоўкі даных у пэўнай ступені з'яўляюцца дастаткова дакладнымі.

У гэтым можна было ўпэўніцца падчас кантрольнага занятку з ракетнымі войскамі і артылерыяй Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання па кіраванні ракетнымі ўдарамі і агнём артылерыі, што адбыўся на палігоне «Асіповіцкі» напярэдадні прафесійнага свята.

Вайскоўцы тэрміновай службы і рэзервісты 231-й артылерыйскай брыгады, 427-га рэактыўнага артылерыйскага палка, 120-й і 19-й гвардзейскіх асобных механізаваных брыгад (усяго каля 1000 чалавек!) адпрацоўвалі пытанні падрыхтоўкі і нанясення ракетных удараў, вядзення агню артылерыяй, кіравання артылерыйскімі групамі рознага складу, прымянення разведвальна-ўдарных комплексаў у складзе ракетных воінскіх часцей і беспілотных авіяцыйных комплексаў. Свае навыкі пры адпрацоўцы вучэбна-баявых задач юнакі прадэманстравалі на рэактыўных сістэмах залпавага агню «Ураган», «БелГрад», «Град» і на самаходных гаўбіцах 2С-3 «Акацыя» і 2С-1 «Гваздзік».

— Кантрольны занятак — лагічны працяг мерапрыемстваў аператыўнай падрыхтоўкі, якія праводзіліся пад кіраўніцтвам начальніка Генеральнага штаба з аператыўнымі, аператыўна-тактычнымі камандаваннямі, — зазначыў Алег Зямскоў. — Рашэнне, пастаноўка і выкананне агнявых задач ажыццяўляліся на рэальных адлегласцях у рэальным маштабе часу. Гэтым самым мы паслядоўна ўвасабляем ідэі па развіцці разведвальна-агнявой сістэмы.

Для правядзення кантрольных стрэльбаў была створана ваенная абстаноўка. Задума занятку — удзел ракетных войскаў і артылерыі ў падрыхтоўцы і нанясенні засяроджаных удараў па групоўках верагоднага праціўніка. Вучэнне праходзіла ў два этапы. На першым — асноўныя намаганні былі сканцэнтраваны на падрыхтоўцы наступальнага бою. На другім этапе адпрацоўваліся дзеянні абарончага характару.

Вучэбна-тактычнае поле стракацела мішэнямі. Таму задачы выконваліся рэальныя, у тым ліку з прыцягненнем разведвальных сродкаў, перш за ўсё, беспілотных авіяцыйных комплексаў. Верагоднасць пападання снарадаў у мірныя аб'екты была выключана: усё адбывалася толькі ў межах палігона. Аднак у мэтах бяспекі напярэдадні падобных мерапрыемстваў мясцовых жыхароў папярэджваюць праз мясцовую ўладу і сродкі масавай інфармацыі. У дзень правядзення занятку выстаўляецца ачапленне, задача якога — не дапусціць пранікненне на тэрыторыю палігона старонніх людзей.

Традыцыйна, у адпаведнасці з планамі, падрыхтоўка на палігоне з усімі кантрольнымі мерапрыемствамі займае месяц. Трэба адзначыць, што кантрольны занятак — экзамен не толькі для вайскоўцаў тэрміновай службы, а і для рэзервістаў.

Камандзір адной з самаходных артылерыйскіх установак радавы рэзерву Яўген ГУБСКІ расказаў аб удзеле ў кантрольным занятку, які стаў для яго экзаменам:

— Дагэтуль страляць з такой магутнай зброі яшчэ не даводзілася. Гэтая артылерыйская ўстаноўка прызначана для паражэння як пяхоты, так і мінамётных і танкавых батарэй на розных адлегласцях. Калі экіпаж працуе зладжана, тады і вынікі будуць выдатнымі. Нашу працу ацанілі на адзнаку «добра». Не расчараваўся ў выбары ваеннай спецыяльнасці: быць артылерыстам — быць сапраўдным мужчынам.

На палігоне было задзейнічана каля 55 адзінак баявой тэхнікі, у тым ліку каля 30 танкаў і іншых машын. Акрамя ўжо прынятых на ўзбраенне, у ходзе занятку выкарыстоўваліся новыя і мадэрнізаваныя ўзоры і комплексы ўзбраення і ваеннай тэхнікі як беларускай, так і расійскай вытворчасці. Безумоўна, не абышлося і без прыцягнення сродкаў сувязі і кіравання.

Сярод тэхнічных навінак, якія выкарыстоўваліся, — відэаканферэнцсувязь, якая забяспечвалася з беспілотных лятальных апаратаў. Таму камандуючы войскамі Паўночна-заходняга аператыўнага камандавання генерал-маёр Іван Чавус у рэальным часе меў магчымасць прымаць рашэнні на выкананне задач, знаходзячыся на аддаленні амаль у 200 кіламетраў! Ён меў поўную інфармацыю аб тым, як выконваліся яго каманды і якія вынікі падрыхтоўкі і нанясення ўдараў.

Што ж, век артылерыі яшчэ не скончыўся. Нездарма яе называюць «богам вайны». Відаць, невыпадкова і тое, што летась упершыню праводзіўся набор на факультэт ракетных войскаў і артылерыі Ваеннай акадэміі. Раней такіх спецыялістаў рыхтавалі на агульнавайсковым факультэце гэтай навучальнай установы. Значыць, такія спецыялісты сёння запатрабаваныя. Таму без працы артылерысты дакладна не застануцца!

Матэрыялы паласы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА.

«РАЗГНЕВАНЫ СОКАЛ-2012»

У дзяржаве Катар праходзяць шматнацыянальныя стратэгічныя вучэнні «Разгневаны сокал-2012», у якіх задзейнічаны і беларускі кантынгент. Узначальвае яго намеснік начальніка галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных Сіл палкоўнік Павел Муравейка.

Сем гадзін лёту — і лета. У ілюмінатарах ваенна-транспартнага судна іншы свет. Бірузовае мора, белая пустыня. Усё зіяціць ад асляпляльнага сонца... Для беларусаў Катар падрыхтаваў цёплы прыём. Нават занадта, калі ўлічыць, што прыляцелі з халаднаватай восені ў 40-градусную спякоту.

Як людзі ваенныя, мы адразу пачалі вывучаць раён будучых дзеянняў. У Паўднёвай Азіі Катар завуць жамчужынай Персідскага заліва. Раней краіна была вядома дзякуючы здабычы жэмчугу. І ўсё ж да пачатку XX стагоддзя яна заставалася даволі беднай. Пакуль тут не знайшлі яшчэ адну каштоўнасць — нафту.

Сталіца Катара Доха стала яскравым пацвярджэннем таго, што адолець пяскі здольная не толькі вада. Для таго, каб на распаленай пустцы завіравала жыццё, трэба, каб ключом з яе біла нафта. Да таго ж Катар валодае трэцім па велічыні запасам газу ў свеце. Аднак эканамічнаму дабрабыту паспрыяла не толькі вуглевадародная сыравіна. Краіна прытрымліваецца курсу індустрыялізацыі і інтэнсіўнага сацыяльнага развіцця. Бурны рост прамысловасці, бясплатныя медыцына і адукацыя — у Беларусі і Катара шмат агульнага. Нядзіўна, што дзве дзяржавы хутка знайшлі агульную мову і паразуменне. Умацаванне ўзаемаадносін у абаронай сферы — заканамерны працяг супрацоўніцтва. Запрашэнне прадстаўнікоў Узброеных Сіл Беларусі на вучэнні — таму пацвярджэнне.

Усяго ў вучэннях «Разгневаны сокал-2012» прымае ўдзел 28 дзяржаў. Найбольш актыўная роля адведзена Беларусі, Балгарыі, Вялікабрытаніі, Іарданіі, Тунісу, Судану, ЗША, ФРГ. Ад нашай краіны да манеўраў прыцягнулі падраздзяленні, якія спецыялізуюцца па пяці кірунках — супрацьдзеянне тэрарызму, вядзенне радыяцыйнай і хімічнай разведкі, выкарыстанне беспілотных авіяцыйных комплексаў, размініраванне, аказанне медыцынскай дапамогі. Такі фармат шмат у чым абумоўлены айчынным вопытам ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, а таксама сур'ёзнымі напрацоўкамі ў галіне контртэрарыстычнай барацьбы.

Для беларускай арміі такога роду вучэнні даюць унікальную магчымасць праверыць эфектыўнасць выбраных кірункаў ваеннага будаўніцтва ў кантэксце адаптацыі і параўнання з перадавымі сусветнымі тэндэнцыямі ў ваеннай справе. Да таго ж самі ўмовы аравійскага паўвострава — своеасаблівы тэст на здольнасць аўтаномна дзейнічаць у экстрэмальнай сітуацыі, калі вакол — пустыня. Дарэчы, пустыня Катара — роўная, камяністая, як быццам трохі зморшчаная неглыбокімі баразёнкамі. Велічныя барханы сустракаюцца рэдка. Самы высокі пункт — крыху больш за 100 метраў над узроўнем мора. Але што гэта азначае з армейскага пункту гледжання? Калі схавацца

Фота Андрэя АРЦЮХОЎСКАГА.

практычна няма дзе, адмысловае значэнне набывае маскіроўка.

У гэтым сэнсе да камандзіроўкі беларусы падышлі грунтоўна. Тэхніка была падрыхтавана спецыяльна для рэгіёна. Кожнаму вайскоўцу выдалі форму, якая адпавядае пустынным умовам. Але, вядома, галоўнае — змест. Ужо першы этап манеўраў стаў выпрабаваннем для айчыннай мадэлі кіравання войскамі. Падчас штабной фазы беларускія афіцэры фарміруюць шматнацыянальную групоўку, плануюць прымяненне і забеспячэнне часцей і злучэнняў розных армій у крызіснай сітуацыі. Прычым з аднаго боку, усе ўдзельнікі ў штабе вырашаюць задачы сумесна, а з другога — міжволі прысутнічае і элемент канкурэнцыі. Фактычна тут, на аравійскім паўвостраве, вызначаецца, чые мадэлі больш адаптаваныя да міжнародных стандартаў і эфектыўныя. Адметна, што ў шэрагу выпадкаў нестандартныя рашэнні нашых спецыялістаў сталі асновай паспяховага выканання задач.

Ва ўсіх сэнсах высока паднялі нацыянальны сцяг суайчыннікі і ў лагеры. Такое ўражанне, што тэмп баявой падрыхтоўкі тут вызначаюць менавіта беларусы. Прынамсі, спякота, да якой мы прыстасаваныя, мусіць, менш за ўсё сярод удзельнікаў манеўраў, практычна не аказвае ўплыву на ход падрыхтоўкі нашых падраздзяленняў.

Асобна варта сказаць пра адкрытасць нашага кантынгенту. Беларусы першымі на вучэннях арганізавалі своеасаблівую выставу ўзбраення і тэхнікі айчыннай вытворчасці. Гэты зброевы салон стаў сапраўдным цэнтрам прыцягнення замежных ваенных. Прыклад беларусаў неўзабаве пераняліі вайскоўцы сіл спецыяльных аперацый Балгарыі. Што ж, неўзабаве ўсім разам у пустыні Катара трэба будзе выконваць вучэбна-баявыя задачы. І, мабыць, гарантыя поспеху пры гэтым — сяброўства і паразуменне.

Падпалкоўнік Канстанцін ГАГАРЫН.

Спецвыпуск да Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці

Мы разам — Беларусь!

Краіна моцная рэгіёнамі: СЛУЦКІ раён

СЛУЧЧЫНА БЯРЭ КУРС НА СТВАРЭННЕ АГРАПРАМЫСЛОВЫХ ХОЛДЫНГАЎ

18 лістапада — Дзень работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці агрmaпрамысловага комплексу. Напярэдадні журналісты «Звязды» пабывалі ў шэрагу працоўных калектываў Слуцкага раёна, сустрэліся з першым намеснікам старшыні райвыканкама, начальнікам упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Васілём Статкевічам і папрасілі Васіля Пятровіча пракаментаваць папярэднія вынікі сельскагаспадарчага года.

СТАРТАВАЯ ПЛЯЦОЎКА ДЛЯ НОВАГА ПРАРЫВУ

— Так, сельскагаспадарчы год фактычна завяршаецца. Папярэднія вынікі паказваюць, што ён быў нічым не горшы і не лепшы за іншыя, гэта быў год напружанай працы. Нашы паляводы нядрэнна папрацавалі на вытворчасці збожжа — намалацілі на 24,3 тысячы тон больш, чым летась; цукровых буракоў — больш на 18,5 тысячы тон (я агучваю статыстыку 9 месяцаў); рапсу — атрымалі амаль 20 тысяч тон. Праўда, каласавых разлічвалі намалаціць больш за 200 тысяч тон (факт — 181 тысяча тон), але свае карэктывы ўнесла надвор'е. Больш за ўсё яны адчувальныя ў вытворчасці кукурузы — ураджайнасць меншая, хоць зерня кукурузы чакаем каля 17 тысяч тон. Будзем рабіць высновы.

Бульбы выбралі 28 тысяч тон. Плошчы пад цукровыя буракі сёлета крыху зменшылі — 500 гектараў аддалі пад сою, каб павялічыць бабовы складнік як альтэрнатыву імпартнага. Па той простай прычыне, што ў раёне надзвычай развітая жывёлагадоўля — маем больш за 80 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы. З іх 24 100 — кароў, 48 тысяч — свіней; і 260 тысяч галоў птушкі. Дык вось, паўнавартасна збалансаваць рацыёны кармлення можна толькі прымяняючы камбікармы, а іх без бялковай сыравіны не прыгатуеш. Каб зрабіць бялковую сыравіну больш танай, мы і зменшылі плантацыю цукровых буракоў на 500 гектараў і пасадзілі на іх сою. Але «салодкага кораню» на астатніх плошчах атрымалі на 18,5 тысячы тон больш, чым летась. Такі падыход, відаць, правільны.

— Назавіце, калі ласка, перадавыя гаспадаркі. Напярэдадні прафесійнага свята гэта будзе зусім не лішнім.

— Калі браць збожжавую групу і рапс, то лідзіруюць па паказчыках аграфірма «Лучнікі» (кіраўнік — Барыс Барысавіч Клявшукевіч); ААТ «Падлессе-2003» (Іван Іванавіч Барысавец); па вытворчасці бульбы безумоўны лідар — гаспадарка Беларускай чыгункі «Рачкавічы» (ёю кіруе Мікалай Рыгоравіч Красуцкі), там сеюць 380-400 гектараў бульбы і валавы збор складае 12 тысяч тон. Па цукровых бураках неблагія паказчыкі зноў жа ў «Падлесся-2003» — ураджайнасць пад 700 цэнтнераў. Нядрэнна працуе калектыў даччынага прадпрыемства Слуцкага цукровага завода — ССК «Аграсэрвіс», у якога тысяча гектараў «салодкага кораню» і вытворчасць выходзіць на ўзровень 50 тысяч тон. «Аграсэрвісам» кіруе Андрэй Аляксандравіч Кунцэвіч.

Прыемна, што і ў жывёлагадоўлі растуць прывагі і надоі, мы займаем першае месца ў вобласці па валавой вытворчасці малака — за 10 месяцаў гэты паказчык склаў больш за 122 тысячы тон, рэалізацыя — 110 тысяч тон. А калі вярнуцца да паказчыкаў 9 месяцаў, то малака па ўсіх каналах збыту рэалізавана 99,2 тысячы тон — 110,5 працэнта да адпаведнага леташняга ўзроўню, вышэйшым сортам і сортам «Экстра» яно рэалізуецца больш чым на 88 працэнтаў.

Па вытворчасці ялавічыны атрыманы калі не самыя лепшыя, то таксама нядрэнныя вынікі — 18 тысяч тон мяса за 10 месяцаў, сярэднясутачныя прывагі па буйной рагатай жывёле складаюць 651 грам, па свініне — 540. Расце птушынае пагалоўе і ёсць адчувальны прырост па мясу птушкі. Хоць тут у нас напрамак зусім іншы — у Слуцку знаходзіцца племптушказавод, асноўная задача якога — вытворчасць і гадаванне новых пород птушанят і камплектаванне імі бройлерных фабрык Мінскай вобласці. Адным словам, наогул у жывёлагадоўлі вытворчасць валавога прадукту выйшла на лічбу 295,7 мільярда рублёў, выкананне склала 109,2 працэнта да адпаведнага ўзроўню 2011 года.

У гэтай галіне вельмі эфектыўна працуе «Вітка-Агра» — былы «Кастрычнік» (дырэктар — Дзмітрый Дзям'янавіч Чырэц), ён прадае каля 20 тон малака штодзень, гэта складае 22 літры на карову. Прывагі перавышаюць 500 грамаў на свініне і 700 грамаў на ялавічыне.

Таксама хачу адзначыць ААТ «Вясейскі Пакроў» — кіраўнік Людміла Аляксееўна Савановіч. Гаспадарка даволі эфектыўна працуе як па малаку, так і на вырошчванні ялавічыны. Вясной мы далучылі да яе суседзяў — былы калгас імя Калініна. Нягледзячы на звязаныя з любой рэарганізацыяй складанасці, кіраўнік і спецыялісты паспяхова спраўляюцца з новым узроўнем задач. «Вясейскі Пакроў» штодзённа прадае больш за 30 тон малака, удой на карову — каля 20 літраў, вытворчасць функцыянуе нармальна. Магчыма, хацелася б і лепшых паказчыкаў, але дынаміка іх росту там станоўчая.

— Як вы лічыце: усе гэтыя паказчыкі, наогул папярэднія вынікі сельскагаспадарчага года — яны набліжаюцца да тых, якія магчымы з улікам патэнцыялу раёна (маем на ўвазе і высокую бальнасць зямлі, і традыцыйна неблагі кадравы патэнцыял), ці яны толькі імкнуцца да таго ўзроўню, якога вы чакаеце? Узроўню, які павінен быць, скажам так.

— Правільна будзе назваць вынікі пакуль сціплымі. У нас тавай пляцоўкай для далейшага руху наперад. Тым больш, што па прагнозных паказчыках у нас за 9 месяцаў 105 працэнтаў росту аб'ёмаў вытворчасці, а з дадатковым заданнем павінна быць 109 — такую задачу паставіла вобласць. Так што працаваць трэба лепш. Возьмем такі канкрэтны прыклад. За 10 месяцаў сярэдняя заработная плата па аграпрамысловым комплексе складае каля 400 долараў, калі браць у эквіваленце. А задача стаіць — 500 на бліжэйшую перспектыву, і тысяча — да 2015 года. Таму важна змяншаць затраты і нарошчваць прадукцыйнасць працы.

Як паказала практыка апошніх гадоў, вырошчваць мы больш-менш навучыліся. А вось прадаваць — пакуль што слаба. Акрамя прадукцыі жывёлагадоўлі, трэба больш паспяхова працаваць з бульбай, каб шырэй прадаваць яе на знешніх рынках і зарабляць грошы, і з гароднінай, ды і з іншай прадукцыяй палёў і фермаў. На свяце работнікаў галіны, якое пройдзе ў нас 18 лістапада, падвядзём вынікі, зробім аналіз і вызначым далейшыя рубяжы.

РЭАЛЬНЫ СЕКТАР ПАТРАБУЕ РЭАЛЬНАЙ УВАГІ

— Раскажыце, калі ласка, Васіль Пятровіч, якім чынам выканкам уплывае на працоўныя калектывы і якія формы гэтага ўплыву?

— Што датычыць уплыву райвыканкама і яго ўпраўлення сельскай гаспадаркі на вытворчасць, то выкарыстоўваюцца розныя формы. У першую чаргу варта сказаць, што за гаспадаркамі замацаваны спецыялісты для аказання кансультацыйнай дапамогі як па раслінаводстве, так і па жывёлагадоўлі, для правядзення маніторынгу. Працуюць нават кансультацыйныя групы на найбольш важных кірунках — скажам, на жывёлагадоўчых комплексах, якія ўводзяцца ў строй дзейных і дзе будуць выкарыстоўвацца новыя тэхналогіі. Значыць, трэба навучыць ім мясцовыя кадры, што прыйшлі працаваць на комплекс. Бо тут адназначна павінна быць больш эфектыўная праца, і трэба з большай аддачай выкарыстоўваць апошнія дасягненні аграрнай навукі.

У жывёлагадоўлі гэтыя навацыі датычаць перш за ўсё ўтрымання і кармлення жывёлы. У раслінаводстве навука і практыка таксама не стаяць на месцы, і перад кожным сур'ёзным мерапрыемствам, такім, напрыклад, як масавая пасадка цукровых буракоў у гаспадарках, правядзім семінары для спецыялістаў з удзелам навукоўцаў. Не саромеемся яшчэ раз напомніць і рэгуліроўкі, і патрабаванні да якасці сяўбы. Хоць перад гэтым на працягу зімы па кожнай культуры праводзілася інтэнсіўная вучоба для спецыялістаў.

Такая вучоба традыцыйна праводзіцца і для механізатараў, жывёлаводаў і іншых катэгорый работнікаў, бо час не стаіць на месцы, прыходзіць новая тэхніка, выкарыстоўваюцца новае насенне, новыя тэхналогіі і падыходы ў кармленні, наогул у вытворчасці, і мы ахвотна ўкараняем навінкі ў сябе, на практыцы.

— У вас існуе калектыўны орган кіравання — Савет упраўлення сельскай гаспадаркі...

— На яго пасяджэннях стараемся калектыўна вырашаць нейкія праблемныя пытанні. Скажам, не вельмі прыемныя банка, але і іншыя. Таму што ўсе гаспадаркі — плацежаздольныя, пратэрмінаваных крэдытаў і працэнтаў не маюць. Калі ж гаспадарцы спатрэбіліся гарантыя выканкама ці нейкая дапамога ў падрыхтоўцы дакументаў для атрымання крэдыту, як і ў складанні бізнэс-плана, упраўленне сельскай гаспадаркі і райвыканкам такую дапамогу аказваюць. Аддзелы эканомікі, зямельны аддзел працуюць з усімі суб'ектамі гаспадарання, каб сродкі хутчэй пайшлі ў абарот і пачалася вытворчасць прадукцыі.

— Відаць, адна з формаў уплыву на рэальны сектар — гэта калі аслаблены працоўны калектыў не застаецца сам-насам са сваімі праблемамі. Якія тут могуць быць формы дапамогі? Вы расказалі, што нядаўна аб'ядналі «Вясейскі Пакроў» з былым калгасам імя Калініна. Што было на мэце?

часць і сацыяльную сферу. Таму да «Лучнікоў» далучылі СВК імя Куйбышава, да «Знаменскага» — «Селішчы». Вось і Мялешкі і іншыя вёскі даволі моцнай у мінулым гаспадаркі імя Калініна, якой тады ўдала кіраваў Герой Сацыялістычнай Працы Сяргей Сямёнавіч Паляшчук, далучылі да больш эфектыўнага зараз суседняга «Вясейскага Пакрову». На важнасць такіх абгрунтаваных узбуйненняў у народнай гаспадарцы звярнуў увагу удзельнікаў нядаўняй нарады кіраўнік дзяржавы.

Такія кардынальныя крокі спачатку дзесяць разоў намі абдумваліся, і яны прыносяць плён. Сёння эканоміка аграпрамысловага комплексу Слуцкага раёна працуе стабільна, нейкіх вялікіх зрываў няма. І гэта якраз адзін з вынікаў такіх вось аб'яднанняў калектываў у рамках холдынгаў, дзе ствараецца замкнуты цыкл: вытворчасць прадукцыі, яе перапрацоўка і рэалізацыя, размеркаванне чыстага прыбытку. Такога размеркавання, калі не проста «кожнай сястрыцы па завушніцы», але і ёсць фінансавыя магчымасці для развіцця, для перспектывы.

Помнік святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай — гістарычны сімвал слуцкай зямлі. Адзін з помнікаў, якія сведчаць пра ўнёсак людзей гэтага краю ў духоўную і матэрыяльную скарбніцу Беларусі.

ПАМІЖ «ДАЖЫНКАМІ» І 900-ГОДДЗЕМ

— Дарэчы, пра перспектывы. Такі горад і такі рэгіён, як Слуцк, мае права на годную перспектыву. З чым вы звязваеце надалей развіццё горада, раёна — і ў прамысловасці, і на вёсцы?

— І горад, і раён сёння дынамічна развіваюцца. Сур'ёзна дапамагло гораду правядзенне ў 2005 годзе рэспубліканскага фестывалю працаўнікоў вёскі «Дажынкі». І ўслед за гэтым былі зроблены новыя, даволі энергічныя крокі па далейшым эканамічным, сацыяльным і культурным развіцці. Як вядома, Слуцк — індустрыяльны цэнтр, дзе свая перапрацоўчая прамысловасць. Практычна ўся сыравіна, якая вырабляецца ў сельскай гаспадарцы раёна, перапрацоўваецца на прадпрыемствах Слуцка. У нас самы магутны ў краіне цукровы камбінат, працуюць буйныя мясакамбінат, масласырзавод, камбінат хлебапрадуктаў, ільнозавод... Яны таксама не стаяць на месцы, праводзяць рэканструкцыю, укараняюць інвестыцыйныя праекты, каб выпускаць прадукцыю, канкурэнтаздольную і на замежных рынках.

Напружана працуюць аграрыі. Вядома, што людзей на вёсцы не дабаўляецца, а хутчэй наадварот, і каб зацікавіць і затрымаць кадры, вядзецца будаўніцтва жылля, аб'ектаў сацыяльнай сферы, дарог. Мы пайшлі на шырокае будаўніцтва новых, аўтаматызаваных даільных залаў, бо трэба забяспечваць сыравінай прадпрыемствы перапрацоўкі. І потым, яны наўпрост уплываюць на рост даходаў сельгасвытворцаў, робяць працу жывёлаводаў больш прывабнай. Горад і вёску мы не раздзяляем, імкнёмся забяспечыць дынамічнае развіццё як індустрыі, так і аграрных прадпрыемстваў, цалкам аграпрамысловага комплексу з усёй яго інфраструктурай.

— Наколькі шырока выканкам выкарыстоўвае магчымасці свайго друкаванага органа — раённай газеты «Слуцкі край», якая мае багатую ўласную гісторыю і вопытныя кадры?

— Вы трапілі, што называецца, у «дзясятку». Раённую газету як трыбуну Слуцкага раённага Савета дэпутатаў і Слуцкага раённага выканаўчага камітэта мы выкарыстоўваем пастаянна і вельмі ахвотна. А летась у раёне створана і сваё тэлебачанне. Мясцовыя журналісты актыўна ўдзельнічаюць у жыцці Случчыны, яны пастаянна знаходзяцца ў працоўных калектывах — у будні і святы. Іх можна сустрэць у полі і на фермах як побач з перадавікамі, так і з тымі, хто адстае. Аб'ектыўныя публікацыі і перадачы нам вельмі дапамагаюць у рабоце. Дзякуючы сваёй газеце і ўласнаму тэлебачанню мы інфармуем працоўныя калектывы, наогул насельніцтва аб усіх навінах эканомікі, культуры, сацыяльнага развіцця, аб выніках работы ў народнай гаспадарцы, аб нашых агульных перспектывах, і такім чынам здымаецца шмат пытанняў. Я таксама кожны квартал ахвотна выступаю перад чытачамі і гледачамі, адказваю на пытанні і лічу, што такім чынам дасягаецца зваротная сувязь улады з людзьмі.

— Зусім хутка, праз чатыры гады, будзеце святкаваць 900-годдзе Слуцка...

— Над канкрэтнай праграмай пакуль не думалі, але ўсё, што зараз робіцца ў горадзе і раёне, дасць магчымасць годна сустрэць знамянальную дату. Скажу коратка: па рашэнні кіраўніка дзяржавы актыўна вядзецца мадэрнізацыя знакамітага прадпрыемства «Слуцкія пасясы»; ідзе добраўпарадкаванне і будаўніцтва вуліц; сёння планы, складзеныя па гарадской праграме, паступова выконваюцца, бо адставаць ад жыцця горад з 62 тысячамі насельніцтва не можа. А ўсяго ў нас 93 тысячы насельніцтва. Як бачыце, асноўная яго маса пражывае ў горадзе. Такі вось моцны індустрыяльны «кулак», які не дасць у крыўду сваю вёску.

Напярэдадні Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці хачу перадаць са старонак «Звязды» — старэйшай газеты краіны — сардэчныя віншаванні з прафесійным святам не толькі працаўнікам аграпрамысловага комплексу Слуцкага раёна, але і Міншчыны, усёй Беларусі, і пажадаць моцнага здароўя, высокіх ураджаяў, надояў і прываг, дабрабыту і аптымізму. Пастаўленую задачу па забеспячэнні харчовай бяспекі краіны мы ўсе разам выканалі. Зараз вызначана новая мэта — нарошчваць экспартны патэнцыял, і яна па сілах. Тым больш што з кожнага новага сельскагаспадарчага года мы здольны рабіць патрэбныя высновы і карэктаваць сваю стратэгію і тактыку надалей. Таму ўсё ў нас атрымаецца.

Матэрыялы сённяшняга выпуску «Мы разам — Беларусь» расказваюць пра тых, хто ў цэхах і на палетках, на жывёлагадоўчых комплексах і фермах Случчыны вырабляе, вырошчвае і перапрацоўвае сельскагаспадарчую прадукцыю. Сваё прафесійнае свята калектывы горада і раёна сустракаюць з неблагімі паказчыкамі, і ў гэтым ёсць асабістая заслуга кожнага. Здымкі побач — усяго толькі штрыхі да калектыўнага партрэта, прысвечанага Дню працаўнікоў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчага комплексу. На фота злева прадукцыю мясакамбіната прадстаўляе спецыяліст па маркетынгу Вольга Елава. На фота справа — момант, зазняты ў цэху мясцовага хлебазавода: прадукцыю, якая выходзіць з печы, аглядае зменны інжынер-тэхнолог Любоў Шыловіч. Фота ўнізе зроблена на палетках ААТ «Вясейскі Пакроў», дзе ў гэтыя дні праводзілі восеньскае ворыва. З механізатарам Аляксандрам Леванковым пра будучы ўраджай гутарыць галоўны аграном Галіна Пархімовіч.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ВЫНІК ДОБРЫМ БУДЗЕ... КАЛІ ПАВЕРАЦЬ ЛЮДЗІ

Сёлета ў ліпені на Случчыне аб'ядналіся дзве гаспадаркі — да ААТ «Вясейскі Пакроў» далучылася ААТ «Мялешкі». Агульная зямельная плошча аднаго з лідараў сельгасвытворчасці Слуцкага раёна складае цяпер каля 9,3 тыс. га. Нягледзячы на тое, што гаспадаркі размяшчаюцца блізка, зямля ў Вясеі ды Мялешках розная. Вынікі працы — таксама розныя. І рэакцыя людзей падчас далучэння аказалася неадназначнай. Вясейцы паставіліся з разуменнем, а мялешкаўцы спрабавалі байкатаваць... Значнага эканамічнага эфекту аб'яднанне, вядома ж, яшчэ даць не паспела, аднак месяц за месяцам справа ідзе на лад. Людзі прынялі новыя ўмовы, пераканаліся ўжо, што так лепей.

Дырэктар ААТ «Вясейскі Пакроў» Людміла САВАНОВІЧ.

Прэмія па... талоне

Ужо з красавіка Вясея і Мялешкі жылі пераменамі — ішлі насустрач зліццю дзвюх гаспадарак. Справа, вядома ж, суправаджалася і шматлікімі размовамі-абмеркаваннямі. Бо нехта «ішоў», а хтосьці і да апошняга не прызнаваў. Найцяжэй з красавіка па ліпень давялося той, што рашуча закасала рукавы і ўзялася за пасяўную.

— Я разумею мялешкаўцаў — там свой Дом культуры, садок, школа і г.д., а тут трэба аб'ядноўвацца, прызнаць новага чалавека, — кажа дырэктар абноўленага ААТ «Вясейскі Пакроў» Людміла САВАНОВІЧ. — Да моманту афіцыйнага аб'яднання — 1 ліпеня — народ адкрыта на мой позірк у іх бок казаў: у цябе няма пячаткі! Сходы ў паляводчых брыгадах, з трактарыстамі праводзілі, і ў кожнага ў вачах бачыла пытанні — як прымуць? Ці не пакінуць без увагі? Бар'ер, здавалася... непераадольны! Дзень і ноч думала толькі пра адно: як растапіць сэрцы гэтых людзей?..

Калі адзіная на Случчыне жанчына-кіраўнік сельгаспрадпрыемства прыгадвае свой эмацыйны стан таго часу, то не можа стрымаць хвалявання. Гэта тая, што з дзяцінства нічога не баялася. Тым больш — працы.

Калі заняла адказную пасаду, працы стала нашмат больш, з аб'яднаннем — больш настолькі, што не спалохацца проста не магчыма... А яна ведала — пасею! Тэхніка ёсць, насенне добрае, зямля неблагая... А самае галоўнае — прыйшлі людзі. Працавітыя, адказныя... Не падвядуць.

Уборачная ўрэшце прайшла на «выдатна». Засеялі 3 тыс. га. Нагрузка на камбайны выпала сур'ёзная, але ў выніку намалацілі 12,5 тыс. т збожжа. Другі паказчык у раёне. Добрым аказаўся і заробак — нехта атрымаў па 500—1000 долараў.

Але пытанне «Як жа згуртаваць, натхніць гэтых людзей?» не давала спакою штодня. Людміла Аляксееўна творча падышла да працоўнага заахвочвання. Спачатку спрабавала народ размовай узяць, маўляў, ну як можна спазняцца? Як перакур можа цягнуцца гадзіну-другую? Словы словамі, але ж трэба і з іншага боку заходзіць. Увяла «талон на выдачу прэміі». Згодна з яго «ўмовамі», прэмія ў памеры 1 млн рублёў у месяц выплачваецца механізатару на ўборцы зерневых і саломы пры штодзённым вытрымліванні пяці правілаў: «прытрымліванне тэхнікі бяспекі, выкананне тэхналагічнай дысцыпліны, захаванне пажарнай бяспекі, утрыманне трактара і агрэгата ў тэхнічна спраўным стане, наяўнасць святлоадбівальных элементаў, выкананне дзённай нормы». Па 20 працэнтаў за кожны пункт — вось табе і мільён.

На час уборкі былі арганізаваныя ў сваёй сталовай гарачыя абеды за 30-працэнтны кошт. Аляксееўна сама каштавала — толькі каб было смачна. Паклапацілася, каб у магазінчыку, што адкрыты на прадпрыемстве, работнікі маглі набыць прадукцыю мясцовых мяса- і сыркамбінатаў з 5-працэнтнай гандлёвай нацэнкай.

Усё рабіла, каб народ пачаў працаваць, пачаў верыць, каб даў вынік. Дзень нараджэння ў некага — падарунак і віншаванні. Папаўненне ў сям'і — сувенір плюс грашовая выплата...

І народ паверыў. Пачаў працаваць.

— Безумоўна, пакуль мы маем, так бы мовіць, абагульнены вынік, — кажа Людміла Аляксееўна. — Летась малака ў «Вясейскім Пакрове» было 22 л на карову, а ў Мялешках — 15, сярэдні паказчык цяпер — 18. Мы прадавалі дзяржаве каля 20 т у суткі, «Мялешкі» — каля 9-ці. Па зерневых у іх валавы збор 3,9 тыс. т, у нас 6,8 тыс. Аднак у Мялешках нам дасталася каштоўная зямля. Тут жа пясчаная, а там — чарназём... Так што агульная ўраджайнасць збожжавых атрымалася 43 ц/га. Вядома, добрае насенне набылі, хімабарону належную правялі...

Урэшце не толькі на палях збожжавыя ўбралі, але і ўсе запатрабаванні вяскоўцаў задаволілі. Дарэмна мялешкаўцы перажывалі, што іх без увагі пакінуць. Ім у першую чаргу «Вясейскі Пакроў» даў камбайн для ўборкі збожжавых і бульбы. Каму трэба — даставілі сена-салому.

Гэта яе шлях

Да першай дойкі, да 6 гадзін раніцы, Савановіч імкнецца аб'ехаць усе сем ферм, сустрэцца са спецыялістамі. Добра ведае, аб чым пытацца, чым цікавіцца, бо сама ж пачынала некалі свой працоўны шлях загадчыцай малочнатаварнай фермы...

— Пасля сямі гадоў працы загадчыцай малочнатаварнай фермы старшыня сельгасарганізацыі Лілія Міхайлаўна Савановіч прызначыла мяне на пасаду галоўнага заатэхніка, — тлумачыць Людміла Аляксееўна. — Дарэчы, мы не сваякі. На Случчыне гэта досыць распаўсюджанае прозвішча... Лілія Міхайлаўна была вельмі добрым настаўнікам, шмат чаму навучыла. Наогул у мяне было некалькі настаўнікаў па жыцці, і я вельмі рада, што жыццё сутыкнула мяне з такімі людзьмі. Дзякуючы гэтым лёсавызначальным сустрэчам, атрыманым ведам, жыццёваму вопыту, я атрымліваю і імкнуся атрымліваць добры вынік. Калі ў 1995-м ад кожнай каровы тут атрымлівалі ў сярэднім звыш 2 тыс. т малака, то летась жа — звыш 7 тыс. Мы першымі ў раёне пачалі прадаваць дзяржаве і малако экстра-класа. Я бачу ў гэтым вынік сваёй працы і працы людзей, якія мне ўрэшце паверылі...

...За высокія паказчыкі ў жывёлагадоўлі Людмілу Савановіч неаднаразова ўзнагароджвалі дыпломамі, граматамі Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання, мінаблвыканкама, райвыканкама.

«Тысячнік» у Ізбудзішчы?

ААТ «Вясейскі Пакроў» спецыялізуецца на вытворчасці малака і мяса, што забяспечвае прыбытак круглы год. У дойным статку гаспадаркі — звыш 1,7 тыс. галоў, а ўсё пагалоўе складае звыш 5,3 тыс. Штогод жывёлаводы прадпрыемства трапляюць у лік пераможцаў раённага спаборніцтва.

Летась было выраблена 7,7 тыс. т малака, надой на адну карову склаў 7,1 тыс. кг. Толькі на малочнатаварнай ферме аграгарадка Вясея за 10 месяцаў гэтага года выраблена 3 321 т малака, надой на адну карову склаў 7 121 кг. Работа па павышэнні прадукцыйнасці дойнага статка, безумоўна, працягваецца.

Умацоўваецца кармавая база, укараняюцца новыя тэхналогіі, перадавыя формы арганізацыі працы.

Блізкая да завяршэння рэканструкцыя дзвюх малочнатаварных фермаў, з будаўніцтвам малочнадаільных блокаў у вёсцы Стары Гудкоў і аграгарадку Мялешкі. Звычайна ў сельгаспадарках будуецца ці рэканструюецца адзін аб'ект. Аднак для «Вясейскага Пакрова» зроблена выключэнне. За дзяржаўныя сродкі зараз у Старым Гудкове вядзецца мантаж абсталявання даільнай залы. Досыць хуткімі тэмпамі ажыццяўляецца і будаўніцтва ў Мялешках. Абсталяванне, зразумела, дарагое, але без гэтага сёння ніяк. Бо, як той казаў, перспектыўны кірунак. Адназначны рост эфектыўнасці працы. Скарачэнне рабочых рук і, адпаведна, рост заробку. Новае тэхналагічнае абсталяванне дазволіць атрымліваць малако толькі экстра-класа. Наогул 72 працэнты малака, якое гаспадарка летась прадала дзяржаве, — гатунку «экстра».

Савановіч раскрывае і сваю мару: пабудаваць «з нуля» комплекс-«тысячнік», на 1 тысячу рагуль, у вёсцы Ізбудзішча. Там вельмі прыгожыя мясціны ды яшчэ, што называецца, з усімі прывязкамі. Работнікі будуць і жыллём забяспечаныя. Да таго ж вёска газіфікаваная. Ну а сучасная ферма — гэта ж карцінка. Працаваць на такой — адно задавальненне. Туды, дзе ўсё камп'ютарызавана, пацягнулася б і моладзь.

ААТ «Вясейскі Пакроў» вырошчвае не толькі збожжа, але і рапс, а таксама гародніну. Сёлета было сабрана 15,8 тыс. т цукровых буракоў, 735 т бульбы, 113 т цыбулі, 1,9 тыс. т рапсу, 1,3 тыс. т кукурузы на зерне. Ёсць на прадпрыемстве і падсобная гаспадарка — звераферма па гадоўлі чарнабурай лісіцы.

Трактарыст Леанід ДОЛБІК ахвотна сфатаграфаваўся побач з навінкай — магутным трактарам, абсталяваным для ўнясення ўсіх відаў мінеральных вадкіх угнаенняў. Гэты волат сёлета папоўніў машынна-трактарны парк гаспадаркі і быў даручаны Леаніду як аднаму з самых вопытных механізатараў.

Вадзіцель аўтамашыны Юрый КІРАКАСЯН адзначаны на сёлетніх рэспубліканскіх «Дажынках».

Працы не баяцца

Лічбы па надоях і ўраджайнасці — толькі частка клопату кіраўніка аб'яднанай структуры. Наогул далёка не кожны кіраўнік можа некалькі гадзін запар расказваць пра людзей, простых работнікаў, тым больш па-сапраўднаму перажываць за кожнага.

На палях гаспадаркі «Вясейскі Пакроў» працавала ў гэту ўборачную 11 экіпажаў збожжаўборачных камбайнаў. Уборку хлеба з аб'яднанай плошчы давялося правесці з істотнай нагрузкай на адзін камбайн. Зразумела, гэта было выпрабаваннем не толькі для тэхнікі. Сур'ёзную загартоўку прайшлі 12 маладых камбайнераў і памочнікаў.

Адным з першых на адвозцы збожжа стаў вадзіцель Юрый Кіракасян. На аўтамабілі «ЗІЛ-554» ён даставіў ад камбайнаў на зерняток 2,3 тыс. т збожжа. І ўвайшоў у склад прызёраў свята хлебаробаў «Дажынкі-2012». А больш за ўсіх збожжа перавёз Барыс Сініца. Яго вынік — звыш 3,3 тыс. т, адзін з лепшых у раёне.

Касцяк механізатараў ААТ «Вясейскі Пакроў» складаюць работнікі з высокай адказнасцю, якія добра ведаюць і любяць сваю справу: Вікенцій Несцярчук, Аляксандр Леванкоў, Мікалай Карцель, Мікалай, Сарагавец, Мікалай Пуцята, Сяргей Дубінка, Аляксандр Гладкі, Васіль Бойка, Руслан Далецкі, Андрэй Гудлеўскі, Леанід Долбік, Анатоль Аніслаўскі, Алег Бондар, Сяргей Ванкевіч, Сяргей Ждановіч, Анатоль Салдаценка, Анатоль Бандура, Уладзімір Курыльчык, Сяргей Мароз.

Лепшыя вадзіцелі — Аляксандр Верамейчык, Сяргей Карцель, Віталь Падобры, Сяргей Пенязь, Іван Пажыган, Мікалай Саладуха, Анатоль Ліхтар.

Сямейныя дынастыі працягваюць у шэрагу механізатараў Юрый, Вячаслаў і Віталь Каштальяны, Уладзімір і Васіль Курыльчыкі. Галоўным інжынерам на прадпрыемстве працуе малады спецыяліст Аляксандр Масюкевіч, які назапасіў вопыт у свайго бацькі трактарыста-машыніста Сяргея Масюкевіча.

Маладымі спецыялістамі прыйшлі ў гаспадарку Валерый Ганчарэвіч, інжынер па эксплуатацыі, і Дзмітрый Масюк, інжынер па рамонце сельскагаспадарчай тэхнікі. Перадаюць вопыт работы маладым Ігар Лістапад і Аляксандр Бальсін.

На вясейскай малочнатаварнай ферме працуюць лепшыя аператары машыннага даення, якія займаюць годнае месца ў шэрагу 7-мі і 8-тысячніц Случчыны: Вольга Карчыцкая, Марыя Кязімава, Наталля Беразоўская, Валянціна Ахрамовіч, Таццяна Васілевіч, Лілія Трафімовіч, Зінаіда Гурыновіч, Зінаіда Губчык, Зоя Філюта.

Дарэчы, калектыў малочнатаварнай фермы ў Вясеі звыш 10 гадоў узначальвала Святлана Ганчарэвіч. Дзякуючы менавіта яе прафесіяналізму штогод калектыў быў у ліку лепшых у раёне, прызнаны пераможцам у вобласці. Сёння Святлана Ганчарэвіч узначальвае галіну жывёлагадоўлі ў якасці галоўнага заатэхніка.

Сярэднясутачная прывага буйной рагатай жывёлы ў жывёлавода Валерыя Краўчука складае 958 г, Наталлі Паповай — 974, Мікалая Папова — 921, Дзмітрыя Трафімовіча — 999, Надзеі Курыльчык — 923.

На рахунку галоўнага агранома Галіны Пархімовіч — 32 уборкі. Яе надзейныя памочнікі — начальнікі ўчасткаў Канстанцін Пенязь, Сяргей Сініца, Юрый Арцюшкевіч, Яўген Кургановіч і муж Алег Пархімовіч. Галіна перадае свой прафесійны вопыт тром маладым аграномам — Артуру Шклярэўскаму, Сяргею Скрыцкаму і Алене Бойка.

Шмат гадоў у гаспадарцы працуюць загадчікі фермаў і тэхнікі-асемянатары Надзея Шыян, Наталля Трафімовіч, Святлана Палтаржыцкая, ветурач Іван Сяргейчык.

Цяляты пад уважлівым кантролем галоўнага заатэхніка Святланы ГАНЧАРЭВІЧ і аператара Вольгі КАРЧЫЦКАЙ.

Мясцовыя падлеткі ахвотна займаюцца ў Вясейскай дзіцячай школе мастацтваў. На здымку — удзельнікі фальклорнага дзіцячага ансамбля «Вясейка» Насця БАРЫСЕВІЧ, Ірына ПІСАРЫК, Уладзік ТРАФІМОВІЧ.

Для моладзі, дзеля дзяцей

Савановіч цэніць у людзях гарачую любоў да працы і праўдзівасць. Калі бачыць гэта, абавязкова падтрымае. Ці то з жыллём дапаможа, ці то хоць бы звычайным падарункам на дзень нараджэння не абыдзе. Ніводзін юбіляр не застанецца без яе цёплага слова, абавязкова атрымае сувенір і торт да салодкага стала. Традыцыйна віншуюцца маладыя і бацькі нованароджанага. Ад прафкама ім — падарунак, ад адміністрацыі — аднаразовая выплата.

Пуцёўкі ў санаторый набываюцца ўсім ахвотным, з даплатай 10 працэнтаў кошту пуцёўкі. Дастаўка да санаторыя работнікаў і іх дзяцей — транспартам гаспадаркі.

Ветэранам працы рэгулярна аказваецца дапамога ў вядзенні асабістых падсобных гаспадарак — апрацоўваюцца прысядзібныя ўчасткі па льготных тарыфах, дастаўляюцца неабходныя кармы і зерне.

Дасягненне вытворчых паказчыкаў магчымае толькі пры стварэнні добрых умоў працы і адпачынку для работнікаў, адзначае намеснік дырэктара па ідэалагічнай рабоце ААТ «Вясейскі Пакроў» Таццяна ПЕНЯЗЬ:

— Сёння для любой гаспадаркі важна, каб да іх ішла працаваць моладзь. Мы прадастаўляем інтэрнат з выгодамі — аднапакаёвыя кватэры; сямейным парам — дамы сядзібнага тыпу. Наша цэнтральная сядзіба наогул газіфікаваная...

Дабрабыт людзей вельмі важны для нас. На тэрыторыі сельгасарганізацыі пражываюць 2690 чалавек. 463 з іх працуюць на ААТ «Вясейскі Пакроў». У аб'яднаным ААТ зараз — 2 дамы культуры, 2 дзіцячыя садкі, 2 агульнаадукацыйныя школы, школа мастацтваў, гандлёвы цэнтр, 2 урачэбныя амбулаторыі. Адміністрацыя прадпрыемства адгукаецца на самыя розныя просьбы, мы падтрымліваем, чым можам... Асабліва дзяцей, маладыя сем'і...

Вельмі цесныя кантакты падтрымліваюцца з педкалектывамі дзіцячых садкоў і школ. Па магчымасці забяспечваецца матэрыяльна-тэхнічная база ўстаноў. А выпускнікі ўсіх гэтых устаноў яшчэ і заахвочваюцца падарункамі.

— Прадпрыемства шмат у чым нас падтрымлівае, — расказвае загадчыца яслі-садка ў Вясеі Алена ГІЛЕЎСКАЯ. — У садку выхоўваюцца тры рознаўзроставыя групы — 38 дзетак. Калі яны становяцца выпускнікамі нашай установы або надыходзіць 1 верасня ці Новы год, то для іх «Вясейскі Пакроў» абавязкова набывае саладкія падарункі, будучым вучням — партфелі. Для самой жа ўстановы гэта можа быць самая розная дапамога. Нядаўна вось свяцільнікі набылі для садка. Гаспадарка арганізавала і бясплатны падвоз дзетак, бясплатна прадастаўляе гародніну для дзіцячага харчавання...

Сваімі дасягненнямі радуюць выхаванцы школы мастацтваў. Камісія Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА ўручыла фальклорнаму калектыву школы мастацтваў «Вясейка» спецыяльны дыплом «За захаванне нематэрыяльнай культурнай спадчыны Беларусі». Дзеці былі лаўрэатамі VII рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», удзельнічалі ў IV Міжнародным дзіцячым фестывалі «Лідарскае сэрца» (Рэспубліка Сербія).

Адміністрацыя ААТ «Вясейскі Пакроў» шчыра віншуе з прафесійным святам сваіх працаўнікоў, спецыялістаў, дзякуе ўсім за добрасумленную працу!

Аграгарадок «Вясея», вуліца Пакроўская — такі адрас магазіна, які належыць ААТ «Вясейскі Пакроў». Тут заўсёды вялікі выбар мясных і малочных вырабаў. Наведнікаў сустракае загадчыца магазіна Ангеліна КАРЦЕЛЬ.

Мантаж установкі «Паралель» 2х16 у новай малочнадаільнай зале.

Мясцовы дзіцячы яслі-садок — сярод лепшых у раёне. У яго музейнай зале ідзе размова паміж загадчыцай Аленай ГІЛЕЎСКАЙ, старшынёй Вясейскага сельвыканкама Аленай ГАНЧАР, намеснікам дырэктара ААТ «Вясейскі Пакроў» па ідэалагічнай рабоце Таццянай ПЕНЯЗЬ.

Свята-Пакроўская царква ў цэнтры сядзібы пабудавана з дапамогай гаспадаркі.

УНП 600043258

СМАК, ДУХМЯНАСЦЬ – ПРОСТА РАЙ...

Гэта «Слуцкі каравай»!

Нядаўна пачулі ў адной з мінскіх крам, як пакупніца пыталася: «А слуцкі хлеб прывезлі?» Дзіўная справа: на паліцах хлебнага аддзела ляжаць дзясяткі гатункаў хлеба ад мінскіх хлебазаводаў, а пытаюцца пра слуцкі! Цікава, дзякуючы чаму і як гэты хлеб знайшоў сваіх прыхільнікаў нават у сталіцы?

СЛУЦКІ КАРАВАЙ

Выпякаем хлеб на любы густ

У Алены РОЎБЫ вельмі адказныя абавязкі: яна — дражджавод.

Звычайна хлебазаводы рэалізуюць сваю прадукцыю рэгіянальна. Але хлеб, які выпускаецца на Слуцкім хлебазаводзе пад агульным брэндам «Слуцкі каравай», шырока вядомы не толькі ў сваім рэгіёне, але і ў многіх раёнах Міншчыны. Ён прадаецца ў Любані, Капылі, Старых Дарогах, Пухавічах, Клецку, Мінскім раёне. Каля 10% аб'ёму ўсяго выпушчанага хлеба рэалізуецца ў Мінску.

Амаль 60 гадоў днём і ноччу працуюць слуцкія хлебапёкі, каб кожны дзень на нашых сталах быў свежы духмяны хлеб. Бо ён патрэбен і студэнтам, і дацэнтам, і будаўнікам, і банкірам, прычым кожны дзень, у будні і святы! Без хлеба не здаюцца экзамены, не пішуцца навуковыя артыкулы, не шыецца адзенне і не дояцца каровы...

— Мы выпякаем хлеб на любы густ, — распавядае **зменны інжынер-тэхнолаг хлебабулачнага ўчастка Слуцкага хлебазавода Любоў ШЫЛОВІЧ.** — Ёсць гатункі з большай колькасцю закваскі і, адпаведна, больш кіслыя, як, напрыклад, хлеб *«Добры бездражджавы»*. Ёсць фармавы хлеб, дзе больш шатраванай мукі. А хлеб *«Ласунак»* выпякаецца з разынкамі, курагой, чарнаслівам і па праве належыць да элітных гатункаў. З масавых гатункаў вельмі добры *«Трайчанский»*, які пячэцца з сумесі сартавой і сеянай мукі з даданнем невялікай колькасці шатраванай. Гэта больш грубыя гатункі мукі, у якіх, адпаведна, захоўваецца больш карысных рэчываў.

Пакупнікі хваляць нашы батоны. Яны выпрацоўваюцца па класічнай тэхналогіі з ужываннем вялікіх густых рошчын, якая дазваляе дасягнуць добрага аб'ёму, структуры мякішу і надаць вырабам прыемны смак і водар. І хоць нашы батоны каштуюць даражэй за аналагічную прадукцыю, выпечаную на іншых хлебазаводах, іх з задавальненнем купляюць, кажуць, што вельмі смачныя. Усяго мы выпускаем 15 найменняў хлеба розных развесаў і фасоўкі і 30-35 найменняў булачных вырабаў, пірагоў, тоставых вырабаў, у тым ліку з начынкамі і рознымі напаўнялънікамі, каля 5 відаў сухароў, 5 відаў сушак, да сарака найменняў кандытарскіх вырабаў.

***

З гадамі людзі, як правіла, больш задумваюцца пра сваё здароўе. Ёсць рызыкі, якіх нам амаль не пазбегнуць, — гэта стрэсы, нагрузкі на рабоце, негатыўныя фактары навакольнага асяроддзя. Кампенсаваць іх уплыў можна збалансаваным харчаваннем, у тым ліку і з дапамогай правільнага хлеба.

На Слуцкім хлебазаводзе выпякаюць хлеб для дыябетыкаў *«Бялкова-вотрубны»*, у якім змяшчаецца 15% вотруб'я, якое знікае ўзровень цукру ў крыві і вельмі карыснае для страваванння. *«Вясейскі злакавы»* складаецца з сумесі, у якую ўваходзяць сланечнікавыя семечкі, семя лёну і іншыя карысныя інгрэдыенты. *«Палявы з ільном»* зроблены з выкарыстаннем кампазітнай сумесі (насення сланечніку і лёну, кукурузных, аўсяных драблёных, ячных, пшанічных драблёных круп).

У прынцыпе, сёння над кожнай гандлёвай секцыяй, дзе прадстаўлена прадукцыя пад гандлёвай маркай **«Слуцкі каравай»**, можна вешаць таблічку «Прадукты для здаровага харчавання». Таму што гэта сапраўды натуральная прадукцыя без хімічных дабавак, якая гарантуе здаровы лад жыцця сваім спажыўцам.

На канвееры салодкі «хіт» — пернікі «Фартуна». «Гэту прадукцыю любяць пакупнікі ўсіх узростаў», — пракаментавала інжынер-тэхнолаг кандытарскай вытворчасці Іна МАХЛАЙ.

Слуцкі хлеб пакаштавалі ў розных краінах свету

Ацаніў слуцкі хлеб не толькі радавы спажывец. На Слуцкім хлебазаводзе пякуць хлеб і для сустрэчы гасцей рэспублікі на самым высокім узроўні, і ў якасці сувеніра для нашых дэлегацый, якія адпраўляюцца ў іншыя краіны. Боханы слуцкага *«Бульбаша»* каштавалі ў Казахстане, В'етнаме, Венесуэле і іншых краінах.

— *«Бульбаш»* — наш фірменны хлеб, распрацоўка нашай лабараторыі, — з гонарам гаворыць **дырэктар Слуцкага хлебазавода Аляксандр КАЗЕЙКА.** — У яго складзе толькі натуральныя інгрэдыенты: мука, солад, бульбяная крупка, тэрмафільная закваска... Асобна робіцца заварка соладу і кмену, каб надаць водар і палепшыць смак. І сапраўды, пры гэтым хлеб атрымліваецца больш духмяным, смачным, а тэрмін яго захоўвання становіцца даўжэйшым. Наогул, калі ўзяць нашы заварныя гатункі хлеба — гэта наш беларускі эксклюзіў, які выпускаецца на многіх хлебазаводах краіны. Да нас ужо прыязджалі па вопыт з Малдовы і з Расіі...

Сакрэтаў у саставе нашых хлябоў няма ніякіх. Усё як звычайна: мука, дрожджы, вада, соль, закваскі. Але ёсць адна асаблівасць. Часам дома нешта пячэш: адзін раз атрымалася, іншы — не. А вось на вытворчасці вельмі важнай з'яўляецца стабільнасць параметраў якасці. У працэсе работы заўсёды ёсць нюансы. Іх абавязкова трэба ўлічваць, умець арыентавацца ў іх, аператыўна прымаць правільныя рашэнні. Таму вельмі важны прафесіяналізм. У нас працуюць прафесіяналы! Правільна падбіраецца закваска, разумна вядзецца тэхналагічны працэс, вытрымліваюцца ўсе параметры. Таму што мы разумеем: калі чалавек набыў хлеб і ён яму не спадабаўся, мы гэтага пакупніка страцілі.

Упакоўванне хлеба — адказны працэс, ад якога залежыць папулярнасць прадукцыі.

Не трэба баяцца рынку, і вы знойдзеце сваю нішу

Канкурэнцыя на хлебным рынку цяпер высокая. Аднак менавіта яна выпрацоўвае адрэналін, які не дазваляе супакойвацца, а прымушае думаць аб заўтрашнім дні, адчуваць патрэбы рынку. І спецыялісты прадпрыемства чуйна рэагуюць на попыт, з зайздроснай рэгулярнасцю абнаўляюць асартымент сваёй прадукцыі. Хоць так было не заўсёды...

— Практычна да 2000 года на нашым хлебазаводзе стаялі электрычныя печы. Але электраэнергія як паліва значна даражэй за газ, — тлумачыць **галоўны інжынер прадпрыемства Сяргей ШАЎНЕЎ.** — Каб выпечы тону хлеба, трэба было выдаткаваць у рублях у 3 разы больш грошай, чым калі б выпякалі хлеб на газе! Абсталяванне было маральна састарэлым, зношаным. Мы разумелі, што калі нічога не мяняць, то прадпрыемства не вытрымае канкурэнцыі.

І мы зрабілі рывок. У 2004 годзе пабудавалі ўласную кацельню. У 2005 годзе паставілі першую газавую печ. І потым практычна кожны год ставілі па адной печы. Часткова мы атрымалі фінансавую дапамогу ад Дэпартамента па хлебапрадуктах Мінсельгасхарча. Паралельна мы самастойна закуплялі новае абсталяванне, карыстаючыся крэдытамі, лізінгам. Змянілі тэхналогіі, пачалі актыўна працаваць на рынку...

Вынік не прымусіў сябе чакаць: з 2007 года на прадпрыемстве пачаўся рост. За гэтыя гады хлебазавод павялічыў вытворчасць хлебабулачных вырабаў на 25% (што складае каля 2 тысяч тон хлеба ў год). І гэта нягледзячы на тое, што ў рэспубліцы ў апошні час намецілася тэндэнцыя да зніжэння спажывання хлеба! У 2,4 раза павялічана вытворчасць кандытарскіх вырабаў. Пры гэтым пастаянна змяншаецца спажыванне прадпрыемствам газу і электраэнергіі. Энергаспажыванне ў 2007 годзе склала 1357 туп. У гэтым годзе плануецца 1200 туп.

«Не трэба баяцца рынку, — лічыць Аляксандр Казейка, — і вы знойдзеце сваю нішу». У поспеху свайго прадпрыемства ён бачыць два складнікі: тэхнічнае пераўзбраенне і актыўная праца на рынку. Гэта дазволіла павялічыць аб'ёмы вытворчасці, выконваць усе даведзеныя паказчыкі і павялічыць збыт прадукцыі. Таму што сёння мала вырабіць добры прадукт — яго яшчэ трэба ўмець прадаць. Адпаведна, важна своечасова змясціць акцэнты ў бок маркетынгу і збыту.

Святочны торт у выглядзе навагодняй ёлкі выраблены майстрам высокага класа. Аўтар торта Ірына КУПРЫЯНЧЫК з'яўляецца адной з лепшых сярод кандытараў краіны.

Святу насустрач

— Хочацца павіншаваць сваіх супрацоўнікаў і калег з прафесійным святам! — кажа дырэктар Слуцкага хлебазавода Аляксандр КАЗЕЙКА. — І пажадаць у першую чаргу здароўя, якое неабходна і для асабістага жыцця, і для вытворчых спраў. Каб ішоў рост вытворчасці, пашыраўся асартымент прадукцыі, каб поспехі замацоўваліся ў гэтым годзе і далей, каб мы выдатна выконвалі сваю галоўную справу — задавальненне патрэбы людзей у такім важным прадукце як хлеб.

Напярэдадні Дня работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці варта адзначыць лепшых з лепшых, якія сваёй штодзённай працай і не па чутках ведаюць цану хлебу. Сярод іх машыністы хлебабулачнага ўчастка Марына ШЫЛОВІЧ і Людміла ЗАЯЦ, аператар склада бястарнага захоўвання мукі Уладзімір ЧАЙКА, дражджавод Святлана МЯЛЕШКА, зменны інжынер-тэхнолаг хлебабулачнага ўчастка Ала ДУБАЛЕКА, кандытар Ірына КУПРЫЯНЧЫК, кандытар Валянціна ЖДАНОВІЧ, токар-фрэзероўшчык кандытарскага цэха Аляксандр АРЦІМЕНЯ, электраманцёр аддзела энергетыкі Сямён МАРЧАНКА.

Дзякуй усяму калектыву за добрасумленную працу. З прафесійным святам!

Інжынер-тэхнолаг Іна РАКІЦКАЯ працуе ў лабараторыі прадпрыемства і сочыць за якасцю сыравіны, якая паступае на вытворчасць.

Зменны майстар Тамара КАРАТЧЭНЯ аглядае цеста, падрыхтаванае для печы.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Прадукцыю пад брэндам **«Слуцкі каравай»** любяць жыхары Слуцка, сталіцы і Мінскай вобласці. Сакрэт просты: гэта выдатная якасць вырабаў, аб чым сведчыць вялікая колькасць узнагарод на выставах самага рознага ўзроўню.

У 2010 годзе на 3-м міжнародным аглядзе якасці хлеба і хлебабулачных вырабаў у г. Маскве хлеб *«Бульбаш»* атрымаў дыплом 1 ступені і залаты медаль «За высокую якасць прадукцыі».

У 2011 годзе на 16-й міжнароднай спецыялізаванай выставе «Хлеб 2011» у Кіеве хлеб *«Бульбаш»* атрымаў ГРАН-ПРЫ.

1—14 верасня 2012 года ў Мінску ў рамках 8-й міжнароднай спецыялізаванай выставы «Хлебная і кандытарская справа» праходзіў Рэспубліканскі агляд якасці хлебабулачных і кандытарскіх вырабаў «Ласунак 2012 года». ААТ «Слуцкі хлебазавод» заваяваў ГРАН-ПРЫ за прадукцыю — хлеб *«Бульбаш»* і пячэнне *«Аўсянае»*. Таксама залаты медаль слуцкія хлебапёкі атрымалі за хлеб *«Добры» бездражджавы люкс,* печыва *«Кармэль»*, пірагі *«Слуцкія з карыцай»* і *«Слуцкія з макам»*.

У 2006 г. ААТ «Слуцкі хлебазавод» атрымаў сертыфікат адпаведнасці патрабаванням СТБ ISO 9001 на сістэму менеджменту якасці вытворчасці вырабаў хлебабулачных і кандытарскіх. Укараненне сістэмы дазволіла значна палепшыць умовы вытворчасці, удасканаліць інфраструктуру прадпрыемства, стабілізаваць якасць і павысіць канкурэнтаздольнасць прадукцыі.

«Гэта цёплая старонка нашага жыцця»

Начальнік хлебабулачнага ўчастка Вольга ШЫЛОВІЧ і галоўны інжынер прадпрыемства Сяргей ШАЎНЁЎ каля новай высокапрадукцыйнай печы, якая мае ўтылізатар цеплыні і парагенератар.

Самая вялікая каштоўнасць нашага хлебазавода — гэта людзі, лічыць яго дырэктар. «Касцяк калектыву — нашы ветэраны, якім ўласцівыя адказнасць, дысцыпліна, — кажа Аляксандр Аляксандравіч. — У нас брыгадная форма арганізацыі працы, якая прадугледжвае ўзаемную выручку і адказнасць. Мы працягваем лепшыя традыцыі мінулага, перадаём іх новым работнікам».

У 1997 годзе Слуцкі хлебазавод стаў адкрытым акцыянерным таварыствам. Гэта адзінае ў рэспубліцы акцыянернае таварыства сярод хлебазаводаў. Дзяржаве належыць 50,1% акцый, калектыву — 49,9%. «Мы не раскайваемся ў гэтым кроку, — упэўнена кажа Аляксандр Казейка. — Не думаю, што валоданне акцыямі вельмі моцна змяніла псіхалогію людзей, але нейкія змены ў стаўленні да працы ўсё ж прасочваюцца. Уласнік ёсць уласнік. Людзі замацаваліся на сваіх працоўных месцах. Калектыў стабільны, адтоку кадраў няма».

На Слуцкім хлебазаводзе працуюць 323 чалавекі.

Аб'ядноўваюць калектыў і агульныя святы, удзел у спартыўных спаборніцтвах. Прадпрыемства часткова прафінансавала будаўніцтва кааператыўнага жылля для сваіх работнікаў. І зараз ужо выходзіць на пастаўлены ўзровень заработнай платы.

А яшчэ на хлебазаводзе з вялікай увагай і падзякай ставяцца да ветэранаў вытворчасці. Актыўна працуе Савет ветэранаў. Тут прынята віншаваць былых работнікаў з галоўнымі святамі, арганізоўваць для іх турыстычныя паездкі. Добрай традыцыяй стала віншаваць ветэранаў-юбіляраў, выдзяляць ім грашовую прэмію ад прадпрыемства. Першага кастрычніка Слуцкі хлебазавод традыцыйна збірае сваіх пенсіянераў: для іх арганізоўваюць канцэрт, дораць сваю прадукцыю. На сумесным чаяванні работнікі распавядаюць, як змянілася вытворчасць. «Гэта цёплая старонка нашага жыцця», — прызнаецца Аляксандр Казейка. Наогул, ён упэўнены, што на яго прадпрыемстве працуюць толькі добрыя людзі. «У дрэннага чалавека хлеб не атрымаецца. Таму што не толькі ў заквасцы справа. Хлебу абавязкова перадаецца энергетыка чалавека, што пячэ яго. Таму і атрымліваецца, што рэцэпт у хлебапёкаў можа быць адзін, а хлеб выходзіць розны», — кажа ён.

УНП 600154157

На правым флангу айчыннага АПК

Адзін з лідараў перапрацоўкі — ААТ «Слуцкі мясакамбінат». На перадавым прадпрыемстве творчая брыгада «Звязды» пабывала амаль два гады таму. Што за гэты час змянілася? Паслухаем калектыўны расказ.

ФІЛІЯЛЫ — НАШ АГРАРНЫ ЦЭХ

Генеральны дырэктар Слуцкага мясакамбіната Віктар Тамашэўскі:

— Учора прымалі ўдзел у рабоце калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі і перапрацоўчай прамысловасці. Размова была плённая, сур'ёзная, адкрытая. І гэта правільна, бо ў жыцці трэба перыядычна нешта перагледаць, не зацыкліваючыся на тых схемах, якія даўно існуюць, каб выйсці на новы віток развіцця. Тым больш што перад галіной ставяцца новыя задачы.

На сённяшні дзень прадпрыемства працуе стабільна, хоць шмат якія пытанні вырашаюцца недастаткова эфектыўна, і гэта накладвае свой адбітак на эканоміку камбіната. Скажам, вельмі цяжка пачынаўся год, бо ў першым квартале нам не хапала сыравіны для вытворчасці. Таму не ўдалося цалкам выканаць экспартную праграму і крыху адсталі па некаторых іншых паказчыках. Спадзяёмся да канца года выйсці на лічбы, якія планавалі.

Па-ранейшаму прадпрыемства шмат увагі надае развіццю гаспадарак сваёй сыравіннай зоны, уласных філіялаў, стварэнню моцнай сыравіннай базы. Для нас гэта — пытанне першачарговай важнасці. У садружнасці з італьянскай фірмай пачалі будаўніцтва яшчэ аднаго свайго свінагадоўчага комплексу на 24 тысячы галоў з уласнай энергетычнай (біягазавай) устаноўкай, якая перапрацуе адходы і дасць цяпло і электраэнергію. Разлічваем, што ў наступным годзе работы будуць завершаны і мы атрымаем на новым комплексе першыя тоны мяса дадаткова да таго, што нарыхтоўвалі ў мінулыя гады.

Рэалізуем іншыя праекты ў сельскай гаспадарцы. Працягваем будаваць буйную малочнатаварную ферму «Забалаць». Існавалі пытанні з фінансаваннем праекта, але зараз мы змаглі дасягнуць дамоўленасці з вядучым банкам краіны, і яны павінны быць зняты.

Па праграме рэканструкцыі фермаў на 2012 год вядзём таксама рэканструкцыю малочнатаварнай фермы ў нашым філіяле «Леткаўшчына», у ходзе якой будзе ўзведзены новы дальны блок. Сам кароўнік ужо функцыянуе.

Наогул, калі гаварыць пра філіялы, то мы імкнёмся не проста аказваць ім грашовую падтрымку — на выплату зарплаты, напрыклад, ці набыццё гаручазмазачных матэрыялаў, але стараемся фінансаваць перш за ўсё такія вось буйныя высокатэхналагічныя праекты. Каб гаспадаркі працавалі эфектыўна, былі самаакупнымі і ў далейшым усе фінансавыя пытанні вырашалі самастойна.

Усяго ў нас тры філіялы — былыя калгасы, якія нам перададзены. Яны маюць 14,5 тысячы гектараў зямлі, больш за 8 тысяч галоў буйной рагатай жывёлы, адзін займаецца свінаводствам.

— Ці ўдаецца на філіялах нарошчваць аб'ёмы вытворчасці, Віктар Яраслававіч?

— Мы задаволены тым, што ў 2012 годзе філіялы выконваюць усе даведзеныя паказчыкі, атрымалі нядрэнны ўраджай збожжавых. Цалкам забяспечылі сваю жывёлагадоўлю, у тым ліку дзейны комплекс (1000 галоў свіней) кармамі. Зерневай групы — таксама.

Але ёсць рэзерв — далейшае павелічэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур. Ставім перад калектывамі задачу па павелічэнні ўраджаяў. Сёння яны ў сярэдзіне раённай табліцы паказчыкаў. Летась атрымана 46,5 цэнтнера збожжа на круг. Лічым, што на гэтай зямлі можам атрымліваць 50 і 55 цэнтнераў, а магчыма, і больш — калі будзем граматна працаваць з зямлёй, належным чынам яе ўгнойваць і апрацоўваць, высокатэхналагічна выконваць усе аперацыі.

— Як справы з кадрамі ў вашым аграрным сектары?

— Кадравае пытанне застаецца складаным. Ахвотных працаваць у сельскай гаспадарцы няшмат, таму ахвотна прыцягваем маладых спецыялістаў, стараемся ўтрымліваць іх на вёсцы. Тым не менш пераважаюць людзі сталага, а то і пажылога ўзросту, а ў іх працаздольнасць ужо не тая. Мы гэта разумеем і падтрымліваем іх. Выйсце бачым у нарошчванні тэхнічнай узброенасці філіяльных гаспадарак. Чым мы, уласна кажучы, і займаемся.

А ад моладзі нашых вёсак чакаем большай самааддачы ў працы, перайманні вопыту і традыцый старэйшых пакаленняў, большага ўкладу ў развіццё эканомікі сваіх гаспадарак.

— Не менш актуальную тэму пашырэння рынкаў збыту мы паспелі абмеркаваць з вашымі спецыялістамі, але хацелася б даведацца пра вашы асабістыя прыярытэты як кіраўніка.

— Зараз асноўным партнёрам для нас з'яўляецца Расійская Федэрацыя. І не толькі такія буйныя мегаполісы, як Масква і Санкт-Пецярбург. У апошні час усё больш увагі звяртаем на расійскую глыбінку, на буйныя губернскія гарады, і там стараемся прапаноўваць сваю прадукцыю. Актыўна вывучаем рынак Казахстана, нам цікавыя таксама Украіна і іншыя краіны постсавецкай прасторы.

Як перспектыўны для сябе разглядваем еўраазіяцкі рынак, а таму вывучаем магчымасць пастаноўкі на паток халяльнага прадукту. Думаем, што ён можа пайсці не толькі ў краінах, дзе традыцыйна ім карыстаюцца, а на тым жа расійскім рынку.

— Задачы для вас вызначаны складаныя. Ці па плячы яны калектыву?

— Мой асабісты досвед работы ў гэтым калектыве дазваляе сцвярджаць, што справімся. Апошнія гады ішла пэўная селекцыя, нехта не вытрымаў зададзенага тэмпу, некаму не хапіла вопыту і ведаў. Прыйшлі іншыя, хто прыняў новы ўзровень патрабаванняў. А касцяк застаўся ранейшы, вельмі моцны, праверaны на справе. Усё гэта дае мне падставы для аптымізму.

Набліжаецца прафесійнае свята, і я віншую аграрыяў, перапрацоўшчыкаў, нашых дзелавых партнёраў. Самае галоўнае, безумоўна, каб усе мы былі здаровыя, каб у кожнага быў цудоўны настрой на працы і ў сям'і.

Скажу нават так: каб кожны быў задаволены тымі вынікамі, якіх ён у жыцці дабіваецца. Дзейнічае вельмі просты закон: калі будзе эфектыўна развівацца вытворчасць, то будуць эфектыўна вырашацца і іншыя пытанні, у тым ліку сацыяльныя, будзе расці заработная плата.

Генеральны дырэктар Віктар ТАМАШЭЎСКІ.

● Тут «саспяваюць» сыравэнджаныя вырабы.

● Кладаўшчык мясаперапрацоўчага цэха Любоў ЛІСТАПАД прадэманстравала для фотаздымка каўбасу сыравэнджаную салямі вышэйшага гатунку ў новай упакоўцы.

● Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Ірына БЕЛАВУС і аператар тэрмаапрацоўкі Валянціна ЧУМАРОВА.

НОВЫЯ ЦЭХІ — НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Галоўны інжынер Аляксандр Кабыш:

— Зразумела, што на месцы мы не стаім, імкнёмся мадэрнізаваць вытворчасць, развіваць. У гэтым сэнсе навін сапраўды шмат, і ўсе яны даволі важкія.

Пачнём з таго, што летась увялі новы цэх па вытворчасці не фондавых (ліверных) каўбас — закупілі для яго шэсць новых польскіх паравых катлоў і новы варачны кутар, а такіх даволі сур'ёзных машын у Беларусі адзінкі.

У канцы мінулага — пачатку гэтага года пусцілі цэх замарозкі прадукцыі з установкай хуткамаразільных плітачных апаратаў, ён дапамагае нам рыхтаваць прадукцыю для вытворчасці і на экспарт.

Два буйныя аб'екты здалі сёлета. Правялі рэканструкцыю на ўчастку забою свіней, паставілі там новую славенска-аўстрыйскую лінію. Кошт праекта набліжаецца да 2 мільёнаў еўра, але дзякуючы лініі якасць прадукцыі палепшылася і яна яшчэ шырэй пойдзе на экспарт, і гэтыя вялікія грошы мы паступова апраўдаем. Увялі ў эксплуатацыю новы цэх паўфабрыкатаў — з новымі камерамі захоўвання, маразільнымі камерамі і іншым тэхналагічным абсталяваннем.

Далей плануем рэканструкцыю лініі па перапрацоўцы буйной рагатай жывёлы — для паляпшэння якасці перапрацоўкі і наладжвання выпуску халяльнай сыравіны (гэта значыць такой, якая падрыхтавана з дакладным улікам мусульманскай традыцыі) і атрыманай з яе прадукцыі.

Працягваем мадэрнізацыю халадзільнай гаспадаркі, кампрэсарнай і кацельні, у планах — мадэрнізацыя ўчастка экспедыцыі, абвалкі. На чарзе таксама ўстаноўка новых, аўтаматычных сушыльных камер на вытворчасці сыравэнджаных каўбас.

Прыводзім вытворчыя памяшканні і наогул вытворчасць у адпаведнасць з новымі нормамі і правіламі, таму выканалі велізарны аб'ём рамонтных работ. Зараз працуем над атрыманнем міжнароднага сертыфіката ICO 22000, што патрабуе прывядзення вытворчых памяшканняў і абсталявання да еўрапейскага ўзроўню.

Ва ўсіх гэтых шматлікіх рамонтных, будаўнічых работах мы абапіраемся на ўласныя дапаможныя службы, у якіх працуе больш за сто чалавек. Назавём некаторых перадавікоў службы галоўнага інжынера. Гэта слесар АГМ Міхаіл Мікалаевіч Рамановіч, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электраабсталявання Дзяніс Уладзіміравіч Коршун, слесар КІПіА Генадзь Яўгенавіч Астроўскі, старшы машыніст АГУ Уладзімір Сяргеевіч Пархімовіч, вадзіцель Сяргей Рыгоравіч Бартошык — пералік можна працягваць доўга.

Не менш старанна працуюць нашы людзі і ў вёсках філіяльных гаспадарак, бо мы клапоцімся пра свой «аграрны сектар», пра яго тэхнічную ўзброенасць. У прыватнасці, зараз праводзіцца мадэрнізацыя блокаў для ўтрымання свіней з установкай новых сістэм кармлення, элементаў «шведскага стала», з аўтаматычнай падачай кармоў. А старыя фермы перажываюць рэканструкцыю — таксама з нашым непасрэдным удзелам.

Варта сказаць і пра тое, што пашыраем сваю гандлёвую сетку, уводзім новыя фірмовыя крамы. Вы маглі бачыць побач з прахадной прадпрыемства новы магазін з вялікай гандлёвай залай і кавярняй. Адкрылі свае магазіны ў Нясвіжы і Салігорску, яшчэ адзін плануецца пабудаваць у Слуцку. Наша прадукцыя ў фірмовым гандлі разыходзіцца нарасхват. І не толькі ў фірмовым.

АД «ПАСОЛЬСКАЙ» І «ЭЛІТНАЙ» ДА ПАШТЭТУ З ПРАВАНСКІМІ ТРАВАМІ

Намеснік генеральнага дырэктара па вытворчасці Ірына Белавус:

— Мы даволі настойліва працуем над укараненнем у вытворчасць новых відаў прадукцыі, істотна абнаўляем яе кожны месяц — ва ўсякім разе, з'яўляецца 15-20 новых найменняў. Бо пастаянна выкарыстоўваем новыя дабаўкі, новыя смакі, спецыі, прымяняем зусім іншыя абалонкі, шліфуецца тэхналогія. Гэта і дазваляе рабіць асартымент больш разнастайным. Зараз ён перавышае 200 найменняў.

Калі звярнуцца да канкрэтыкі, то ва ўсіх на слыху такая наша надзвычай далікатэсная група каўбас, як «Смак Усходу» з ялавічыны. Яна знайшла свайго пакупніка, і аб'ёмы выпуску пастаянна растуць. Таксама як і на іншую прадукцыю з ялавічыны — «Ялавічыну араматную», «Бастурму далікатэсную», суджукі, на «Слуцкі гасцінец» (гэта падпрасаваны прадукт з невялікім утрыманнем шпігу).

Асартымент сыравэнджаных каўбас аднаўляецца яшчэ дзякуючы і таму, што адначасова з традыцыйнай тэхналогіяй іх вытворчасці выкарыстоўваем больш кароткія тэрміны сушкі (тых жа салямі), пры гэтым якасныя і смакавыя параметры захоўваюцца. Гэта такія каўбасы, як «Сталічная з каньяком», «Пасольская». Мы нават змяняем знешні выгляд сыравэнджаных каўбас — «Прэзента» і «Мілана» выпускаюцца ў тонкай абалонцы, а «Мілана» мае яшчэ і модную ў Еўропе пасыпку з імітацыяй «пад плесню». Новыя віды абалонкі выкарыстаны ў варана-вэнджаных каўбасах «Сервелат з ядлоўцавымі ягадамі», каўбаса мае форму жаночага сілуэта, і «Італьянская» ў тэкстыльнай абалонцы, што надае прадукту надзвычай прэзентабельны выгляд.

Гэтак жа творча працуем і над астатнім асартыментам. У тым ліку над прадукцыяй эканом-класа, сацыяльна значнай. Нарошчваць яе выпуск дазваляе ўстаноўка ў цэху ліверных каўбас высокапрадукцыйнага кутара, які паскарае тэхналагічны працэс вытворчасці ліверных і крывяных каўбас, паштэтаў. Адначасова з'явіліся магчымасці для таго, каб зрабіць гэтую прадукцыю яшчэ больш даступнай для пакупніка з нізкім узроўнем даходаў. Дарэчы, попыт на такую прадукцыю расце (адносім гэта і на паляпшэнне смакавых якасцяў нашай прадукцыі). Больш папулярнымі становяцца і рулеты з субпрадуктаў, зельцы (у тым ліку вэнджаныя), сальцісоны. Сёння працуем над цэлай лінейкай паштэтаў — увялі яшчэ чатыры найменні ў новай упакоўцы з фольгі з выкарыстаннем разнастайных смакавых дабавак (праванскіх траў, смятаны з кропам, кропу, папрыкі). Заўважана, напрыклад, што пакупніку цяжка прайсці міма паштэту з чарнаслівам ці курагой.

УЗНАГАРОДЫ ААТ «СЛУЦКІ МЯСАКАМБІНАТ» У 2012 ГОДЗЕ

Выстава «Беларусь—Расія-2012», г. Масква — залаты медаль за «Сервелат з ядлоўцавымі ягадамі» (салямі в/в в/с); сярэбраны медаль атрымала каўбаса «Элітная» (салямі с/в в/с).

На міжнародным конкурсе «Лепшы прадукт-2012» у Маскве залаты медаль атрымалі ялавічына с/в «Святочная», а таксама выраб з ялавічыны с/в «Слуцкі гасцінец». Сярэбраны медаль — у каўбасы сухой «Сыравэнджаная люкс» в/с.

На рэспубліканскім конкурсе спажывецкіх пераваг дыпломы ўсіх трох ступеняў былі прысуджаны ў намінацыях «Паштэт», «Каўбаса сыравэнджаная» і «Мясныя далікатэсы».

На міжнароднай выставе «Беларусь—Расія-2012» у белакаменнай залаты медаль атрымалі кансервы мясныя «Свініна тушаная».

Конкурс-дэгустацыя «Густ-2012»: дыпломы атрымалі кансервы «Каша грэцкая з ялавічынай» і шашлык «Слуцкі ў марынадзе», а таксама каўбаса «Нарачанская» (с/в в/с).

Міжнародная выстава-кірмаш «АграРусь-2012» у Санкт-Пецярбургу прынесла пасведчанне пераможцы конкурсу і Гран-пры за высокую якасць харчовай прадукцыі. Строгаму журы асабліва спадабаліся «Мілана» (каўбаса с/в салямі в/с), «Прэзента» (каўбаскі с/в салямі в/с), «Сталічная з каньяком» (с/в салямі в/с), «Італьянская (в/в салямі в/с), «Сервелат з ядлоўцавымі ягадамі» (в/в салямі в/с), «Крамлёўская» (в/в салямі в/с).

Яшчэ адзін міжнародны конкурс — «АграРусь-2012» у Санкт-Пецярбургу — прынёс залатыя і сярэбраныя медалі за серыю каўбас в/в в/с «Італьянская», «Крамлёўская», «Сервелат з ядлоўцавымі ягадамі». А таксама за серыю каўбас салямі в/с «Мілана» с/в, «Прэзента» с/в, «Сталічная з каньяком» с/в.

На расійскай аграпрамысловай выставе «Залатая восень-2012» залаты медаль атрымалі каўбаса сыравэнджаная паўсухая «Суджук па-турэцку», каўбаса варана-вэнджаная салямі «Італьянская», прадукт са свініны «Прадукт старажытны».

А выстава-кірмаш «Белагра-2012» папоўніла скарбонку ўзнагарод дыпломам за актыўны ўдзел у правядзенні Беларускага аграпрамысловага тыдня 2012 года. І прынесла сімпатыі шматлікіх наведнікаў.

Калектыў вытворчай лабараторыі пільна сочыць за якасцю сыравіны, якая паступае на прадпрыемства. Гэты фотаздымак знаёміць з начальнікам лабараторыі Тамарай БУЛАТАВАЙ (першая справа) і інжынерам-хімікам Дар'яй БАРЫН.

***

Пра сённяшні дзень прадпрыемства, пра яго планы па больш шырокім выхадзе на рынкі, у тым ліку замежныя, нам таксама расказвалі начальнік аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Аляксей Барцэвіч, вельмі дасведчаныя супрацоўнікі аддзела маркетынгу. З удзячнасцю гаварыў аб рабоце гаспадарак сыравіннай зоны начальнік сыравіннага аддзела Дзмітрый Лях.

Калектыў Слуцкага мясакамбіната працуе напружана і плённа. Пажадаем яму новых поспехаў і шчыра павіншуем са святам!

УНП 600119108

● Галоўны інжынер Аляксандр КАБЫШ (першы справа), слесар Андрэй МАКАРАЎ, механік Дзяніс КУЧУРА на адным з участкаў лініі перапрацоўкі свініны.

● Начальнік аддзела знешнеэканамічнай дзейнасці Аляксей БАРЦЭВІЧ, спецыяліст па маркетынгу Анфіса СТАІЧ, спецыяліст па знешнеэканамічнай дзейнасці Вадзім ФЕДАРОВІЧ, спецыяліст па маркетынгу Аляксандр КАВАВІН.

МОВАЙ ЛІЧБАЎ

За 9 месяцаў бягучага года ААТ «Слуцкі мясакамбінат» выпусціў прадукцыі на суму 703 млрд руб. з тэмпамі росту ў дзейных цэнах 209,6 %.

Перапрацавана 29109 тон жывёлы. Вытворчасць каўбасных вырабаў склала 8169 тон, паўфабрыкатаў — 2748 тон, кансерваў — 2245 туб з тэмпамі росту да ўзроўню мінулага года адпаведна 106,7 %, 137 % і 129 %.

Экспарт прадукцыі складае 44 % ад агульнай колькасці выпушчанай прадукцыі.

За 9 месяцаў экспарт склаў 36528 тыс. дол. ЗША. Атрымана дадатнае сальда знешняга гандлю ў суме 28746 тыс. дол. ЗША.

Інвестыцыі ў асноўны капітал склалі 49325 млн руб. з тэмпамі росту 354,8 % у супастаўных цэнах.

Прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі — 39 млрд руб., чысты прыбытак — 18 млрд руб.

У зале фірменнага магазіна, які размешчаны каля прахадной прадпрыемства.



Ветэрынар Алена ПАРТНОВА.

«Слуцкі аграсэрвіс»

ГЛЯДЗІЦЬ У БУДУЧЫНЮ З АПТЫМІЗМАМ

ААТ «СЛУЦКІ АГРАСЭРВІС» было створана ў 2003 годзе шляхам аб'яднання прадпрыемстваў «Слуцкая сельгасхімія», «Слуцктэхсэрвіс» і Слуцкага райаграпрамснаба. Цяпер гэта сучаснае прадпрыемства, якое дынамічна развіваецца і дзе не толькі займаюцца рамонтам сельскагаспадарчай тэхнікі і аказваюць розныя паслугі прадпрыемствам АПК, але і сваімі сіламі распрацоўваюць і вырабляюць тэхніку новага пакалення, вырошчваюць «мармуровае» мяса і будуюць фермы-тысячнікі.

Сакрэт поспеху ад Аляксандра Вашчанкі

Дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу» Аляксандр ВАШЧАНКА.

Кожны год прадпрыемства займае прызавыя месцы ў рэспубліканскім спаборніцтве.

Так, у 2010 годзе ААТ «Слуцкі аграсэрвіс» заняў 3-е месца сярод раённых арганізацый аграсэрвісу, якія займаюцца рамонтам і падрыхтоўкай сельскагаспадарчай тэхнікі да палявых работ.

У мінулым 2011 годзе — 1-е месца ў рэспубліканскім спаборніцтве сярод арганізацый аграсэрвісу за гандаль і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне.

«Людзі працуюць на сумленне, стараюцца. Хоць, вядома, ёсць і праблемы, не ўсё яшчэ атрымліваецца», — самакрытычна заўважае дырэктар.

Сам Аляксандр ВАШЧАНКА ў 2008 годзе стаў «Чалавекам справы». На гэтую намінацыю Аляксандр Васільевіч быў вылучаны за садзейнічанне аграпрамысловаму комплексу.

У 2011 годзе дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу» быў узнагароджаны Міністэрствам сельскай гаспадаркі Беларусі за шматгадовую плённую працу ў сістэме аграпрамысловага комплексу і вялікі асабісты ўклад у развіццё аграсэрвіснай службы.

Дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу» Аляксандр ВАШЧАНКА ВІНШУЕ З ПРАФЕСІЙНЫМ СВЯТАМ УСІХ, хто працуе ў сістэме аграсэрвісу, жадае калегам добрага здароўя і новых вытворчых поспехаў у вельмі патрэбнай справе абслугоўвання сельгаспрадпрыемстваў і вытворчасці сельгаспрадукцыі.

«Дык у чым сакрэт поспеху?» — пацікавіліся мы ў Аляксандра Вашчанкі. «Мы не зацыкліліся на чымсьці адным, а развіваем многія кірункі. Адна служба падстаўляе плячо іншым, — кажа дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу». — Гэтая стратэгія аказалася выйгрышнай. Некаторыя імкнуцца аддаць далучаныя падсобныя гаспадаркі назад, а я не аддам. Таму што ад яе ўжо ёсць аддача. Толькі за малако мы атрымалі 2 млрд. рублёў — гэта ж жывыя грошы! Падсобная гаспадарка — асноўная крыніца грошай для зарплаты. Так што ўвогуле ў нас атрымліваецца трымацца на плыву і працаваць з прыбыткам».

І на самой справе — за тры кварталы гэтага года прадпрыемства атрымала 10 млрд рублёў чыстага прыбытку. Сёлета «Слуцкім аграсэрвісам» за 9 месяцаў было рэалізавана прадукцыі на 133 млрд рублёў. Гэта 250% у параўнанні з мінулым годам. Застаецца толькі сказаць: так трымаць!

Прафесіяналы ў сваёй вобласці

Сёння, нарэшце, у вёсцы з'явілася магчымасць трохі перадыхнуць. А вось у рамонтных цэхах вёскі Вясея, якія ўваходзяць у склад **«Слуцкага аграсэрвісу»**, стаіць гарачая пара. Бо менавіта ў лістападзе пачынаецца асноўны рамонтны перыяд. Мясцовыя спецыялісты прафесійна выконваюць рамонт глебаапрацоўчай, кормараздатачных машын, збожжаўборачнай тэхнікі, па сутнасці справы — усяго спектру машын, якія выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы Слуцкага раёна. «Паслугі прадпрыемства запатрабаваныя не толькі гаспадаркамі Слуцкага раёна, але і яшчэ шасцю раёнамі Мінскай вобласці», — кажа **дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу» Аляксандр ВАШЧАНКА.**

Інжынер-эколаг Алена ГУРЫНОВІЧ і інжынер па метралогіі, стандартызацыі і якасці прадукцыі Наталля КАВАЛЬЧУК.

Каб атрымліваць ад сельскагаспадарчай вытворчасці максімальную аддачу, неабходна браць на ўзбраенне сучасную магутную тэхніку. Таму на прадпрыемстве пастаянна вядзецца мадэрнізацыя і абнаўленне вытворчых фондаў. Тут ёсць устаноўкі плазменнай рэзкі, сучасныя зварачныя паўаўтаматы і металаапрацоўчае абсталяванне. Асвойваецца і выраб новай тэхнікі.

— У гэтым годзе асвоілі вытворчасць новага 18-тоннага прычэпа, прызначанага для транспарціроўкі сельскагаспадарчай прадукцыі, — распавядае **галоўны інжынер прадпрыемства Юрый КАВАЛЬЧУК.** — Робім прэс-падборшчык буйнагабарытных цюкоў для падбору валкоў сена, сеяных траў і саломы і прасавання іх у буйнагабарытныя цюкі з адначасовай абвязкай шпагатам. Выйгралі рэспубліканскі тэндар па яго пастаўцы сельгаспрадпрыемствам. Зараз праходзіць сертыфікацыю 15-тонны паўпрычэп для транспарціроўкі сыпкіх грузаў. Пасля атрымання сертыфіката ён будзе таксама выстаўлены на тэндар.

***

Прадпрыемства актыўна ўдзельнічае ў рэалізацыі праграмы па рэканструкцыі фермаў. Вырабляе стойлавае абсталяванне для фермаў, манціруе даільныя залы, абслугоўвае жывёлагадоўчыя фермы. «Гэта вялікі аб'ём работ, — кажа Аляксандр ВАШЧАНКА. — Але мы асвоілі новую тэхніку, купілі новыя станкі... Да гэтай працы цалкам гатовы».

А яшчэ «Слуцкі аграсэрвіс» займаецца пастаўкай мінеральных угнаенняў, сродкаў абароны раслін, з'яўляецца дылерам «Гомсельмаша»: атрымлівае іх камбайны, камплектуе і рэалізуе гаспадаркам, вырабляе гарантыйнае абслугоўванне яго тэхнікі ў васьмі раёнах Мінскай вобласці. Увогуле, прадпрыемства шматпрофільнае.

Вакансіі тут, вядома, ёсць, але да падбору работнікаў на прадпрыемстве падыходзяць старанна і адказна. Імкнуцца больш прыцягваць моладзь з бліжэйшых школ. На тэрыторыі прадпрыемства ёсць Цэнтр па падрыхтоўцы, павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы рабочых Слуцкага райсельгаса. У ім рыхтуюць машыністаў-аператараў кацельні, зваршчыкаў, трактарыстаў, вадзіцеляў аўтамабільнага пагрузчыка.

Без адрыву ад вытворчасці ў рамонтных цэхах можна атрымаць прафесію токара, фрэзероўшчыка, зваршчыка. Кажуць, спецыялісты выходзяць добрыя. Побач Салігорск, таму, чаго граху ўтойваць, некаторых пераманьвае «Беларуськалій». І хваліць якасць іх прафесійнай падрыхтоўкі.

Начальнік участка па рамонце сельгасмашын Анатоль РАДКЕВІЧ і электрык-газазваршчык Сяргей ГУШЧЫН.

Збожжа, малако гатунку «экстра» і «мармуровае» мяса

У 2003 годзе да ААТ «Слуцкі аграсэрвіс», аднаго з першых, далучыліся тры стратныя гаспадаркі раёна: калгас «Радзіма» ў Гольчыцах, «Краіна саветаў» у Амговічах і «Мір», што ў вёсцы Навінкі. Усяго ў прадпрыемстве налічваецца 10500 га сельгасугоддзяў. Нямала!

— Мы вельмі шмат уклалі ў падсобную гаспадарку, больш за 30 млрд рублёў... — успамінае Аляксандр Вашчанка. — Цяпер яна працуе, развіваецца. Павялічылася ўраджайнасць, ужо ў 2006 годзе паказчыкі пайшлі ў плюс.

Гэты год аказаўся спрыяльным для нарыхтоўкі збожжа. «Мы атрымалі вал збожжа 12053 тоны (у мінулым годзе — 9364 тоны). Акрамя таго, намі было закуплена элітнае насенне першай рэпрадукцыі. Гэта таксама дало аддачу. Дзяржзаказ выконваем і перавыконваем», — кажа **намеснік дырэктара філіяла «Падсобная сельская гаспадарка» ААТ «Слуцкі аграсэрвіс» Валянціна СЯНЬКЕВІЧ.**

На палях аб'яднанага прадпрыемства вырошчваюць пшаніцу, жыта, ячмень, авёс, бульбу, цукровыя буракі, рапс.

— На асноўныя сельскагаспадарчыя работы возім рабочых з горада. Два аўтобусы кожную раніцу развозяць механізатараў сельгасработ. Мясцовыя працуюць толькі на ферме. А сеюць, араць, прыбіраюць гараджане, — распавядае Аляксандр Вашчанка. — Хоць часам нам бывае складана канкураваць з гарадскімі прадпрыемствамі ў справе прыцягнення кадраў, у цэлым спраўляемся. Сярэдні заробак нашых работнікаў складае 3,5 млн. рублёў. За кастрычнік сярэдняя зарплата аказалася 4 млн. рублёў. А ў аграсэрвісе кіроўцы, механізатары зарабляюць і 8, і 10 млн. рублёў. Увогуле, хто хоча, той можа зарабіць.

***

Устала на ногі і жывёлагадоўчая галіна. Намаганнямі аграсэрвісу было адноўлена 17 разваленых фермаў. Сёння колькасць буйной рагатай жывёлы тут — 5393 галавы. Гэта дойныя, мясныя каровы, маладняк і адкорм (быкі).

— У 2009 годзе мы пабудавалі комплекс на 720 галоў. Цяпер пачалі будаўніцтва новага малочнатаварнага комплексу на 1100 кароў. Плануем увесці яго ў строй у наступным годзе. Вялікая ферма – прасцей кіраваць, арганізаваць працу, бо ўсё знаходзіцца побач, на адным месцы. У маі 2013 года плануем запусціць, — дзеліцца планамі дырэктар «Слуцкага аграсэрвісу».

За 9 месяцаў гэтага года тут атрымалі 6981 тону малака. Удой на карову склаў 5033 кг. А летам удой на карову за дзень даходзіў да 23 кг. Малако, дарэчы, тут рэалізоўваюць гатунку «экстра». Якасць яго лепшая, ды і каштуе яно даражэй, чым малако вышэйшага гатунку.

***

А яшчэ тут атрымліваюць знакамітае «мармуровае» мяса. Смакавыя якасці «мармуровага» мяса высока цэняцца, і кошт яго досыць высокі. «Мармуровае» мяса атрымала сваю назву з-за раўнамерна размеркаваных тлушчавых праслоек у мышачных тканках маладых бычкоў. На зрэзе яно нагадвае прыродны малюнак мармуру. Важна наступнае: чым іх больш — тым вышэй якасць прадукту. У працэсе гатоўкі праслойка растае, напаўняючы мяса сокам, за кошт чаго яно набывае непаўторную пяшчотнасць і мяккасць.

ААТ «Слуцкі аграсэрвіс» — адно з самых вялікіх прадпрыемстваў у галіне, у ім працуюць 730 работнікаў.

На базе гаспадаркі «Мір» тры гады таму асемянілі кароў бычкамі мясной пароды. Яны хутчэй растуць, не патрабуюць складанага догляду, досыць непатрабавальныя. Праўда, звычайныя цяляты знаходзяцца з маці суткі, а потым іх забіраюць. А мясныя цяляты растуць з маці і кормяцца ад яе паўгода. І толькі тады іх адбіраюць і гадуюць асобна. Звычайны бычок вырошчваецца прыблізна 1,8 года. Бычкі мясной пароды хутчэй набіраюць вагу, вырастаюць да 470 кг ужо за паўтара года.

— «Стапрацэнтна мармуровае» мяса атрымаем у 4 пакаленні. Мы ўжо на шляху да гэтага, — распавядае Аляксандр Вашчанка. — Займаемся гэтым дзесьці тры гады. Сёння ў нас ужо 3-е пакаленне. Будзем і далей развіваць гэты кірунак.

***

У гэтым годзе ў філіяле з'явілася больш маладых спецыялістаў: прыйшлі два новыя аграномы, ветурач, інжынер па тэхніцы бяспекі. З'явіўся вельмі патрэбны тут заатэхнік-селекцыянер, цялятнік. Гаспадарка вялікая і пры гэтым яшчэ пашыраецца, так што новым кадрам тут рады!

Намеснік дырэктара філіяла «Падсобная сельская гаспадарка» ААТ «Слуцкі аграсэрвіс» Валянціна СЯНЬКЕВІЧ.

— У гэтым годзе мы пабудавалі 9 домікаў і ўсе засялілі сем'ямі. Ёсць інтэрнат для маладых несямейных спецыялістаў. Вельмі хочам, каб усе спецыялісты засталіся, замацаваліся ў нас, — кажа Валянціна Сянькевіч, якую ў гаспадарцы замацавалі старэйшай над маладымі спецыялістамі. — Я цікаўлюся іх бытавымі ўмовамі, праблемамі, праводжу гутаркі, стараюся дапамагчы прыжыцца ў нас...

***

У «Слуцкім аграсэрвісе» ёсць яшчэ адзін філіял — «Гасціны двор», які ўключае ў сябе рэстаран, сталовую, тры кулінарыі, кандытарскі цэх. Далучылі да аграсэрвісу стратныя прадпрыемствы грамадскага харчавання ў 2009 годзе. Прадпрыемства стварыла на іх базе фірменныя крамы, у якіх рэалізуецца ў тым ліку і ўласная сельскагаспадарчая прадукцыя. Мінімальная нацэнка на прадукты раслінаводства, на малочную і мясную прадукцыю аказалася выгаднай пакупніку. Ды і свае работнікі купляюць тут прадукты харчавання ў кошт зарплаты, для іх ёсць зніжкі. Для прадпрыемства ж гэта — выдатная магчымасць наладзіць збыт, паскорыць рэалізацыю сваёй прадукцыі.

Ад рэдакцыі. Выказваем шчырую падзяку за энергічную і рознабаковую дапамогу ў падрыхтоўцы падборкі матэрыялаў са Слуцкага раёна начальніку аддзела ідэалагічнай работы Слуцкага райвыканкама Алене Аркадзьеўне КАСАБУЦКАЙ.

УНП 600043896

Спецвыпуск падрыхтавалі В. ПАЗНЯКОЎ, В. ГЕЦЭВІЧ, С. БУСЬКО, С. БАРЫСЕНКА фота Я. ПЯСЕЦКАГА, М. БЕГУНКОВАЙ.

■ Здаровае харчаванне

Пухліны баяцца чырвонага колеру

Здаровому харчаванню трэба вучыцца. Будзем рабіць гэта з дапамогай начальніка аддзела харчавання Навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі па харчаванні, доктара медыцынскіх навук Элеаноры КАПІТОНАВАЙ.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Ці праўда, што ў чырвоных яблыках больш бэта-караціну?

Колер раслінам надаюць самыя розныя рэчывы: вядомы яшчэ са школы хларафіл надае лісцям зялёны колер, флаваноіды і караціноіды — жоўты, аранжавы. А вось за чырвоныя «фарбы» ў лісця, пялёсткаў і пладоў адказваюць часцей за ўсё антацыяны — пафарбаваныя раслінныя гліказіды. Пры гэтым ад узроўню кіслотнасці ў самой расліннай клетцы антацыяны могуць змяняцца, і тады колер раслін будзе мяняцца ад жоўтага праз сіне-зялёны да пурпурна-чырвонага. Антацыянаў шмат ва ўсіх інтэнсіўна пафарбаваных пладах: чарніцах, журавінах, малінах, баклажанах, чырвонай капусце, цёмных гатунках вінограду і інш. Мае значэнне і далучэнне да антацыянаў малекул металаў. Напрыклад, злучэнні з кальцыем і магніем даюць сінюю фарбу, а з каліем — чырвоную. З гэтага вынікае, што ў буяках будзе шмат магнію, а ў журавінах — калію.

Вучоныя яшчэ да канца не ўстанавілі ўсе вартасці антацыянаў, але ўсё ж і так ужо вядома, што яны валодаюць онкапратэктарным дзеяннем — дапамагаюць нам абараняцца ад злаякасных пухлін. Большасць прыродных фарбавальнікаў могуць правакаваць алергічныя рэакцыі, таму чырвоныя яблыкі і іншую рознакаляровую садавіну і гародніну не рэкамендуецца ўжываць людзям з рызыкай алергіі.

Ці праўда, што нельга змешваць сырую і гатаваную ваду?

Гэта адзін з самых распаўсюджаных міфаў, які, праўда, мае пад сабой значную факталагічную базу. Калі апытаць любых 10 чалавек, то як мінімум трое з іх скажуць, што ад падобнага змешвання развіваецца дыярэя. Пры гэтым мала каму вядома, што такі вынік адпавядае закону статыстычнага размеркавання: 1/3 — станоўчы адказ (вынік), 1/3 — адмоўны і 1/3 — нейтральны.

У наш не надта спрыяльны з экалагічных пазіцый час лепш за ўсё ўжываць гатаваную або прафільтраваную ваду. Выкарыстанне вады з адкрытых вадаёмаў, калодзежаў і нават звычайнай водаправоднай сеткі заўсёды пагражае рызыкай магчымых непрыемных наступстваў: вада можа быць забруджана мікраарганізмамі або хімічнымі рэчывамі, а каму «пашанцуе», то тым і другім адначасова.

Калі чай ці боршч здаюцца вам гарачымі, то не варта баяцца дадаць туды чыстай гатаванай або бутыляванай вады. Праўда, заўсёды памятайце, што калі вы чалавек недаверлівы, то можаце аказацца якраз у 1/3 тых, хто пасля такога ўчынку лішні раз прагуляецца ў прыбіральню.

Ці праўда, што з варанай морквы лягчэй засвойваецца вітамін А?

У моркве — ні ў сырой, ні ў варанай — вітаміну А няма. Гэта тлушчарастваральны вітамін, які прысутнічае ў прадуктах жывёльнага паходжання. Затое ў моркве змяшчаецца шмат так званага правітаміну А — караціну, які ў арганізме чалавека ў выніку біяхімічных рэакцый ператвараецца ў самы што ні на ёсць сапраўдны вітамін А, які так патрэбны дзецям для росту, дарослым — каб не хварэць, і ўсім нам — для добрага зроку.

Для лепшага засваення караціну з морквы рэкамендуецца яе не толькі гатаваць з дабаўленнем тлушчу (смятаны, маянэзу, алею або масла, вяршкоў), але і крыху «прыпусціць» на патэльні або ў каструлі. Але і ў сырым выглядзе карацін дойдзе «па прызначэнні», хоць і ў меншай колькасці.

На карацін багатая не толькі морква, але і гарбуз, зялёная цыбуля, шчаўе, шпінат, памідоры, чырвоны перац, брокалі, слівы, персікі, дыня, абрыкосы, хурма, чарніцы, чорныя парэчкі і інш. Таму так важна ўжываць самую розную садавіну і гародніну.

Ці праўда, што ў гатаваным малацэ менш тлушчу і больш вітамінаў і кальцыю?

Дзіўны прадукт — малако. Мы так прывыклі да яго ўжывання з самага ранняга дзяцінства, што ўжо не ўяўляем сабе жыцця без яго, хоць матухна-прырода прыдумала для ўсіх матчына малако. Гэта значыць, што каровіна малако — для цялят, а для маленькага чалавечка — жаночае малако, і тое ў абмежаваны ўзроставы перыяд.

Пра тое, што піць сырое малако небяспечна, зараз ведае кожнае дзіця, а тым больш, дарослыя. Гэта абумоўлена рызыкай інфіцыявання малака жывёл. Таму малако ў хатніх умовах гатуюць, а на малочных заводах абясшкоджваюць іншымі спосабамі.

Што ж адбываецца з малаком падчас гатавання? Па-першае, кожная гаспадыня ведае, што малако трэба пастаянна памешваць, таму што на дне і сценках каструлі падчас гатавання ўтвараецца налёт (асадак) — гэта сыроватачныя бялкі, якія адкіпелі (альбумін і інш.). Па-другое, малако не любіць гатавання, пастаянна імкнецца збегчы з пліты — над ім «шапкай» узнімаецца пенка, якая пасля гатавання пакрые ўсю паверхню. Складаецца малочная пенка з малочнага тлушчу, мінеральных рэчываў (у тым ліку кальцыю і фосфару, якія пераходзяць у нерастваральныя злучэнні) і пэўнай колькасці малочнага бялку казеіну, які адкіпеў. Акрамя таго, падчас гатавання практычна поўнасцю «забіваецца» вітамін С, які ёсць у малацэ. Так што гатаванае малако па ступені бяспекі, безумоўна, лепш за сырое, а вось па ступені карысці — намнога горш. Выйсце для ўсіх «малочнікаў» — ужываць малако абеззаражанае, узбагачанае карыснымі рэчывамі і разлітае ў стэрыльную тару ва ўмовах сучасных малочных заводаў.

Святлана БАРЫСЕНКА

НІГЕЛА — ПРЫПРАВА, ЛЕКАВАЯ ЗЁЛКА І КВЕТКА

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 31 (453)

У нігелы — экзатычнай і далікатнай расліны — неверагодная колькасць назваў: дзяўчына ў зеляніне, рымская каляндра, валасы Венеры. Адна з самых вядомых — каліджы, ці калонгі. У мусульманскіх краінах расліну часцей называюць чорным кменам, а англічане далі ёй даволі паэтычную назву — каханне ў смузе. У нас яе называюць проста — чарнушка.

Але не толькі багаццем назваў вылучаецца расліна, а яшчэ і разнастайнасцю выкарыстання. Чарнушка вельмі прыгожа глядзіцца ў кветніках, на альпійскіх горках, дзе яе ажурная зеляніна і эфектныя, падобныя на зорачкі (блакітныя, сінія, белыя ці ліловыя), кветкі, акружаныя карункавымі прыкветкамі, цешаць вока з ранняй вясны да восені. Ды і пасля цвіцення яна не губляе дэкаратыўнасці дзякуючы сваім вытанчаным насенным каробачкам і ярка-зялёнаму моцна рассечанаму лісцю.

У сябе на радзіме — у Міжземнамор'і — чарнушка спрадвеку ўспрымалася не як кветка, а як вострая прыправа. І сёння ў многіх краінах свету насенне чарнушкі, якое мае вострыя пярцовы смак і рэзкі водар, выкарыстоўваюць як спецыю ў кулінарыі, пякарнай і кандытарскай вытворчасцях, кансервавай прамысловасці. Здробненае насенне дадаюць у цеста, сосусы, падлівы, ужываюць для араматызацыі рыбных і мясных страў, пры квашанні капусты, саленні агуркоў, памідораў і кавуноў. Яго дадаюць у разнастайныя агароднінныя стравы, салаты і супы. Водар каліджы трохі нагадвае трускалку. На смак спачатку здаецца крыху гаркаватай, а потым вострай. Выкарыстанне каліджы ў якасці прыправы тыповае для егіпецкай кухні. Ужываюць яе таксама ў арабскіх краінах і, вядома ж, у Індыі — у ведычнай кулінарыі. Часта яе ўжываюць таксама, як і чорны перац, аднак яе перавага ў тым, што яна не раздражняе слізістую абалонку страўніка. На Сярэднім Усходзе (асабліва ў Турцыі) насеннем каліджы пасыпаюць выпечаныя вырабы, як макам. У Кіргізіі ёй араматызуюць аладкі і чай. Для поўнага раскрыцця (узмацнення) водару насенне каліджы варта крыху абсмажыць у алеі. У некаторых выпадках насенне перад ужываннем у ежу расціраюць. Загадзя гэтага рабіць нельга, бо яно пазбавіцца свайго непараўнальнага водару... Для надання малаку адмысловага паху каліджы кіпяцяць у ім.



Больш за 400 гадоў чарнушку ўжываюць і ў народнай медыцыне. Яна аказвае танізавальны ўплыў на арганізм чалавека, паляпшае зрок, памяць, валодае антыдэпрэсіўным дзеяннем. Насенне расліны выкарыстоўваюць для лячэння хвароб страўніка-кішачнага тракта і печані, як мяккі паслабляльны, магонны і глістагонны сродак. Яно эфектыўнае пры лячэнні падагры, рэўматызму і паяснічна-крыжавага радыкуліту.

Даследаванні сучасных навукоўцаў таксама далі ашаламляльныя вынікі — алей нігелы з'яўляецца не толькі моцным сродкам, які павышае імунітэт чалавека, але і магутнымі антыбактэрыяльным сродкам, што пераўзыходзіць па сваіх уласцівасцях некаторыя сучасныя антыбіётыкі.

Насенне чарнушкі мае пякучы і вострый смак, гоніць газы, аказвае сагравальнае дзеянне. З'яўляючыся мяккім тонікам, паляпшае дзейнасць мозгу і актывізуе нервовую сістэму, паляпшае зрок. Калі неабходна хутка вырашыць праблему, чарнушка проста незаменная — думкі чалавека становяцца выразнымі і імклівымі.

Арабскія лекары рэкамендуюць каліджы як сродак для паляпшэння памяці. Для гэтага трэба час ад часу з'ядаць тры грамы молатага насення, змяшаныя з 10 грамамі мёду. Дзякуючы гэтаму паляпшаецца кароткачасовая памяць, ярчэй успрымаецца навакольны свет.

Асабліва карысная чарнушка людзям старэйшага і пажылога ўзросту.

Супрацьпаказанні: падчас цяжарнасці ў вялікіх колькасцях насенне чарнушкі можа справакаваць выкідыш.

У цэлым, пабочных дзеянняў можна не асцерагацца; пазбягайце толькі перадазіроўкі, каб выключыць раздражняльнае дзеянне на страўнік і кішэчнік (сутачная доза насення — 1 чайная лыжка).

Чарнушку вельмі лёгка вырошчваць — аднойчы пасеяная, далей яна размнажваецца сама. Прычым не настолькі агрэсіўна, каб заняць сабой увесь участак.

Да глебы каліджы мала патрабавальная, хоць лепш развіваецца на рыхлых, урадлівых землях і адкрытых сонечных месцах.

Непасрэдна пад нігелу свежыя арганічныя ўгнаенні і высокія дозы азотных не ўносяць, паколькі яны могуць моцна зацягнуць перыяд вегетацыі і расліны не выспеляць насення.

Уборку ўраджаю пачынаюць пры паспяванні 2/3 насення. Расліны зразаюць і падсушваюць, звязаўшы ў снапкі. Праз тры-чатыры дні пасля падсыхання іх абмалочваюць і аддзяляюць насенне, якое потым захоўваюць у шчыльна закрытым шкляным ці керамічным посудзе ў сухім цёмным месцы.

Высушаныя букецікі нігелы ці насенныя каробачкі, зрэзаныя ў зеленкаватым стане, эфектна глядзяцца ў сухіх зімовых букетах і кветкавых кампазіцыях.

РАШЭННЕ КАНСТЫТУЦЫЙНАГА СУДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

АБ ПРАВАВЫМ РЭГУЛЯВАННІ АДКАЗНАСЦІ ЗА НЕВЫКАНАННЕ ГРАШОВАГА АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА

Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь у складзе старшынствуючага — Старшыні Канстытуцыйнага Суда Міклашэвіча П.П., намесніка Старшыні Сяргеевай В.Г., суддзяў Бойка Т.С., Варановіча Т.В., Данілюка С.Я., Ізоткі У.П., Козыравай Л.Р., Марыскіна А.У., Падгрушы В.В., Рабцава Л.М., Цікавенкі А.Г., Чыгрынава С.П.

на падставе часткі восьмай артыкула 22 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў

у парадку рэалізацыі права на ўнясенне Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, у палаты Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй прапаноў аб неабходнасці ўнясення ў акты заканадаўства змяненняў і (або) дапаўненняў

з удзелам прадстаўнікоў:

Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь — Дземідовіча У.М., першага намесніка Старшыні Вышэйшага Гаспадарчага Суда Рэспублікі Беларусь;

Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь — Забары А.А., намесніка Старшыні Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь;

Генеральнай пракуратуры Рэспублікі Беларусь — Стука А.К., намесніка Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь;

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь — Мартыненкі Э.А., намесніка начальніка ўпраўлення праваго рэгулявання грамадзянскіх, эканамічных адносін, ліцэнзавання і знешнеэканамічнай дзейнасці галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы эканомікі і эканогіі Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь;

Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь — Яркаўца А.І., начальніка галоўнага ўпраўлення статыстыкі цэн Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь,

разгледзеў у судовым пасяджэнні зварот суб'екта гаспадарання па пытанні адсутнасці аднастайнай практыкі прымянення агульнымі і гаспадарчымі судамі палажэнняў пункта 2 артыкула 366 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь у частцы спагнання сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі.

Прааналізаваўшы нормы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (далей — Канстытуцыя), Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ГК) і іншых нарматыўных прававых актаў, Канстытуцыйны Суд устанавіў наступнае.

1. У адпаведнасці з Канстытуцыяй у Рэспубліцы Беларусь устанаўліваецца прынцып вяршэнства права (частка першая артыкула 7); дзяржава гарантуе правы і свабоды грамадзян Беларусі, замацаваныя ў Канстытуцыі, законах і прадугледжаныя міжнароднымі абавязацельствамі дзяржавы (частка трэцяя артыкула 21); усе роўныя перад законам і маюць права без усякай дыскрымінацыі на роўную абарону правоў і законных інтарэсаў (артыкул 22); дзяржаўныя органы, службовыя і іншыя асобы, якім даверана выкананне дзяржаўных функцый, абавязаны ў межах сваёй кампетэнцыі прымаць неабходныя меры для ажыццяўлення і абароны правоў і свабод асобы (частка другая артыкула 59).

Згодна з артыкулам 8 Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека кожны чалавек мае права на эфектыўнае аднаўленне ў правах кампетэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадку парушэння яго асноўных правоў, прадастаўленых яму канстытуцыяй або законам.

У Міжнародным пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах замацаваны абавязак кожнай дзяржавы, што ўдзельнічае ў дадзеным Пакце, забяспечыць любой асобе, правы і свабоды якой парушаны, эфектыўны сродак прававой абароны, а таксама развіваць магчымасці судовай абароны (падпункты «а» і «b» пункта 3 артыкула 2).

Канстытуцыйны Суд адзначае, што, зыходзячы з указаных палажэнняў Канстытуцыі і міжнароднаправавых актаў, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь, дзяржава абавязана ствараць заканадаўчыя механізмы, што забяспечваюць эфектыўную абарону парушаных правоў і свабод.

2. На канстытуцыйных нормах аб гарантаванні ўсім роўных магчымасцей свабоднага выкарыстання здольнасцей і маёмасці для прадпрымальніцкай і іншай не забароненай законам эканамічнай дзейнасці (частка чацвёртая артыкула 13 Канстытуцыі); аб гарантаванні кожнаму права ўласнасці і садзейнічання яе набыццю; аб праве ўласніка валодаць, карыстацца і распараджацца маёмасцю як асабіста, так і сумесна з іншымі асобамі; аб абароне ўласнасці, набытай законным спосабам (часткі першая — трэцяя артыкула 44 Канстытуцыі), грунтуецца грамадзянскае заканадаўства, якое рэгулюе ў тым ліку адносіны ўдзельнікаў грамадзянскага абароту.

У развіццё канстытуцыйных норм у ГК у якасці асноўных пачаткаў грамадзянскага заканадаўства вызначаны прынцып свабоды дагавору і прынцып бесперашкоднага ажыццяўлення грамадзянскіх правоў, забеспячэння аднаўлення парушаных правоў, іх судовай абароны (артыкул 2).

Пры ўстанаўленні грамадзянска-прававой адказнасці за невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў заканадаўца вызначае падставы і ўмовы грамадзянска-прававой адказнасці, у тым ліку за невыкананне грашовага абавязацельства. Так, згодна з пунктам 1 артыкула 366 ГК за карыстанне чужымі грашовымі сродкамі ў выніку іх неправамернага ўтрымання, ухілення ад іх вяртання, іншага пратярмінавання ў іх выплаце або беспадстаўнага атрымання або зберажэння за кошт іншай асобы падлягаюць выплаце працэнты на суму гэтых сродкаў. Памер працэнтаў вызначаецца стаўкай рэфінансавання Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь на дзень выканання грашовага абавязацельства або яго адпаведнай часткі, за выключэннем спагнання доўгу ў судовым парадку, калі суд задавальняе патрабаванне крэдытора зыходзячы са стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка на дзень вынясення рашэння. Гэтыя правілы прымяняюцца, калі іншы памер працэнтаў не вызначаны заканадаўствам або дагаворам. У выпадку, калі грашовае абавязацельства ў адпаведнасці з заканадаўствам падлягае аплаце ў беларускіх рублях у памеры, эквівалентным вызначанай суме ў замежнай валюце або ва ўмоўных грашовых адзінках, працэнты налічваюцца на суму, якая падлягае аплаце ў беларускіх рублях, вызначаную па афіцыйнаму курсу адпаведнай валюты або ўмоўных грашовых адзінак на дзень выканання грашовага абавязацельства або яго адпаведнай часткі, а ў выпадку спагнання доўгу ў судовым парадку — на дзень вынясення рашэння судом.

У пункце 2 артыкула 366 ГК прадугледжана, што калі страты, прычыненыя крэдытору неправамерным карыстаннем яго грашовымі сродкамі, або сума доўгу, павялічаная з улікам інфляцыі, перавышаюць суму працэнтаў, належных яму на падставе пункта 1 дадзенага артыкула, то ён мае права патрабаваць ад даўжніка пакрыцця страт або доўгу, павялічанага з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае гэту суму.

У звароце суб'екта гаспадарання, растлумачана, што, прымаючы да ўвагі ажыццяўленне прадпрымальніцкай дзейнасці яе ўдзельнікамі на аснове прынцыпу свабоды дагавору (артыкулы 2, 391 ГК), суб'екты гаспадарання маюць права прымаць меры, накіраваныя на зніжэнне рызык. Да ліку такіх мер адносіцца магчымасць узгаднення пры заключэнні дагавораў, нароўні з іншымі спосабамі абароны, умоў, механізма прымянення і разліку індэксацыі сумы асноўнага доўгу (кошту выкананых і прынятых будаўнічых работ) у выпадку пратярмінавання яго выплаты, калі іншае не ўстаноўлена заканадаўствам (пункт 18). Дадзеная пастанова Пленума Вышэйшага Гаспадарчага Суда прынята з улікам пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2011 г. № 875 «О внесении изменений в постановление Совета Министров Республики Беларусь от 15 сентября 1998 г. № 1450», у адпаведнасці з якой Правілы заключэння і выканання дагавораў (кантрактаў) будаўнічага падраду выкладзены ў новай рэдакцыі.

Па інфармацыі Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, пры вырашэнні спрэчак аб спагнанні доўгу, павялічанага з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных крэдытору на падставе пункта 1 артыкула 366 ГК, разлік інфляцыйных страт праводзіцца агульнымі судамі на падставе індэкса спажывецкіх цэн. У выпадках, прадугледжаных нарматыўнымі прававымі актамі і (або) дагаворамі, агульнымі судамі прымяняецца індэкс змянення цэн на будаўніча-мантажныя работы, які штомесяц публікуецца Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь.

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь лічыць, што на падставе артыкулаў 2 і 391 ГК удзельнікі грамадзянскіх правадносін набываюць і ажыццяўляюць свае грамадзянскія правы сваёй воляй і ў сваіх інтарэсах. Яны свабодныя ва ўстанаўленні сваіх правоў і абавязкаў на аснове дагавору і ў вызначэнні любых умоў дагавору, якія не супярэчаць заканадаўству. У сувязі з гэтым механізм прымянення і разлік індэксацыі могуць быць узгоднены грамадзянамі і суб'ектамі гаспадарання пры заключэнні дагавору. У мэтах вызначэння памеру інфляцыі па сэнсу артыкула 366 ГК могуць выкарыстоўвацца індэкс спажывецкіх цэн, індэкс цэн вытворцаў на прамысловую прадукцыю, індэксы змянення цэн на будаўніча-мантажныя работы і інш.

Пазіцыя Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь заснавана на тым, што паколькі прадметам Закона аб індэксацыі з'яўляецца індэксацыя даходаў фізічных асоб з бюджэтных крыніц — дапамог, стыпендый, заработнай платы па месцы работы, грашовага забеспячэння, то дадзены Закон не накіраваны на рэгуляванне грамадзянска-прававых адносін. У сувязі з гэтым Міністэрства юстыцыі лічыць, што прымяненне норм Закона аб індэксацыі пры разліку сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, з'яўляецца аналогіяй закона і можа ажыццяўляцца толькі ў дачыненні да фізічных асоб.

Нацыянальны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь паведаміў, што ў адпаведнасці з артыкулам 11 Закона аб індэксацыі гэты Камітэт разлічвае і публікуе штомесяц за справаздачны месяц у дачыненні да розных перыядаў індэкс спажывецкіх цэн, які з'яўляецца паказчыкам інфляцыі ў спажывецкім сектары Рэспублікі Беларусь. Устанаўленне парадку прымянення індэксаў цэн не для статыстычных мэт у кампетэнцыю Нацыянальнага статыстычнага камітэта не ўваходзіць.

3. Агульны парадак індэксацыі даходаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія маюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь даходы ў грашовых адзінках Рэспублікі Беларусь, у сувязі з інфляцыяй, што выклікаецца ростам цэн на спажывецкія тавары і паслугі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, рэгулюецца Законам аб індэксацыі. Згодна з артыкулам 1 гэтага Закона страты, выкліканыя інфляцыяй, часткова кампенсуюцца фізічным асобам, якія атрымліваюць грашовыя даходы, што не маюць аднаразовага характару, з бюджэтных крыніц (дапамогі, стыпендыі, заработная плата па месцы работы, грашовае забеспячэнне). Фізічным асобам, якія атрымліваюць грашовыя даходы на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з іншых крыніц, пакрыццё страт ад інфляцыі можа ажыццяўляцца за кошт сродкаў арганізацый па падставах, прадугледжаных калектыўнымі дагаворамі (пагадненнямі). Індэксацыя даходаў фізічных асоб, якія атрымліваюць грашовыя даходы з бюджэтных крыніц, праводзіцца на падставе індэкса спажывецкіх цэн (артыкулы 1, 2 Закона аб індэксацыі).

Індэкс спажывецкіх цэн як паказчык змянення ў часе кошту фіксаванага набору тавараў і паслуг, якія фактычна спажываюцца насельніцтвам, разлічваецца ў адпаведнасці з Методыкай разліку зводнага індэкса спажывецкіх цэн на тавары і платныя паслугі насельніцтву, зацверджанай пастановай Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь ад 14 лістапада 2008 г. № 412.

Індэксы цэн вытворцаў на прамысловую прадукцыю разлічваюцца ў адпаведнасці з Методыкай па разліку зводнага індэкса цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі, зацверджанай пастановай Нацыянальнага статыстычнага камітэта Рэспублікі Беларусь ад 30 лістапада 2010 г. № 247. Згодна з дадзенай Методыкай зводны індэкс цэн вытворцаў вызначаецца па відах эканамічнай дзейнасці, па прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, інвестыцыйных, прамежкавых і спажывецкіх таварах і асобных таварах і таварных групах і адлюстроўвае дынаміку цэн на тавары, адгружаныя на ўнутраны рынак, якія выпускаюць арганізацыі рэспублікі, без уліку падатку на дабаўленую вартасць, акцызаў і іншых падаткаў і выплат з выручкі (пункт 3).

На практыцы індэкс цэн вытворцаў на прамысловую прадукцыю выкарыстоўваецца таксама для правядзення пераацэнкі асноўных сродкаў. Так, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 кастрычніка 2006 г. № 622 «О вопросах переоценки основных средств, не завершенных строительством объектов и неустановленного оборудования» пераацэнка (змяненне кошту) асноўных сродкаў, якія лічацца ў бухгалтарскім уліку ў складзе пазабаротных актываў, не завершаных будаўніцтвам аб'ектаў і неўстаноўленага абсталявання ажыццяўляецца арганізацыямі пры ўмове дасягнення індэкса цэн вытворцаў прамысловай прадукцыі вытворча-тэхнічнага прызначэння, які падлічваецца і публікуецца Нацыянальным статыстычным камітэтам за кастрычнік бягучага года да месяца, што папярэднічае даце апошняй пераацэнкі, велічыні 103 працэнтаў і больш (падпункт 1.1.1 пункта 1).

Змяненне кошту будаўніча-мантажных работ у сувязі з інфляцыяй вызначаецца на падставе індэксаў змянення кошту будаўніча-мантажных работ, якія распрацоўваюцца і зацвярджаюцца Міністэрствам архітэктуры і будаўніцтва.

Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 14 верасня 2006 г. № 1207 «О мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 15 июня 2006 г. № 396» зацверджана Палажэнне аб парадку вяртання дольшчыкам грашовых сродкаў пры спыненні ўдзелу ў долевым будаўніцтве жылых і (або) нежылых памяшканняў у шматкватэрным жылым доме і звязаных з ім аб'ектаў нерухомасці. Пунктам 5 дадзенага Палажэння ўстаноўлена, што ў выпадку добраахвотнага выхаду або выключэння інвестара са складу ўдзельнікаў долевага будаўніцтва (арганізацыі забудоўшчыкаў) упаўнаважаны орган (агульны сход членаў арганізацыі забудоўшчыкаў) прымае рашэнне аб выключэнні яго з гэтага складу і вяртанні ўнесеных грашовых сродкаў па прынależнасці. Сума вяртаемых грашовых сродкаў падлягае індэксацыі ў парадку, прадугледжаным дадзеным Палажэннем, з уліку дня аднаўлення індэкса змянення кошту будаўніча-мантажных работ, зацверджанага на дату выплаты.

Правілы заключэння і выканання дагавораў (кантрактаў) будаўнічага падраду, зацверджаныя пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 15 верасня 1998 г. № 1450, да ўнясення ў іх змяненняў пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2011 г. № 875 было ўстаноўлена, што пры парушэнні заказчыкам тэрмінаў пераліку выплат за выкананыя работы іх аплата праводзіцца з улікам змянення кошту будаўніча-мантажных работ у сувязі з інфляцыяй на момант фактычных расходаў, калі іншае не прадугледжана дагаворам падраду (пункт 46). У новай рэдакцыі Правілаў заключэння і выканання дагавораў будаўнічага падраду, якая ўступіла ў сілу 21 кастрычніка 2011 г., не прадугледжана змяненне кошту будаўнічых работ у сувязі з інфляцыяй на момант фактычных разлікаў пры парушэнні тэрмінаў іх аплаты.

З выкладзенага вынікае, што ў заканадаўстве Рэспублікі Беларусь устаноўлены выпадкі і памеры індэксацыі ў сувязі з інфляцыяй для асобных відаў праваадносін. Таму пры вырашэнні судовых спрэчак неабходна ўлічваць спецыфіку спраў, падведамных гаспадарчым судам, якія звязаны з ажыццяўленнем прадпрымальніцкай і іншай эканамічнай дзейнасці і адрозніваюцца ад спраў, што разглядаюцца агульнымі судамі, як па характару спрэчных адносін, так і па суб'ектнаму складу ўдзельнікаў судовай спрэчкі. Акрамя таго, зыходзячы з прынцыпу свабоды дагавору, бакі могуць па ўзаемнаму пагадненню прадугледзець у дагаворы магчымасць індэксацыі і механізм яе прымянення, калі заканадаўцам дадзенае пытанне не рэгламентавана.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, аналіз канстытуцыйнаправавога зместу прыведзеных палажэнняў нарматыўных прававых актаў сведчыць аб тым, што індэксацыя ў сувязі з інфляцыяй у Рэспубліцы Беларусь можа праводзіцца ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам або дагаворам.

4. У грамадзянскім заканадаўстве вызначаюцца прававое палажэнне ўдзельнікаў грамадзянскага абароту, падставы ўзнікнення і парадак ажыццяўлення права ўласнасці і іншых рэчавых правоў, правоў на вынікі інтэлектуальнай дзейнасці, рэгулююцца адносіны паміж асобамі, якія ажыццяўляюць прадпрымальніцкую дзейнасць, або з іх удзелам, дагаворныя і іншыя абавязацельствы, а таксама іншыя маёмасныя і звязаныя з імі асабістыя немаёмасныя адносіны (частка першая пункта 1 артыкула 1 ГК).

У пункце 2 артыкула 366 ГК вызначана права крэдытора па грашоваму абавязацельству патрабаваць ад даўжніка пакрыцця сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных яму на падставе пункта 1 гэтага артыкула. Разам з тым рэалізацыя дадзенага права крэдытора не забяспечана замацаваннем у грамадзянскім заканадаўстве норм, што ўстанаўліваюць, у якіх выпадках магчыма індэксацыя сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, для ўсіх грашовых абавязацельных праваадносін. У выніку ўзнікла прававая нявызначанасць для ўдзельнікаў грамадзянскіх праваадносін пры рэалізацыі імі права, прадугледжанага ў пункце 2 артыкула 366 ГК, на пакрыццё сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, у частцы вызначэння памеру падлягаючых пакрыццю грашовых сродкаў з улікам інфляцыі.

Канстытуцыйны Суд прыходзіць да высновы аб тым, што адсутнасць належнага прававога рэгулявання разглядаемых адносін цягне парушэнне маёмасных інтарэсаў крэдыторaў у дачыненні да магчымасці атрымання доўгу, павялічанага з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных яму на падставе пункта 1 артыкула 366 ГК; параджае неадназначнае разуменне закона і адпаведна адсутнасць аднастайнасці ў яго прымяненні. Гэта супярэчыць канстытуцыйнаму прынцыпу вяршэнства права, з якога вынікае прынцып прававой дакладнасці, які мае на ўвазе лагічную ўзгодненасць прававых норм у сістэме дзеючага прававога рэгулявання, дакладнасць, несупярэчлівасць і яснасць іх прымянення.

Па меркаванню Канстытуцыйнага Суда, устараненне наяўнай прававой недакладнасці магчыма шляхам прамога ўказання ў пункце 2 артыкула 366 ГК на пакрыццё сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных крэдытору на падставе пункта 1 артыкула 366 ГК, у выпадках, прадугледжаных заканадаўствам або дагаворам.

Устараненне прававой недакладнасці ў прававым рэгуляванні адносін, звязаных з абаронай маёмасных інтарэсаў крэдытора, грашовымі сродкамі якога неправамерна карыстаўся даўжнік, будзе садзейнічаць забеспячэнню рэалізацыі канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і роўнасці ўсіх перад законам.

На падставе выкладзенага, кіруючыся часткай першай артыкула 116 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, артыкуламі 22 і 24 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб судаўладкаванні і статусе суддзяў, Канстытуцыйны Суд Рэспублікі Беларусь

ВЫРАШЫЎ:

1. Прызнаць неабходным у мэтах забеспячэння канстытуцыйных прынцыпаў вяршэнства права і роўнасці ўсіх перад законам устараніць у прынцыпе 2 артыкула 366 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь прававую недакладнасць, устанавіўшы магчымасць пакрыцця сумы доўгу, павялічанай з улікам інфляцыі, у частцы, якая перавышае суму працэнтаў, належных на падставе пункта 1 гэтага артыкула, з прымяненнем індэксацыі ў выпадках, прадугледжаных заканадаўствам або дагаворам.

2. Прапанаваць Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь падрыхтаваць праект закона аб унясенні адпаведных змяненняў і дапаўненняў у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь і ўнесці яго ва ўстаноўленым парадку ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

3. Гэта рашэнне ўступае ў сілу з дня прыняцця.

4. Апублікаваць гэта рашэнне ў адпаведнасці з заканадаўствам.

Старшынствуючы — Старшыня Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь П.П. МІКЛАШЭВІЧ

31 кастрычніка 2012 г., г. Мінск № Р-777/2012

■ Як жывяце, землякі?

У РЭГІЁНЕ

Брэстчына

КІНЬ КУРЫЦЬ — ВЫЙДЗІ НА ПРАГУЛКУ!

Пінчане прапануюць аб'явіць «сцежку здароўя» свабоднай ад курэння тэрыторыяй

У Пінску па ініцыятыве цэнтральнай паліклінікі пачаў рэалізоўвацца міжнародны праект папулярызацыі хады «Прагулка з урачом» як эфектыўны метад барацьбы з захворваннямі сэрца і сасудаў. Стартаваў праект напярэдадні 915-годдзя палескай сталіцы.

Цяпер кожную пятніцу аматары хады маюць намер пераадольваць адлегласць ад плошчы Леніна праз набярэжную да Лядовага палаца. Акцыя паступова становіцца традыцыйнай. Яе ўдзельнікі ўжо вылучылі прапановы па барацьбе з курэннем ў Пінску. Для прапаганды здаровага ладу жыцця прапануецца абвясціць «сцежку здароўя» свабоднай ад курэння тэрыторыяй, пазначыўшы яе адпаведнымі знакамі.

Алег ДАЛМАТОЎСКІ.

Віцебшчына

СТАРАДАЎНЯЕ ВЯСЕЛЛЕ НА СТАГОДДЗІ

У Дубровенскім раёне адбыўся абласны конкурс вясельных абрадаў «Вялікая вясельніца-2012»

У конкурсе бралі ўдзел фальклорныя калектывы Віцебскай вобласці, якія прадставілі вясельныя песні і традыцыйныя вясельныя абрады Прыдзвінскага краю.

На гэтым цікавым мерапрыемстве працавалі выставы вясельнай атрыбутыкі дамоў рамёстваў, кніжная — «Беларускае вяселле», вясельных фотаздымкаў. Усе ахвотныя маглі пакаштаваць і купіць вясельныя стравы. Удзельнікі конкурсу паказалі аўтэнтычныя абрады.

Цікава, што ў дзень правядзення конкурсу ў раённым аддзеле ЗАГСа прайшла ўрачыстая рэгістрацыя шлюбу з элементамі традыцыйнай беларускай абраднасці. Маладых потым запрасілі ў дом рамёстваў, дзе яны сваімі рукамі зрабілі сімвалічны збан кахання і дабрабыту. На памяць аб гэтым новаспечанай сям'і падарылі памятны сертыфікат, а таксама абярэг, каб ахоўваў мужа і жонку ад сварак і прыносіў шчасце ў дом.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Гомельшчына

АБЕД ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ПРАЦЫ

Асобы без пэўнага месца жыхарства сёння працавалі на добраўпарадкаванні парку

Прадстаўнікі праваахоўных органаў займаліся дастаўкай да месца працы (парк «Лешчынец», што ў Савецкім раёне Гомеля) гэтых грамадзян. Ім прадастаўлены неабходны інструмент, каб пазбавіць ад апошняга лісця тэрыторыю парку каля воінскай часці.

Тым, каму патрэбна медыцынская дапамога, яе акажуць валанцёры-медыкі. Прадстаўнікі мясцовага аддзялення грамадскай арганізацыі «Чырвоны крыж» паклапаціліся пра тое, каб усе, хто прымае ўдзел у грамадскіх работах, былі сытыя — пасля работы ім прапануюць бясплатныя абеды. Дарэчы, як расказала начальнік аддзела ідэалогіі адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля Юлія Собаль, акцыі па дапамозе бяздомным праводзіліся і раней. Упершыню вырашылі паспрабаваць выкараніць у гэтай групы насельніцтва ўтрыманскі настрой і стымуляваць людзей да працы. Калі вопыт пройдзе з поспехам, магчыма, прыцягненне асоб без пэўнага месца жыхарства да карыснай працы будзе неаднаразовым.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Гродзеншчына

КОЛЬКІ СЕЛЬГАСПРАДПРЫЕМСТВАЎ — СТОЛЬКІ І СЕЛЬСАВЕТАЎ?

Астравецкі райвыканкам прапанаваў грамадзянам выказаць сваё меркаванне па пытанні адміністрацыйна-тэрытарыяльных змяненняў

Склалася так, што цяпер у раёне пяць сельскагаспадарчых прадпрыемстваў і дзевяць сельсаветаў. Напрыклад, такая сітуацыя: на тэрыторыі двух сельскіх Саветаў — адно прадпрыемства. Альбо адзін сельсавет і два сельгаскааператывы. Наколькі гэта апраўдана?

Адміністрацыйна-тэрытарыяльная аптымізацыя накіравана на тое, каб колькасць сельсаветаў адпавядала колькасці сельгаспрадпрыемстваў, без якіх у сённяшніх рэаліях немагчыма вырашэнне многіх надзённых пытанняў у інтарэсах мясцовых жыхароў, прычым не толькі працаўнікоў гэтых гаспадарак. Мяркуецца, у прыватнасці, аб'яднанне двух сельсаветаў у адзін (у трох выпадках), а таксама ўключэнне ў гарадскую рысу Астраўца шэрагу навакольных населеных пунктаў.

Ці будзе гэтая аптымізацыя садзейнічаць больш эфектыўнай працы першасных органаў улады і як зрабіць так, каб у сялян не з'явіліся нязручнасці ў вырашэнні тых ці іншых пытанняў? Меркаванні і прапановы можна дасласць альбо звычайным лістом, альбо электронным на афіцыйны сайт райвыканкама.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Міншчына

КОЖНАЯ ДРУГАЯ СЯМ'Я РАСПАДАЕЦЦА

У сталічнай вобласці на тысячу шлюбаў сёлета прыпадае 512 разводаў

8778 пар у студзені—верасні ўступілі ў шлюбныя адносіны, што на 7,2% менш у параўнанні з леташнім узроўнем. Колькасць разводаў у цэнтральным рэгіёне краіны павялічылася на 8%: распаўся 4491 сямейны саюз. На 1 тысячу зарэгістраваных шлюбаў у студзені—верасні гэтага года прыпадае 512 разводаў (летась за гэты перыяд — 440 разводаў).

Ёсць і прыемная навіна: адзначаецца рост нараджальнасці ў сталічнай вобласці — 13 тыс. 146 дзяцей нарадзіліся сёлета ў студзені—верасні, што на 5,4% больш у параўнанні з аналагічным леташнім перыядам.

Ігар МІХАСЕВІЧ.

Магілёўшчына

ЭНЕРГІЯ СОНЕЧНАЙ ЧЭРЫКАЎШЧЫНЫ

Парк сонечных батарэй пабудуюць на забруджаных радыяцыяй землях Чэрыкаўскага раёна

Пратакол аб намерах падпісаны паміж аддзелам энергетыкі, паліва і энергазберажэння Магілёўскага аблвыканкама і нямецкай кампаніяй «Pure Energy».

— Прамыя замежныя інвестыцыі складуць 20 мільёнаў еўра, — паведаміў начальнік аддзела Мікалай Юркоў. — Гэта выгадны праект для нямецкай фірмы, таму што электраэнергію, якую выпрацуе сонечны парк, будуць прадаваць у агульную энергасістэму па трайным тарыфе на працягу першых дзесяці гадоў.

Сонечныя батарэі плануецца ўсталяваць на плошчы ў дзве сотні гектараў. Гэта землі, выведзеныя з сельскагаспадарчага абароту з-за высокага радыяцыйнага забруджвання. Сёння гэта будзе самы сучасны сонечны парк у Беларусі: яго магчымая магутнасць, у залежнасці ад надвор'я, можа дасягаць 50 МВт у гадзіну. Гэтай энергіі хопіць, напрыклад, для забеспячэння ўсяго Чэрыкаўскага раёна.

У Магілёўскай вобласці цяпер ёсць толькі адзін рэалізаваны праект па выкарыстанні сонечнай энергіі. У раёне вёскі Жукава Магілёўскага раёна, дзе ўсталяваны ветракі, ёсць і невялікая сонечная панэль. Аднак яе магутнасць — толькі да 100 КВт у гадзіну — несупастаўляльная з новымі грандыёзнымі планамі на Чэрыкаўшчыне.

Ілона ІВАНОВА

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельоблстрой» (продавец)

извещает о проведении 18 декабря 2012 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16

№ лота	Наименование	Адрес объектов	Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб.	Задаток, с учетом НДС, бел. руб.
1	Двухэтажное кирпичное здание растворо-бетонного узла с двумя галереями и двумя бункерами с инвентарным номером 320/С-15039, площадью 285,7 кв.м; двухэтажное кирпичное здание ремонтно-механических мастерских с пятью гаражными боксами с пристроенной кузницей и подъездной дорогой с инвентарным номером 320/С-15034, площадью 1002,6 кв.м; одноэтажное кирпичное здание склада цемента с четырмя стальными емкостями и повышенным путем с инвентарным номером 320/С-15035, площадью 45,7 кв.м; одноэтажное кирпичное здание склада с пристроенным навесом с инвентарным номером 320/С-15033, площадью 1391,3 кв.м; одноэтажное кирпичное здание котельной с инвентарным номером 320/С-15037, площадью 105,8 кв.м; кабельная линия 10кВт с инвентарным номером 320/С-25843, протяженностью 1214,3 м; двухэтажное кирпичное здание растворо-бетонного узла, находящегося в стадии незавершенной реконструкции с пристроенным кирпичным гаражом с инвентарным номером 320/С-15040, площадью 431,5 кв.м; одноэтажное кирпичное здание проходной с инвентарным номером 320/С-16765, площадью 38,1 кв.м; одноэтажное кирпичное здание пилорамы с инвентарным номером 320/С-15036, площадью 439,0 кв.м; трансформаторная подстанция № 711 с инвентарным номером 320/С-25865, площадью 28,5 кв.м.	Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Ленинградская, 1а	851 000 000	85 000 000

Продавец: Открытое акционерное общество «Гомельоблстрой», ул. Малайчука, 12, 246032, г. Гомель.

Имущество расположено по адресу: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Ленинградская, 1а. **Шаг аукциона – 5 %.**

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет продавца (ОАО «Гомельоблстрой») р/с 3012200210018 в филиале ОАО БАПБ – Гомельском областном управлении в г. Гомеле, МФО 151501912, УНП 400051693 **по 14 декабря 2012 года в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель от даты опубликования настоящего извещения **по 14 декабря 2012 в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.**

Для обслуживания производственной базы будет выделен земельный участок с кадастровым номером 340800000001000084 площадью 4,1864 га.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах.

В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок, определенный в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2012 г.

Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74-18-78, 74-11-24 и на сайте gomeloblreklama.by.

ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
проводит повторный аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Наличие инженерных сетей	Начальная цена, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Расходы по изгот. документации, бел. руб.
1	д. Веснино кадастровый № 623286301101000078	0,15	Вода – 100 м. Электр. 10 м	18446400	2766960	4873405
2	д. Веснино кадастровый № 623286301101000079	0,125	Вода – 100 м. Электр. 10 м	14818610	2222790	4873405

Аукцион проводится 17 декабря 2012 года в 10.00 в здании Совета, документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресенья, по 11 декабря 2012 года включительно. Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО АСБ «Беларусбанк» код 153001601. УНН 600181707. Код платежа 04901. Получатель Остроширицкий сельисполком.

Победитель обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок, код платежа 04901, и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, код платежа 04616.

Телефоны для справок: 8 01774 57 6 21, 57 6 35, 57 6 36.

УНП 600023902

Информационное сообщение о проведении аукциона по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в деревнях Старина, Загорье, Черниковщина ЗАБОЛОТСКОГО СЕЛЬСОВЕТА СМОЛЕВИЧСКОГО РАЙОНА Минской области

1	Форма проведения аукциона	Открытый
2	Дата, время и место проведения аукциона	17 декабря 2012 года, в 11.00, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, 1-а, Заболотский сельисполком, зал заседаний
3	Продавец и его адрес	Заболотский сельский исполнительный комитет, аг. Заболотье, ул. Купрейчика, д. 1-а
4	Земельный участок, его кадастровый номер и адрес	**Лот № 1 –** площадь 0,1408 га № 624882003101000146, д. Загорье **Лот № 2 –** площадь 0,2181 га № 624882006601000184 д. Старина **Лот № 3 –** площадь 0,1474 га № 624882007101000292 д. Черниковщина
5	Условия продажи	Без изменения целевого назначения
6	Целевое назначение земельного участка	Для строительства и обслуживания жилого дома
7	Начальная (стартовая) цена продажи	**Лот № 1 –** 30 000 000 рублей **Лот № 2 –** 63 612 000 рублей **Лот № 3 –** 25 860 000 рублей
8	Условия аукциона	А) продажа по цене не ниже начальной Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь
9	Наличие инженерной инфраструктуры	д. Старина – подъезд к участку, газификация, энергоснабжение, водопровод, д. Черниковщина – газификация, подъезд к участку, д. Загорье – энергоснабжение, подъезд к участку
10	Условия оплаты	За безналичный расчет в течение 5-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона
11	Сумма задатка и реквизиты продавца	10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, получатель Заболотский сельисполком, р/с 3641018050090 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»)
12	Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками	Каждый вторник в 10.00
13	Окончательный срок приема документов	11 декабря 2012 года в 17.00
14	Контактный телефон	8 01776 43 7 38, 43 0 16, 55 3 42

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.

3. Физическим лицам – документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, и доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

ХОЗЯЙСТВЕННЫЙ СУД ГОРОДА МИНСКА

объявляет о проведении публичных торгов по продаже имущества, принадлежащего ЧСУП «СВК-Компани»

Лот № 1. Легковой Джип Hyundai Santa Fe, 2002 г.в., госномер 9717 МК-7, черного цвета, № кузова KMHSC81DP2U249754, начальной стоимостью 51 926 000 (Пятьдесят один миллион девятьсот двадцать шесть тысяч) белорусских рублей.

Минимальная величина первого шага составляет 5% от стоимости реализуемого с торгов имущества, что составляет 2 596 300 (Два миллиона пятьсот девяносто шесть тысяч триста) белорусских рублей.

Данное имущество является предметом залога.

Подробная информация об имуществе размещена на сайте: http://minsk.court.by/, а также в помещении хозяйственного суда г. Минска: г. Минск, ул. Академическая, 15/1.

Торги состоятся 11.12.2012 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Академическая, 15/1, каб. 201.

За дополнительной информацией обращаться: судебный исполнитель Ляхова Е.Ю., тел./факс: 8 (017) 294 93 56, 8 (029) 177 32 52 ст. судебный исполнитель Вярьвильский Д.А., тел 294 93 67.

Задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (лота) должен быть перечислен на депозитный счет № 3642900000072 в ОАО «АСБ Беларусбанк» Минск, код 795, УНП 101541763 хозяйственного суда города Минска не позднее чем за 24 часа до начала проведения торгов.

В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 г. № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги.

Извещение о проведении 17 декабря 2012 г. аукциона по продаже в частную собственность земельных участков для индивидуального жилищного строительства в ЧЕРНАВЧИЦКОМ СЕЛЬСКОМ СОВЕТЕ Брестского района Брестской области

№ лота	Предмет аукциона	Площадь, га	Начальная стоимость земельного участка, бел. руб.	Задаток (бел. руб.)	Целевое назначение земельных участков
1	Земельный участок в аг. Вистычи, ул. Луговая, 22	0,1567	16 759 629	1 675 962	строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома
2	Земельный участок в д. Смуга, ул. Озерная, 3	0,1498	7 625 688	762 568	
3	Земельный участок в д. Дружба, ул. Новая, 6А	0,1075	8 431 508	843 150	

Аукцион будет проводиться 17.12.2012 в 11.00 по адресу: Брестский район, аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Чернавчицкого сельисполкома № 3600213110108 в филиале 100 АСБ «Беларусбанк» код 246 УНП 200676206, код платежа 4901 залога в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением документации, необходимой для его проведения, осуществляется победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: аг. Чернавчицы, ул. Сикорского, 22 (здание сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 11 декабря 2012 года.

Контактные телефоны: 94 51 35, 94 51 36.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Минский городской территориальный фонд государственного имущества извещает о проведении открытого аукциона по продаже объекта государственной собственности и права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества (далее – аукцион) 20 декабря 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.

Организатор аукциона: Минский городской территориальный фонд государственного имущества, г. Минск, пр. Независимости, 8, конт. тел. (017) 200 20 89, каб 227.

На аукцион выставляется:

Предмет аукциона	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение и право заключения договора аренды земельного участка для его обслуживания
Место нахождения недвижимого имущества	г. Минск, ул. Тростенецкая, д. 11
Начальная цена предмета аукциона	**8 810 030 403** белорусских рубля (в том числе: начальная цена недвижимого имущества – 6 542 054 323 белорусских рубля, начальная цена права заключения договора аренды земельного участка – 2 267 976 080 белорусских рублей)
Размер задатка, срок и порядок его внесения, реквизиты расчетного счета	**1 700 000 000** белорусских рублей до подачи заявления на участие в аукционе вносятся на р/с 3642900000870 в ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, код 153001795, УНП 100048181 Минского городского территориального фонда государственного имущества, **назначение платежа – задаток для участия в аукционе**
Продавец недвижимого имущества	Белорусский государственный университет, 220030, г. Минск, просп. Независимости, 4, конт. тел. (017) 209 54 20, 209 59 82
Информация о земельном участке для обслуживания продаваемого недвижимого имущества	Общая площадь – 0,9690 га, кадастровый номер – 500000000003003954, вид вещного права – право аренды земельного участка, срок аренды – 5 лет
Характеристика недвижимого имущества	Представляет собой незавершенный строительством «Магазин наглядных пособий и учебного оборудования»; начало строительства – 1997 г., остановка – 2001 г. состоит из трех сблокированных между собой зданий общей площадью – 17740 кв.м, в том числе: - двух 5-этажных складских корпусов с сеткой колон 6х6 и высотой 6 м, где расположены складские помещения общей площадью 4862 кв.м; - одного 2-этажного, где расположены административно-бытовые помещения, 2 магазина площадью 312 кв.м и 38 кв.м, насосная, механическая мастерская, экспедиция и другие помещения; степень готовности – 65%
Условия использования недвижимого имущества	Без условий
Условия использования земельного участка	В соответствии с регламентами генерального плана г. Минска – для дальнейшего использования объекта под размещение производственных объектов малого бизнеса, предприятий бытового обслуживания, сервисного обслуживания автомобилей, административных зданий, проектно-исследовательских организаций, кредитно-финансовых учреждений, предприятий связи, офисов, издательств, предприятий торговли, общественного питания, а также предприятий иных объектов, размещение которых не противоречит функциональному назначению территории и генеральному плану
Условия по продаже недвижимого имущества	Возместить РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» стоимость работ по изготовлению ведомости технических характеристик объекта в размере 23 874 050 рублей на р/с 3012016353515 в отделении № 535 г. Минск ОАО «Белинвестбанк», УНП 807000028, ОКПО 37558116, код банка 153001739, адрес банка: 220033, г. Минск, просп. Партизанский, 6а

Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и земельного участка в частную собственность или права заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

Заявления на участие в аукционе с прилагаемыми документами принимаются по адресу: г. Минск, пр. Независимости, 8, каб. 227, по рабочим дням с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. Последний день приема заявлений – 18 декабря 2012 года включительно.

К участию в аукционе допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), консолидированные участники (два и более субъекта малого предпринимательства – индивидуальные предприниматели и (или) микроорганизации), представившие Организатору аукциона в сроки, указанные в извещении на участие в аукционе следующие документы:

заявление на участие в аукционе по установленной форме;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе заявитель (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляют документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 дня до даты его проведения.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником (далее – претендент на покупку), предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Победителю аукциона (претенденту на покупку) в день проведения аукциона выдается копия протокола.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения Организатором аукциона протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским горисполкомом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке установленном решением Минского горисполкома от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским горисполкомом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении Минского горисполкома об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский горисполком копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский горисполком передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей может быть предоставлена при заключении договора купли-продажи по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Извещение о проведении аукциона размещено на официальных Интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (www.minsk.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www.gki.gov.by).

Осмотр объекта на местности участниками аукциона производится Продавцом.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ ЧУП «ГОМЕЛЬСКИЙ ЗАВОД ТОРГОВОГО ОБОРУДОВАНИЯ»

Организатор аукциона: Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, 1001. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, 226 91 19, 226 99 22.

Аукцион проводится **19 декабря 2012 г.** в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз, утвержденным постановлением Правления Белкоопсоюза от 08 мая 2012 № 146.

Сведения о предмете аукциона (продается одним лотом):

здание зала выставки образцов (общей площадью 366,2 кв.м, инв. № 350/С-54668) и асфальтовая площадка (общей площадью 2400,0 кв.м, инв. № 350/С-56246), расположенные на земельном участке площадью 0,2420 га с кадастровым номером 340100000005006281 (право постоянного пользования);

здание ангара «Смоленский-1», инвентарный № 350/С-54086 (общей площадью 410,0 кв. м), расположенное на земельном участке площадью 0,2078 га с кадастровым номером 340100000005005900 (право постоянного пользования);

склад ГСМ (общей площадью 29,6 кв.м, инв. № 350/С-54088), расположенный на земельном участке площадью 0,3291 га с кадастровым номером 340100000005006282 (право постоянного пользования).

Имущество расположено по адресу: г. Гомель, ул. Владимирова, 12.

Начальная цена — 1 740 000 000 (один миллиард семьсот сорок миллионов) белорусских рублей с НДС.

Сумма задатка — 174 000 000 (сто семьдесят четыре миллиона) белорусских рублей.

Здание зала выставки образцов и здание ангара «Смоленский-1» обременены договорами аренды.

Земельные участки, на которых расположены здание зала выставки образцов, асфальтовая площадка и склад ГСМ, обременены соглашением об установлении сервитута.

Условия продажи — нет.

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты, связанные с организацией и проведением аукциона. После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) названных платежей продавец заключает с ним договор купли-продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок и условия оплаты за объекты: определяются по согласованию победителя торгов с собственником имущества при заключении договора купли-продажи.

Задаток перечисляется ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза», р/с 3015201080017, УНН 100060419 ОКПО 14586268, ф-л МГД ОАО «Белагрmaпромбанк» г. Минска, код 963.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17 часов 30 минут 17 декабря 2012 г.

Сведения о продавце: Частное производственное унитарное предприятие «Гомельский завод торгового оборудования», 246034, г. Гомель, ул. Владимирова, 12. Тел. (029) 170 52 95, (0232) 42 20 54.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о перечислении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в Извещении;

индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица, копия устава (учредительного договора — для коммерческой организации, действующей только на основании учредительного договора), без нотариального засвидетельствования и подлинник этого документа для проверки его соответствия копии;

индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык;

юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть оформлена не ранее чем за шесть месяцев до даты подачи заявления) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица — также документ, подтверждающий его полномочия.

Представителем заявителя (кроме случая, когда юридическое лицо представляет его руководитель) предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости (для представителя иностранного юридического лица) легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ ЧУП «МИНСКАЯ МЕЖРАЙБАЗА ОПС»

Организатор аукциона: Частное унитарное предприятие «Научно-производственный центр Белкоопсоюза» (далее по тексту — ЧУП «НПЦ Белкоопсоюза»), г. Минск, пр-т Победителей, 17, каб. 1004а, 1001, с 8.30 до 12.30 и с 13.30 до 17.30 в рабочие дни. Прием документов заканчивается в 17 часов 30 минут 17 декабря 2012 г. Тел. (029) 318 37 22, (017) 226 99 92, (017) 226 91 19, (017) 226 99 22.

Аукцион проводится **21 декабря 2012 г.** в 11 часов 00 минут по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 17 в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества организаций потребительской кооперации, собственником которого является Белкоопсоюз.

Сведения о предмете аукциона:

Лот № 1. ЗДАНИЕ МАГАЗИНА, площадью 94,5 кв.м, инв. № 600/С-136582. Материал стен — сборно-щитовые обложенные кирпичом. Фундамент — ленточный бетонный. Крыша — шиферная. Отопление водяное от котла на твердом топливе, металлические трубы и радиаторы

■ Наш фармат

РАБЛЮ ДАБРО: прадаю сябе, купляю сяброў

Як вы ставіцеся, калі нехта выстаўляе на продаж... сустрэчу з сабой, любімым? А калі гэта робіцца не проста дзеля жарту або халяўных грошай, а з высакароднай мэтай дапамагчы іншым людзям? На мой погляд, ці не самым выразным адказам будзе галасаванне за «тавар» рублём. У гэтым плане маладому беларускаму інтэрнэт-праекту — дабрачыннаму аўкцыёну сустрэч «Мае Сэнс» — ёсць чым ганарыцца. Да сваёй першай гадавіны, якая адзначалася днямі, праект прыйшоў з амаль 100 тысячамі долараў, сабраных на дабрачыннасць сродкаў. Прычым ахвяравалі гэтыя грошы хворым дзеткам, сацыяльным прытулкам і дзіцячым дамам, хоспісам і валанцёрскім рухам не буйныя прадпрыемствы і банкі, а звычайныя, пераважна вельмі маладыя, беларусы.

Даведка «Звязды»

Пачыналася ўсё год таму з праграмістаў Міхаіла Карпіцкага і Дзяніса Кандратовіча, якія вырашылі прымяніць свае прафесійныя веды ў сацыяльна значнай сферы. А каб зрабіць стартап (ад англ. «start up» — запускаць; новы бізнэс-праект, разлічаны на хуткую рэалізацыю) сапраўды жыццядзейным і цікавым для максімальна шырокай аўдыторыі, узбагацілі дабрачынную базу элементам спаборніцтва. Бо, з аднаго боку, кожнаму з нас цікава даведацца: «Колькі я каштую?», а з другога — вельмі спакусліва набыць за грошы асабісты час іншага чалавека, ад зоркі эстрады да прывабнага незнаёмца, з якім у звычайных абставінах можаш ніколі не сустрэцца. Другім складнікам поспеху стала назва — яркая, запамінальная, і, пагадзіцеся, зразумелая кожнаму беларусу.

Дарэчы, з цягам часу праект, акрамя асноўнай мэты — дапамогі цяжкахворым дзецям і дзіцячым дамам — набыў дадатковую. «Мы імкнёмся «выцягваць» людзей з сецівa ў рэальнае жыццё, з чатаў і сацыяльных сетак — на жывыя сустрэчы і прагулкі з новымі людзьмі, многія з якіх могуць стаць добрымі сябрамі ці нават больш», — заўважае PR-менеджар «Мае Сэнс» Кацярына Калацкая.

11 мільёнаў за «Барселону»

Цяпер у праекце актыўна ўдзельнічаюць так званыя «эксклюзіўныя лоты» — вядомыя беларускія артысты, музыканты, дызайнеры, спартсмены і бізнэсмены. Напрыклад, адзін з апошніх, інвестар Аляксандр Кныровіч, выкупіў самы дарагі лот — сустрэча з супрацоўніцамі «Мае Сэнс» плюс футбольны мяч з аўтографамі каманды «Барселона» — за 11 мільёнаў беларускіх рублёў. А алімпійская чэмпіёнка па плаванні Аляксандра Герасіменя ледзьве не набыла сустрэчу з тэлевядучым Дзянісам Кур'янам, але яе стаўку перабіў іншы чалавек. Усяго ж за год выставілі сябе «на продаж» тры дзясяткі беларускіх славутасцяў, прычым ніводны з іх, сцвярджае каманда «Мае Сэнс», ад удзелу не адмовіўся, наадварот, усе ахвотна ідуць на кантакт.

Сустрэча на могілках і ў свабодным палёце

«Як і многія, я хацеў бы паўдзельнічаць у дабрачыннасці, — узгадвае мадэратар праекта Алег Жаркоўскі, — але не мог укласці вялікіх грошай — хіба 50 тысяч рублёў можна лічыць колькі-небудзь істотнай сумай? Дый не быў упэўнены, па шчырасці, што гэтыя грошы паступяць менавіта дзецям. Летась знаёмыя дзяўчаты распавялі пра дабрачынны аўкцыён «Мае Сэнс», і я паціху стаў яго карыстальнікам, а потым і мадэратарам. Поўная і падрабязная справаздача, якая адкрыта вядзецца на сайце за кожны атрыманы рубель, мяне асабіста цалкам пераканала, што такі від дапамогі сапраўды мае сэнс. І вось цяпер магу падвесці вынікі: за 9 месяцаў удзелу ў праекце я правёў каля 40 сустрэч і выкупіў каля 80, сабраўшы на дабрачынныя мэты каля 7 мільёнаў рублёў».

Адна з самых незабыўных сустрэч, узгадвае Алег, вылілася ў роўпджампінг — сумесны скачок з мосту на альпінісцкіх вяроўках: «І гэта пры тым, што я баюся вышыні! — смяецца малады чалавек. — Але трэба было альбо так, альбо сустрэча магла ўвогуле не адбыцца, і ў выніку я не пашкадаваў, што адважыўся на экстрым».

А Кацярыне Калацкай адзін з пакупнікоў яе лоту-сустрэчы прапанаваў... рамантычную прагулку па Маскоўскіх могілках у сталіцы.

Але большасць сустрэч адбываецца ўсё ж традыцыйна — у кавярні ці ў парку, або проста падчас сумеснай прагулкі па горадзе. Дарэчы, пад горадам маецца на ўвазе не адзіны Мінск — рэгіёны таксама актыўна ўдзельнічаюць у праекце.

«Падыходзіць дзяўчынка і кажа: «Я цябе люблю»

Да 20% выручаных за аўкцыёны сустрэч сродкаў ідуць на заробку супрацоўнікаў, тэхнічную падтрымку і развіццё праекта, астатнія 80% пералічваюцца на канкрэтныя адрасы (прычым кожны карыстальнік, які прадае сустрэчу з сабой, сам вырашае і пазначае, куды пойдуць грошы). Сярод тых, каму толькі цягам апошніх некалькіх месяцаў дапамог «Мае Сэнс», Беларускі дзіцячы хоспіс, дзіцячыя дамы г. Мінска, Рудзенская дапаможная школа-інтэрнат для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, Івянецкі дом-інтэрнат, Гродзенскі дзіцячы хоспіс і яшчэ дзясяткі дзіцячых устаноў і канкрэтных дзетак з цяжкімі дыягназамі...

«Калі наша каманда павялічылася, мы змаглі дазволіць сабе не толькі пераводзіць грошы на дапамогу дзецям, але і ладзіць і самі ўдзельнічаць у валанцёрскіх акцыях, — дзеліцца Кацярына Калацкая. — І асабіста я памятаю такую вельмі яркую акцыю. Мы праводзілі аўкцыён для абсталявання гульнявой пляцоўкі для дзетак з прытулку ў аграгарадку Гайна Лагойскага раёна. Прыехалі туды, паставілі гульнявы комплекс, правялі канцэрт — сабраліся не толькі дзеці і выхавацелі, а ўся вёска... Тут да мяне падыходзіць дзяўчынка гадоў трох, бярэ за руку і кажа: «Я цябе люблю». У мяне, як ў дзяўчыны, у будучай мамы, зашчаміла сэрца — вярталася са слязамі на вачах... Такія акцыі зноў і зноў пераконваюць нас, што ўся праца, якую мы робім, нават самая дробная дапамога, якую аказваюць людзі, сапраўды мае сэнс».

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

ДАРЭЧЫ

Аналагічныя беларускаму сэрвісы былі запушчаны цягам года ў ЗША (www.goodwillion.com) і Расіі (www.goodwillion.ru). Праўда, плён яны пакуль прынеслі відавочна меншы: амерыканскі клоўн сабраў крыху больш як 2000 долараў, расійскі — каля 10000. Але справа, упэўнены распрацоўнікі, толькі ў больш маладым узросце — замежныя праекты працуюць менш чым паўгода і недастаткова пакуль раскручаныя.



За лот-сустрэчу з чэмпіёнкай свету і сярэбранай прызёркай лонданскай Алімпіяды па плаванні Аляксандрай Герасіменяй пераможца аўкцыёну выклаў амаль 7,5 млн рублёў.

■ Ну і ну!

МАРЫХУАНА Ў ПРАМЫСЛОВЫХ МАШТАБАХ

Міліцыя ліквідавала дзве лабараторыі па вытворчасці марыхуаны, прычым агульная вага канфіскаванай «траўкі» перавысіла 25 кілаграмаў.

Першым у поле зроку апаратыўнікаў патрапіў 24-гадовы мінчанін, які займаўся рэалізацыяй марыхуаны ў месцах адпачынку моладзі. Дылера затрымалі. Пры аглядзе ў яго кватэры была знойдзена і ліквідавана лабараторыя па вырошчванні і вытворчасці «траўкі». Аднак праца па гэтай справе на гэтым не скончылася: праваахоўнікі выйшлі на асноўнага пастаўшчыка марыхуаны ў сталіцу. Пры затрыманні з аўтамабіля, які яму належаў, было канфіскавана каля 60 грамаў марыхуаны. Але сапраўдны сюрпрыз чакаў у прыватным доме бацькоў затрыманага ў Мінскім раёне. Там была арганізавана вытворчасць наркотыку ў прамысловых маштабах: у лабараторыі знаходзіліся 9 вазонаў са спецыяльным абсталяваннем, у якіх гаспадар вырошчваў сыравіну. Яе агульная вага перавысіла 17 кілаграмаў. Яшчэ ў доме апаратыўнікі знайшлі і канфіскавалі 8 кілаграмаў ужо падрыхтаванага да продажу зелля. Абодвум грамадзянам пагражае да васьмі гадоў пазбаўлення волі кожнаму.

Сяргей РАСОЛЬКА

ТОЛЬКІ ЛІЧБЫ

На дадзены момант праект «Мае Сэнс» пералічыў на дабрачыннасць звыш 755000000 беларускіх рублёў. За гэты час прададзена і набыта прыкладна 20000 сустрэч.

На сайце maesens.by зарэгістраваны больш як 37 тысяч карыстальнікаў. Штодня сайт наведваюць 5-7 тысяч чалавек, а ў спісе лотаў знаходзіцца 150-200 сустрэч.

Аўкцыён сустрэчы доўжыцца 1 тыдзень, перамагае ў ім самая высокая стаўка.

Залаты Рыбак

17 медалёў і 2-е агульнакаманднае месца — вынік выступленняў зборнай Беларусі па самба на 36-м чэмпіянаце свету, які літаральна на днях завяршыўся ў Мінску.

Не ведаю, як вам, а мне заўжды падабаюцца міжнародныя спаборніцтвы. І няхай гэта будзе не хакей, футбол, гандбол, якія заўжды збіраюць ладную аўдыторыю на трыбунах і каля тэлеэкранаў. Гэта не так істотна. Істотна бачыць гэтае інтэрнацыянальнае яднанне спартсменаў, якія на пляцоўцы — галоўныя ворагі, а за яе межамі — добрыя знаёмыя, якім ёсць пра што паразмаўляць, абмеркаваць, сфатаграфавацца на памяць, а пасля паказваць здымкі дома сваім родным. Менавіта падобная атмасфера была на чарговым чэмпіянаце свету па самба, які гэтым разам прымаў Мінск. Барцы з усіх кантынентаў літаральна запаланілі мінскі Палац спорту. Ад рознаколяровых курток нават мітусілася ў вачах. Гэта менавіта барцы стваралі чэргі каля сувенірных крамак, менавіта яны разам з айчынным балельшчыкам падтрымалі калег на татамі, а пасля самі выходзілі на пляцоўку, каб лоб у лоб сысціся ў барацьбе з сапернікам.

Балгарка Ваня ІВАНОВА *(злева)* заваявала «золата» ў вагавай катэгорыі да 64 кг.

У спартыўным складніку чарговае планетарнае першынство, напэўна, вялікіх сенсацый не прынесла. Зноў над усімі дамінавалі расійскія самбісты, якія заваявалі ажно 17 залатых медалёў. Беларусы па медалях на другой пазіцыі (2 залатыя, 5 сярэбраных, 10 бронзавых узнагарод). У чарговы раз айчынных балельшчыкаў парадаваў наш вядомы самбіст і дзюдаіст Юрый Рыбак (вагавая катэгорыя звыш 100 кг). У фінальным паядынку ён упэўнена, з лікам 12:0 перамог грэка Васіліса Іліадзіса. У такім выпадку кажуць: чыстая перамога!

— Баі ўсе цяжкія, — адразу пасля паядынку, цяжка дыхаючы, кажа ўжо чатырохразовы чэмпіён свету па самба. — І калі зараз я перамог відавочна, дык гэта не значыць, што бой быў лёгкім. Як змагацца дома? Цяжка. Вельмі вялікая адказнасць. Хаця родныя сцены таксама дапамагаюць.

Сапраўды парадаваў нашых балельшчыкаў Станіслаў Калбасаў. Хлопец выступае ў раздзеле баявое самба (адзінаборства, у якім дазваляюцца ўдары кулаком, локцем, нагамі, галавой), даволі прагрэсіўным відзе спорту. Нехта называе баявое самба нават самым небяспечным адзінаборствам, а таму спартсмены апранаюць спецыяльныя шлемы, пальчаткі, накладкі на ногі, каб прадухіліць, знізіць траўматызм. Дык вось, наш Стас у гэтай дысцыпліне заваяваў для Беларусі першую залатую ўзнагароду!

— Для мяне гэта другія спаборніцтвы, — апавядае Станіслаў, які атрымаў «золата» ў катэгорыі да 100 кг. — Не хацелася ляснуцца ў грязь перад роднымі балельшчыкамі, а таму пастараўся цалкам выкласціся.

Зразумела, што для Расіі і Беларусі, Грузіі і Казахстана, Украіны і Таджыкістана самба — даволі папулярны від спорту. Але на чэмпіянаце было шмат краін, у якіх гэты цікавы від яшчэ развіваецца, набывае папулярнасць. Націку Багіраву, вядомаму беларускаму дзюдаюісту, двухразоваму бронзаваму прызёру чэмпіянатаў свету, між іншым, спадабаліся барцы з Трынідада і Табага, Аргенціны, Японіі, Венесуэлы. Прымалі ўдзел у чэмпіянаце і прадстаўнікі Вялікабрытаніі. І хоць, як адзначыў нашаму карэспандэнту Джон Кларк, трэнер зборнай, у іх узніклі пэўныя фінансавыя праблемы, англічане ў Мінск прыляцелі. Кажа, што ўсё прайшло цудоўна. Безумоўна, да арганізатараў пытанняў ніякіх. Але агульнае і галоўнае пытанне для самба — прыняцце ў вялікую алімпійскую сям'ю.

Тарас ШЧЫРЫ.

Баявое самба — для сапраўдных мужчын.

Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

Даты | Падзеі | Людзі

Міжнародны дзень адмовы ад курэння. *Адзначаецца ў трэці чацвер лістапада ў многіх краінах свету па ініцыятыве Міжнароднага таварыства анколагаў пры падтрымцы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.*

Сусветны дзень філасофіі. *Адзначаецца з 2002 года па ініцыятыве ЮНЕСКА ў трэці чацвер лістапада.*

1941 год — каля вёскі Малы Трасцянец Мінскага раёна ў мэтах масавага знішчэння цывільнага насельніцтва і ваеннапалонных нямецкімі акупантамі створаны Трасцянецкі лагер смерці. Масавыя забойствы людзей гітлераўцы праводзілі ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка. Гэта вялізнае міжнароднае пахаванне, дзе знаходзяцца астанкі савецкіх людзей, удзельнікаў антыфашысцкай падпольнай барацьбы і партызанскага руху, мінчан, арыштаваных у якасці закладнікаў, ваеннапалонных, палітычных вязняў нямецкіх турмаў і лагераў, яўрэяў з Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Чэхаславакіі. Трасцянецкі лагер смерці быў самым вялікім на тэрыторыі былога СССР і чацвёртым пасля Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі па колькасці загінулых. Усяго ў лагеры загінула больш за 200 тысяч чалавек. Ліквідаваны ў 1944 годзе пры вызваленні Мінска. Каля вёскі Вялікі Трасцянец збудаваны помнік ахвярам фашысцкага тэрору, у вёсцы Малы Трасцянец устаноўлены памятны знак.

1774 год — данскі казак Емяльян Пугачоў ў жалезнай клетцы быў дастаўлены ў Маскву. У гэты ж дзень Кацярына II напісала Вальтэру: «Ён (Пугачоў) не ўмее ні чытаць, ні пісаць, але гэта чалавек надзвычай смелы і рашучы. Надзея, якую ён адважваецца мець, — гэта тое, што я магу яго памілаваць, бо, па яго словах, ён храбры і можа сваімі будучымі ўчынкамі загладзіць свае ранейшыя зладзействы. Калі б ён абразіў толькі мяне, то яго разважанні былі б справядлівымі і я б даравала яму, але гэта справа не мая асабістая, а тычыцца ўсёй імперыі, якая мае свае законы». Такім чынам, доля бунтара была вырашаная — у студзені наступнага года Пугачоў быў пакараны.

1947 год — 65-ты дзень нараджэння сёння адзначае Анатоль Ярмоленка, эстрадны спявак, народны артыст Беларусі (1993). З 1974 года — мастацкі кіраўнік і вядучы саліст творчага аб'яднання «Студыя «Сябры». Першы выканаўца многіх папулярных песень беларускіх і расійскіх кампазітараў. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1984). Узнагароджаны ордэнам Ф. Скарыны (2006).

Было сказана

Уладзімір Караткевіч (1930—1984), паэт, празаік, драматург, публіцыст:

«Аптымізм беларускі ў тым, што калі мы, нягледзячы на ўвесь песімізм і безнадзейнасць мінулага, усё ж жывём, значыць, у нас ёсць падставы гаварыць аб лепшым будучым».

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па геаграфіі: Завушніца. Афрагі. Барс. Ларык. Гід. Тула. Анапа. Арда. Ніягара. Лондан. Гарт. Кадэт. Кадэт. Ляр. Ана. Лада. Сектар. Асіяк. Луга. Кан. Маштаб. Аліса. Рот. Трава. Кадка. Арматура.

Па вершыні: Прысценак. Брандзавет. Ліверпуль. Ліпа. Вулкан. Кальцэ. Абак. Акт. Турэмка. Гар. Пяргам. Нарвін. Лорд. Аўган. Тэка. Цэнтр. Вар. Стань. Самара. Шале. Фламінго. Кош. Арда. Ват. Бар. Аланка. Пляцтатар. Бровка.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	8.37	17.10	8.33
Віцебск	8.32	16.55	8.23
Магілёў	8.27	17.00	8.33
Гомель	8.18	17.03	8.45
Гродна	8.52	17.27	8.35
Брэст	8.46	17.34	8.48

Месяц

Маладзік 14 лістапада.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

Пр. *Канстанціна.*
К. *Амеліі, Марыі, Альберта, Артура, Леапольда.*

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Мама, а гэтая каша дакладна не сапсавалася?

— Еш, не бойся. Заўтра выхадны.

Двое высвятляюць адносіны ў машыне:

— ...І не павышай на мяне музыку!..

Маленькі Вовачка, вярнуўшыся з вёскі ў горад, заяўляе бацькам:

— Мама і тата, гэта няпраўда, што карова дае малако. Яго з яе выцягваюць сілай!

Экзамен у сельскагаспадарчым:

— Вы дырэктар саўгаса, і ў вас зноў неўраджай. Якія аб'ектыўныя прычыны вы можаце назваць у сваё апраўданне?

— Ну, дрэнныя ўмовы надвор'я...

— А яшчэ што-небудзь?

— Ну, забыліся пасадзіць.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.720. Індэкс 63850. Зак. № 5169.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 лістапада 2012 года.